Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

Літаратура і мастацтва

ISSN 0024-4686

№ 50 (4953) 15 снежня 2017 г.

Атмасфера пазачасавасці 4

Проза, якая кранае 5

Год — з чытачамі 10-11

У кірунку да Цэнтра 14

Графіка + 15

Viva, Academia!

*Patetico

Фота з архіва БДАМ.

У Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі дзейнічае шэраг студэнцкіх калектываў, у тым ліку сімфанічны аркестр опернай студыі.

Яны ўмеюць ствараць свята — сабе і іншым. Яны самі — свята, калі ёсць магчымасць дакрануцца да таленту і калі разумееш, колькі працы за ім прыхавана. Таму, калі яны святкуюць, варта далучыцца. Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі запрашае ў гэтыя дні на свята свайго нараджэння, якое адзначаецца пышна: шэрагам канцэртаў, канферэнцыяй, дзе будзе згаданы шлях фарміравання прафесійнай музычнай адукацыі ў рэспубліцы. Пра традыцыі, закладзеныя 85 гадоў таму, і іх сённяшняе развіццё мы размаўляем з рэктарам Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, доктарам мастацтвазнаўства, прафесарам Кацярынай Дулавай:

— Архіўныя матэрыялы даюць інфармацыю пра больш ранні перыяд утварэння кансерваторыі: указ, датаваны 1925 годам, сведчыў, што было прынята рашэнне аб стварэнні Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. А ўжо сам факт адкрыцця і пачатак функцыянавання ўстановы датуецца 1932 годам. Мяркую, што яшчэ да пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя было ўяўленне аб неабходнасці стварэння прафесійнай музычнай адукацыі ў Беларусі.

Зараз мы можам доказна гаварыць пра тое, наколькі разнастайным і цікавым было культурнае і тэатральнае жыццё ў нашай краіне ў розныя перыяды яе гісторыі: у ВКЛ ці Рэчы Паспалітай, падчас існавання ў межах Расійскай імперыі і ў гады існавання сучаснай беларускай дзяржавы. І раней былі ўстановы адукацыі, якія адначасова выконвалі функцыю культурных цэнтраў: калегіумы, музычныя тэхнікумы ў Віцебску, Мінску, Магілёве. Гэта асобная тэма: наяўнасць падрыхтоўчага этапу, стварэнне музычнага асяродка, таго ж Беларускага музычнага таварыства. Адметны сам факт, што ў няпростыя часы, калі толькі ішло станаўленне эканомікі новай дзяржавы, думкі, у тым ліку дзяржаўных людзей, былі звязаны з культурай.

На пачатку стварэння кансерваторыя месцілася ў іншых будынках. Будынак, які мы займаем зараз, датуецца 57-м годам. Гэта ўсяго 12 гадоў пасля заканчэння вайны. У той час, калі трэба было пачынаць жыць нанова, калі будаваліся дамы, аднаўляліся прадпрыемствы, у цэнтры Мінска з лепшых матэрыялаў было ўзведзена памяшканне ўстановы для адораных людзей. Сёння гэта ўражвае: натуральны мармур, бронза, крышталь, дрэва. Гэта было зроблена годна, у класічным стылі, з думкай пра тое, што людзі, якія вырашылі прысвяціць сябе музычнай творчасці, павінны выхоўвацца ў адпаведных умовах.

— Каб у кожнага было разуменне: музыка — мастацтва для ўсяго грамадства, а не толькі для эліты?

— Асвеце надавалася вялікая ўвага. Былі патрэбны спецыялісты, каб пачаць працэс на найвышэйшым адукацыйным узроўні. Праз тры гады пасля адкрыцця кансерваторыі пры ёй адкрываецца школа для адораных дзяцей. Адразу прадумвалася: хто будзе фарміраваць кадры для будучай навучальнай установы. Важнай акалічнасцю ў гэтым працэсе стала запрашэнне выдатных дзеячаў савецкай — расійскай — музычнай культуры і адукацыі для таго, каб выхоўваць нашы нацыянальныя кадры. Сёння мы ганарымся, што многія з вядучых прафесараў Беларускай акадэміі музыкі былі першымі вучнямі выдатных дзеячаў Санкт-Пецярбургскай, Маскоўскай кансерваторый, такіх, як вучань Рымскага-Корсакава Васіль Залатароў. Пазней з'явілася практыка навучання лепшых выпускнікоў нашай школы пры кансерваторыі ў вядучых ВНУ Расіі, каб яны потым вярталіся і выхоўвалі наступнае пакаленне беларускіх музыкантаў.

Працяг тэмы на стар. 12-13 ►

Акцэнты тыдня: краіна

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі з 85-годдзем з дня заснавання навучальнай установы. «Акадэмія па праве з'яўляецца вядучай установай адукацыі ў сферы культуры. За шматгадовы перыяд дзейнасці ў яе сценах склаліся ўнікальныя выканальніцкія, педагагічныя і навуковыя школы, сфарміраваліся асаблівыя традыцыі работы з таленавітай моладдзю. Сярод выпускнікоў акадэміі — выдатныя выканаўцы, кампазітары і музыказнаўцы», — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ўстанова дынамічна развіваецца, рэалізуе мноства цікавых творчых праектаў. Студэнты акадэміі паспяхова ўдзельнічаюць у прэстыжных фестывалях і конкурсах, годна прадстаўляюць краіну за яе межамі, прымнажаюць гонар і славу Айчыны.

Найважнейшай падзеяй тыдня стаў II З'езд вучоных Беларусі. Падчас выступлення на форуме Прэзідэнт Беларусі акрэсліў шэраг праблем. Адна з іх — праблема ўцечкі мазгоў у навуковай сферы, якая павінна быць вырашаная, запатрабаваў кіраўнік дзяржавы. «Яе рэальны маштаб ацаніць цяжка, паколькі адбываецца не толькі вонкавая, але і ўнутраная інтэлектуальная міграцыя. Шматлікія маладыя людзі, застаючыся ў нашай краіне, змяняюць навуковую дзейнасць на больш высокааплатную працу ў сферы бізнесу. Нам неабходна стварыць маладому пакаленню самыя спрыяльныя ўмовы для творчасці, падтрымаць моладзевыя пачынанні», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Гэта не проста словы. Стыпендыі Прэзідэнта Беларусі прызначаны 100 маладым вучоным. Адпаведнае распараджэнне падпісаў кіраўнік дзяржавы. Іх навуковыя дасягненні ў межах фундаментальных і прыкладных даследаванняў па прыярытэтных напрамках знайшлі практычнае прымяненне. Навізна даследаванняў пацверджана публікацыямі ў вядучых айчынных і замежных навуковых часопісах, па многіх распрацоўках атрыманы патэнты на вынаходніцтвы. Кіраўнік дзяржавы таксама падпісаў распараджэнне, якім зацверджана рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў аб выдзяленні з рэспубліканскага бюджэту за кошт сродкаў рэзервовага фонду Прэзідэнта Беларусі больш як 191 тыс. рублёў. Фінансавыя сродкі будуць накіраваны на выплату грашовых прэмій і заахвочвальнай стыпендыі 1147 навучэнцам і студэнтам, якія дасягнулі высокіх вынікаў у вучобе, навуковай дзейнасці і прафесійным майстэрстве.

Тым часам... Белдзяржуніверсітэт увайшоў у 200 лепшых універсітэтаў па версіі Маскоўскага міжнароднага рэйтынгу «Тры місіі ўніверсітэта» *(MosIUR)*. У спісе пілотнай версіі новага рэйтынгу адзначаны ўніверсітэты з 39 краін. БДУ размясціўся на 168-м месцы і стаў адзіным прадстаўніком Беларусі ў падагульняльнай рэйтынгавай табліцы. Маскоўскі міжнародны рэйтынг ВНУ — прынцыпова новы акадэмічны рэйтынг, які ацэньвае тры ключавыя місіі ўніверсітэта: адукацыйную, навуковую і ўзаемадзеянне з грамадствам.

Як сведчанне ўвагі да інтэлектуальнай эліты — Падзяка Прэзідэнта Беларусі аб'яўлена шэрагу журналістаў рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі. За высокае прафесійнае майстэрства, значны асабісты ўнёсак у асвятленне важных падзей сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця краіны Падзякай Прэзідэнта ўганараваныя рэдактар аддзела сацыяльных праблем газеты «Советская Белоруссия» Людміла Габасава, намеснік дырэктара дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» Анатоль Занковіч, начальнік аддзела УП «Беларускае тэлеграфнае агенцтва» Уладзімір Мацвееў.

Беларусь — гасцінная краіна. Сэрвіс анлайн-браніравання vetliva.by стаў пераможцам у намінацыі «Праект года» нацыянальнага турыстычнага конкурсу «Пазнай Беларусь». Сэрвіс аб'ядноўвае на сваёй пляцоўцы ўсе віды турыстычных паслуг у Беларусі. Праект з'яўляецца прадуктам дзяржаўнага прадпрыемства «Цэнтркурорт» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якое больш за 15 гадоў працуе на рынку турпаслуг. Сэрвіс арыентаваны на нацыянальны турыстычны прадукт і распрацаваны ў межах дзяржпраграмы «Беларусь гасцінная» да 2020 года.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

У ШМАТГАЛОСНЫМ СВЕЦЕ

На гэтым тыдні ў Мінску па запрашэнні Саюза пісьменнікаў Беларусі знаходзілася дэлегацыя маскоўскага Літаратурнага інстытута імя Максіма Горкага з мэтай прэзентацыі Дома нацыянальных літаратур, створанага ў 2017 годзе. Першая паездка ў межах гэтага праекта — менавіта ў нашу краіну.

11 снежня адбылася працоўная сустрэча міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандра Карлюкевіча з дэлегацыяй Літаратурнага інстытута на чале з рэктарам Аляксеем Варламавым. Былі абмеркаваны пытанні развіцця літаратурных сувязей Беларусі і Расіі, у тым ліку на пляцоўцы Дома нацыянальных літаратур.

На ўзаемную карысць

Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве ўтрымлівае статус прэстыжнай ВНУ, і час ад часу ў яго паступаюць прадстаўнікі Беларусі. «Але гэта зусім не той маштаб супрацоўніцтва, які можа паслужыць на карысць беларускай, і не толькі, літаратуры», — упэўнены рэктар інстытута Аляксей Варламаў. Год таму на пасяджэнні савета па культуры і мастацтве пры Прэзідэнце Расіі Уладзіміры Пуціне ён выказаў прапанову аб стварэнні Дома нацыянальных літаратур. Прэзідэнт РФ гэту ініцыятыву падтрымаў.

Быў выдзелены будынак у цэнтры Масквы паблізу беларускага пасольства.

З першай прэзентацыяй Дома нацыянальных літаратур масквічы ехалі менавіта ў Беларусь, добра ведаючы пра ранейшыя цесныя стасункі нашых літаратараў. Яны пераканаліся, што і цяпер беларускія літаратары трымаюць сувязі з калегамі з многіх краін. Яркае сведчанне таму — дзейнасць партала «Сугучча» Выдавецкага дома «Звязда», пераклады з розных моў на беларускую ў літаратурных выданнях Беларусі, выхад кніг замежных аўтараў.

— Гэта сустрэча чаканая тым, — расказвае першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах, — што беларускія літаратары змаглі пазнаёміцца з прадстаўнічай камандай вядомага Літінстытута, дзе марылі вучыцца многія літаратары.

З боку гасцей было вялікае жаданне пачуць беларускую мову. У Літінстытуце плануюць адкрыць беларускую групу, якая будзе займацца мастацкім перакладам, — яшчэ пра такі неардынарны крок з боку інстытута паведаміў рэктар ВНУ Аляксей Варламаў.

На жаль, маладых спецыялістаў, якія ведаюць мовы народаў Расіі і славянскія мовы, вельмі мала. Дарэчы, у савецкія часы беларуская група перакладчыкаў інстытутам выпускалася.

Фота Андрэя Бабка.

Падчас сустрэчы з прадстаўнікамі Літаратурнага інстытута ў Доме літаратара.

«У нас захавалася ўся метадычная база па гэтым кірунку. І зараз яна найлепшым чынам можа паслужыць падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў», — запэўніла прадстаўнік кафедры перакладаў Марыя Зоркая.

У хуткім часе Саюзам пісьменнікаў Беларусі і Літінстытутам будзе аб'яўлены конкурс, па выніках якога стануць вядомыя імёны тых, хто паедзе ў Маскву вучыцца перакладчыцкай дзейнасці.

Марыя ЛІПЕНЬ

Дом нацыянальных літаратур зблізіць не толькі літаратуры, але і народы,

лічыць рэктар Літаратурнага інстытута імя Максіма Горкага Аляксей Варламаў

— У Беларусі з вялікай цікавасцю ўспрынялі навіну аб стварэнні ў Маскве пры Літаратурным інстытуце імя Максіма Горкага Дома нацыянальных літаратур. Ці азначае гэта, што, як і раней, Масква будзе аб'яднаўчым цэнтрам пісьменніцкага шматгалосся?

— Мы да гэтага імкнёмся. Думаю, што існаванне і развіццё шматнацыянальнай літаратуры ў былым Савецкім Саюзе было адным з безумоўных плюсаў. І тое, што руская мова стала дзвярыма ў свет вялікай літаратуры, адкрыла чытачам вялікай краіны такія імёны, як Чынгіз Айтматаў, Расул Гамзатаў, Васіль Быкаў, Олжас Сулейменаў, Кайсын Кулієў, Мустай Карым і многія іншыя, — факт, з якім цяжка спрачацца. Як, на жаль, фактам стала і тое, што апошнія дзесяцігоддзі гэтую традыцыю мы страцілі і дрэнна ўяўляем, што адбываецца ў суседніх літаратурах. І адна з прычын — рэзкае скарачэнне колькасці перакладчыкаў.

Цэнтрам адраджэння, вядома, павінна быць Масква, і не проста Масква, а Літаратурны інстытут, дзе за савецкім часам была створана і паспяхова развівалася кафедра мастацкага перакладу з моў народаў СССР.

— Адкрыццё Дома нацыянальных літаратур — важная падзея не толькі для пісьменніцкай супольнасці. Ёсць падстава разглядаць тое, што адбываецца, значна шырэй: літаратура не страчвае значнасці. Трэба меркаваць, што дзякуючы агульным намаганням слова пісьменніка загучыць шырэй?

— Мне вельмі хацелася б паверыць у гэта, таму што грамадству такога слова сёння востра не хапае. Усё-такі менавіта пісьменнікі па прыродзе сваёй больш глыбока і асэнсавана ўспрымаюць рэчаіснасць, могуць сказаць вельмі важныя рэчы пра тое, што з намі адбываецца. І калі не атрымаецца даць адказ, то, па меншай меры, пытанне будзе пастаўлена. Больш за тое, слова пісьменніка можа быць як стваральным, так і разбуральным. Гэта вельмі вострая зброя, здольная сеяць і сяброўства, і варожасць. Асабліва гэта тычыцца нацыянальных пытанняў. Нам вельмі хацелася б стварыць такі дом, які праз мастацкае слова прынясе людзям дабро.

— ...І літаратура не сыдзе ў інтэрнэт? Кніга зноў зможа стаць лепшым падарункам?

— Не думаю, што сыход літаратуры ў інтэрнэт — гэта прысуд. На інтэрнэт, калі ўжо на тое пайшло, спадзяюцца тыя, хто не можа адбыцца на традыцыйным кніжным рынку, каго не купляюць у крамах. Гэта не значыць, што ўсё ў інтэрнэце бяздарнае, а ўсё, што прадаецца ў крамах, — цудоўнае. Сітуацыя больш складаная. Але ўсё-такі пагадзіцеся, што самыя добрыя, цікавыя, прыкметныя кнігі існуюць і ў электронным, і ў папяровым выглядзе. І застаюцца выдатным падарункам.

— Што вызначае тэндэнцыі развіцця сучаснай расійскай літаратуры? А нацыянальных літаратур?

— Любыя тэндэнцыі заўсёды вызначае жыццё. Тыя пытанні, якія яно перад намі ставіць, выклікі, якія кідае, — гэта і пачуцці, адчуванні, трывогі, надзеі, расчараванні. Перш за ўсё тых, хто піша. «Мы зусім не лекары — мы боль» — гэта знакамітая герцэнаўская формула, даўно аднесеная да працы літаратараў, дапасуецца да ўсіх народаў і часоў.

— Якія прынцыпы будуць у аснове Дома нацыянальных літаратур? Гаворка ідзе аб аднаўленні ранейшых сяброўскіх літаратурных сувязяў, але з наданнем ім сучаснага гучання.

— У нас вельмі сур'ёзныя планы. Хочам не толькі вярнуць страчанае, але і сур'ёзна рухацца наперад. Дом нацыянальных літаратур закліканы стаць менавіта домам, месцам сустрэчы літаратур Расіі і, у першую чаргу, нашых найбліжэйшых сяброў. Таму што сёння як ніколі важныя чалавечыя зносіны і зносіны пісьменнікаў у тым ліку. Па ідэі, дом будзе прымаць гасцей з розных краін для правядзення літаратурных сустрэч, фестываляў, прэзентацый, экспазіцый, майстар-класаў.

— З першай выязной прэзентацыяй Дом нацыянальных літаратур накіраваўся ў Беларусь. Чым знамянальная гэтая паездка для Літаратурнага інстытута?

— З Беларуссю Літаратурны інстытут звязваюць асаблівыя адносіны. Многія з беларускіх пісьменнікаў вучыліся ў Літінстытуце. І тое, што Беларусь стане першай з краін, куды мы адпраўляемся, глыбока невыпадкова і падкрэслівае асаблівы характар нашых узаемаадносінаў.

Алена СТЭЛЬМАХ,
першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі

ЛіМ КАЛЯНДАР

16 снежня 80 гадоў святкуе Алена Юрашкевіч, беларускі майстар дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва.

18 снежня 60-годдзе адзначыць Аляксандр Слуцкі, беларускі скульптар.

19 снежня 90 гадоў спаўняецца Івану Бурсаву, паэту, перакладчыку. Жыве ў Маскве.

20 снежня — 100 гадоў з дня нараджэння Газіза Дугашава (1917 — 2008), дырыжора, народнага артыста Казахскай ССР. У 1966 — 1968 гг. быў галоўным дырыжорам Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР.

21 снежня — 105 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Кавальскага (1912 — 1937), беларускага паэта, драматурга. Пісаў на польскай мове.

21 снежня — 80 гадоў з дня нараджэння Эдуарда Садрыева (1937 — 1994), беларускага кінааператара, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

НА ЎСЕ 100:

Беларускі Дом друку адзначае юбілей

Год атрымаўся багаты на значныя юбілеі. Вось і найбуйнейшаму выдавецтву краіны «Беларускі Дом друку» споўнілася сто. Калі ўлічваць існаванне ўстановы пад іншымі назвамі, то 100 год — гэта толькі трэцяя частка яе жыцця. Архіўныя дакументы даводзяць, што ў 1797 годзе адкрылі правобраз Дома друку — Мінскую губернскую тыпаграфію, якая, у сваю чаргу, пайшла ад тыпаграфіі Ордэна манахаў-базыліянцаў. У назвах установы засталіся адлюстраванні гістарычных эпох краіны: Мінская губернская тыпаграфія, Тыпаграфія Савета Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту, 1-я Савецкая тыпаграфія, Тыпаграфія імя І. В. Сталіна, Тыпаграфія выдавецтва «Звязда», «Выдавецтва ЦК КПБ» і, нарэшце, «Беларускі Дом друку» — сведчанне нацыянальнага статусу і высокай запатрабаванасці прадпрыемства.

Натуральна, установу смела можна назваць нацыянальнай: менавіта ў Беларускім Доме друку пабачылі свет Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь і пашпарт грамадзяніна Беларусі. Сцяг, узняты над мінскай плошчай Дзяржаўнага сцяга, таксама зроблены на гэтым прадпрыемстве. Уражвае і ўнёсак у айчыннае кнігавыданне: на працягу года тут друкуецца каля двух мільёнаў кніг ды больш за 4 мільёны асобнікаў рэкламных выданняў. У выдавецтве штомесяц выходзіць 30 мільёнаў асобнікаў газет — амаль 80 працэнтаў ад агульнага тыражу друкаваных СМІ Беларусі.

Да стагоддзя Дома друку падрыхтавалі мастацкі маркіраваны канверт «Беларускі Дом друку. Сто гадоў з часу заснавання». У цырымоніі гашэння канверта ўзялі ўдзел міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карлюкевіч, намеснік кіраўніка спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Валерый Ярмошка, генеральны дырэктар Выдавецтва «Беларускі Дом друку» Раман Алейнік і першы намеснік генеральнага дырэктара «Белпошты» Алена Скрыпчык.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

Каза, батлейка, каша...

Ужо на наступным тыдні беларусы пачынаюць святкаваць набліжэнне новага 2018 года.

21 снежня ў мінскай кавярні «Грай» адбудзецца прэзентацыя новай кнігі папулярнага шведскага аўтара Свэна Нурдквіста «Калядная каша» ў перакладзе на беларускую мову Надзеі Кандрусевіч. Арганізатары гарантуюць вясёлае сямейнае свята. Зміцер Вайцюшкевіч прачытае ўрывак з кнігі і заспявае свае песні для дзетак. Усе наведнікі могуць пачаставацца сапраўднай шведскай калядной кашай.

Надзея Кандрусевіч распавядзе пра сваю працу і адкажа на пытанні. Будзе прадстаўлены зборнік аўдыякніг па творах Свэна Нурдквіста «Пэтсан і Фіндус» на трох CD — усе гісторыі вядомага шведскага аўтара (9 кніг) пра прыгоды старога Пэтсана і ягонага катка Фіндуса ў агучцы па-беларуску Ганны Хітрык і Паўла Харланчука. Кнігі можна будзе набыць па спецыяльнай цане.

26 снежня «Арт Сядзіба» запрашае маленькіх гледачоў і іх бацькоў на інтэрактыўны спектакль тэатра «Варгін» — у межах музычнай беларускамоўнай праграмы «Калядныя ялінкі». Спектакль складзены па матывах старадаўніх традыцыйна-беларускіх батлеечных сюжэтаў, з выкарыстаннем танцаў, гульняў і жывой традыцыйнай музыкі.

27 снежня ладзіцца казачная праграма для дзяцей «Прыехала Каляда!» з Сержуком Доўгушавым. Гасцей чакаюць каза, музыкі-калядоўшчыкі з гурта *Vuraj*, гульні і казкі ад Лырысы Рыжковай (гурт «Калыханка»). Навагоднія карагоды, мноства цудаў і сюрпрызаў гарантаваныя.

Юлія ШПАКОВА

Сімбіёз мастацтва і тэхналогій

Сусветна вядомы шэдэўр Івана Хруцкага «Партрэт невядомай з кветкамі і садавінай» дзякуючы інавацыйным тэхналогіям *LG Electronics* стаў больш глыбокі і эмацыянальны: «Выстаўка аднаго шэдэўра» *by LG Electronics* стала сімбіёзам тэхналогій і мастацтва. Такім чынам 14 снежня ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь прадстаўнікі нашай краіны і Рэспублікі Карэя адзначылі 25-годдзе ўсталявання дыпламатычных адносін.

— Мы зрабілі прэзентацыю, дзе паказалі, што тэхналогіі і мастацтва таксама могуць узаемадзейнічаць, — расказвае куратар праекта з беларускага боку Лізавета Еліневіч. — Гэта была не звычайная сустрэча прадстаўнікоў краін, а прадуманая падзея, праз якую мы ў будучыні можам арганізаваць шмат цікавых, а галоўнае, новых праектаў. З Рэспублікай Карэя ў нас шмат стасункаў навукова-тэхнічных, адукацыйных, эканамічных, таму важна, што пашыраюцца і культурныя адносіны.

У прэзентацыі праекта ўзялі ўдзел спецыяльныя госці: міністр культуры Рэспублікі Беларусь Юрый Бондар, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Карэя ў Беларусі Кім Енг Хо, кіраўнік прадстаўніцтва *LG Electronics* у Беларусі спадар Санг-Вук Ха. Кампанія *LG Electronics* мае намер садзейнічаць развіццю эканамічных і культурных стасункаў Беларусі і Карэі.

Вікторыя АСКЕРА

Памяць

ПРАВА ЖЫЦЬ ПАСЛЯ...

Іван Мацкевіч неаднойчы адзначаў, што артыстам быць не збіраўся, — паехаў паступаць у інстытут за кампанію. Мацкевіча ўзялі, а сябра — не...

Да акцёрскай кар'еры спачатку ў Брэсцкім тэатры драмы, Тэатры-студыі кінаакцёра ён паспеў папрацаваць на заводзе будаўнічых дэталяў, але заўсёды марыў быць мараком. Дарэчы, у нейкім сэнсе гэтую мару рэалізаваць атрымалася — на сцэне Нацыянальнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага, дзе ён сёлета выканаў адну з галоўных роляў у спектаклі «Падводнікі». У тэатры яго называлі не інакш як мэтрам: быў вядучым акцёрам з 1996 года. Званне заслужанага артыста Беларусі атрымаў у 2011-м. За ім была безліч роляў: у спектаклях «Бег», «Пане Каханку», «Леў зімой». Як сапраўдны патрыёт свайго тэатра любіў Горкага — іграў Ваську Пепла ў «На дне», Пацехіна ў «Дзіваках», Чаркуна ў «Варварах».

Іван Мацкевіч з поспехам здымаўся ў кіно: знакамітыя стужкі Міхаіла Пташука «Вазьму твой боль» і «Чорны замак Альшанскі» не абышліся без таленту акцёра, ён іграў у фільмах «Людзі на балоце» Віктара Турава, «Анастасіі Слуцкай» Юрыя Ялхова і дагэтуль застаецца адным з нямногіх беларускіх акцёраў, у якіх атрымалася папрацаваць з Аляксеем Германам (зняўся ў стужцы «Хрусталёў, машыну!»). Кіно захавала яго талент назаўсёды.

Люстэрка тыдня: свет

У Маскве сталі вядомыя лаўрэаты расійскай Нацыянальнай літаратурнай прэміі «Вялікая кніга». Прафесійнае журы прысудзіла перамогу пісьменніку Льву Данілкіну з біяграфічнай кнігай «Ленін. Пантакратар сонечных пылінак» (дарэчы, гэты ж твор стаў адным з лідараў галасавання сярод чытачоў). Другое месца ў Сяргея Шаргунова з біяграфіяй паэта і празаіка Валянціна Катаева «Катаеў. Пагоня за вечнай вясной» (пераможца паводле галасавання чытачоў). На трэцім месцы — раман Шаміля Ідыятуліна «Горад Брэжнеў». Калі глядзець на памеры грашовых выплат, «Вялікая кніга» — найбуйнейшая літаратурная ўзнагарода пасля Нобелеўскай прэміі па літаратуры. Так, пераможца 2017 года Леў Данілкін атрымае тры мільёны расійскіх рублёў.

Найвышэйшая ў Азіі драўляная будыйская пагада згарэла ў кітайскай правінцыі Сычуань цалкам. Шаснаццаціпавярховы будынак (150 метраў у вышыню) быў узведзены ў эпоху дынастыі Мін (XIV — XVII стагоддзі) і знаходзіўся на тэрыторыі старажытнага храмавага комплексу Цяньнінсы ў горадзе Чанчжоў Цзянсу. Нядобры рок праследаваў пагаду яшчэ з 2008 года, калі яна была амаль разбураная пасля землятрусу: на момант пажару ў пагадзе яшчэ не былі скончаныя работы па ўзнаўленні будынка. Прычыны ўзгарання пакуль невядомыя.

Успіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА ўнеслі неапалітанскую традыцыю гатавання піцы (мяркуюць, што менавіта ў Неапалі, сталіцы паўднёвага італьянскага рэгіёна Кампанія, у першай палове XVI стагоддзя быў створаны правобраз знакамітай італьянскай піцы). Інгрэдыенты для гэтай стравы ўключаюць італьянскую муку найвышэйшай якасці, памідоры з Сан-Марцана (яны маюць асаблівы смак, бо растуць у вулканічнай глебе) і свежы сыр з малака буйвала — Мацарэла ды Бафала. Цяпер у Неапалі жывуць і выступаюць каля 3 тысяч піцаёла — майстроў, якім афіцыйна дазволена гатаваць піцу. Штогод у сярэдзіне верасня ў Неапалі ладзіцца вялікі фестываль піцы *PIZZAFEST*, які збірае на спаборніцтва самых вядомых піцаёла з усяго свету.

Хутка на доме, у якім з 1980-га года і да самай смерці жыў вядомы беларускі паэт Рыгор Барадулін, з'явіцца мемарыяльная дошка з выявай літаратара. Грошы на яе стварэнне збіраліся з дапамогай краўдфандынгавай платформы *talaka.org*. Аўтар дызайну мемарыяльнай дошкі — беларускі скульптар Ігар Засімовіч. Рыгор Барадулін — апошні з беларускіх літаратараў, каму надалі ганаровае званне «Народны паэт Беларусі» (1992 год), а ў 2006 годзе зборнік вершаў «Ксты» прынёс паэту намінацыю на Нобелеўскую прэмію па літаратуры.

Агляд цікавінак ад Дар'і ЧАРНЯЎСКАЙ

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

15 снежня — *на сустрэчу з Міхасём Пазняковым у СШ № 41. Пачатак а 13-й гадзіне.*

18 снежня — *у Школу юнага паэта пры Мінскім гарадскім аддзяленні СПБ. Пачатак а 15-й гадзіне.*

19 снежня — *на літаратурны праект «Паэтычны аўторак» з удзелам групы паэтаў у публічную бібліятэку № 7. Пачатак а 15-й гадзіне.*

19 снежня — *на юбілейны творчы вечар паэтэсы і перакладчыцы Лізаветы Палеес у Дом дружбы. Пачатак а 17-й гадзіне.*

20 снежня — *на пасяджэнне літаратурнага клуба «Малінаўскія галасы» пры дзіцячай бібліятэцы № 15. Пачатак а 16-й гадзіне.*

20 снежня — *на паэтычна-музычны спектакль «Дзе жыве натхненне» з удзелам маладых паэтаў Белдзяржуніверсітэта ў Мінскі гарадскі тэатр паэзіі пры Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы. Пачатак а 18-й гадзіне.*

20 снежня — *на сустрэчу з паэтэсай і перакладчыцай Аленай Басікірскай у літаратурную гасцёўню «Аўтограф» пры інтэрнаце БДЭУ. Пачатак а 19-й гадзіне.*

22 снежня — *на сустрэчу з паэтэсай і бардам Алінай Легастаевай у літаратурны клуб «Шчырасць» пры публічнай бібліятэцы № 22. Пачатак а 16-й гадзіне.*

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

18 снежня — *на сустрэчу з Галінай Бабарыкай у СШ № 1 аграгарадка Альшаны Столінскага раёна. Пачатак а 13-й гадзіне.*

22 снежня — *на пасяджэнне літаратурнага клуба «Пінчукі» ў Пінскую цэнтральную раённую бібліятэку імя Я. Янішчыц. Пачатак а 17-й гадзіне.*

Віцебскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

21 снежня — *на літаратурную сустрэчу «Пад ціхі лёт сняжынак» з Галінай Загурскай, Мікалаем Балдоўскім, Пятром Буганавым у Полацкі лясны каледж. Пачатак а 18-й гадзіне.*

Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

19 снежня — *на сустрэчу з Людмілай Кебіч у межах цыкла «Сустрэчы з цікавымі людзьмі» ў грамадскі жаночы клуб «Сучасніца» пры Цэнтры культуры г. Гродна. Пачатак а 15-й гадзіне.*

19 снежня — *на чарговае пасяджэнне грамадскага дыскусійнага клуба «Словадром» у Гродзенскую абласную навуковую бібліятэку імя Я. Карскага (Новы замак). Пачатак а 17-й гадзіне.*

20 снежня — *на традыцыйнае мерапрыемства з цыкла «Калядныя сустрэчы ў Новым замку» з удзелам паэтаў-прадстаўнікоў розных нацыянальных дыяспар Гродзеншчыны ў Гродзенскую абласную навуковую бібліятэку імя Я. Карскага. Пачатак а 17-й гадзіне.*

22 снежня — *на адкрыццё музейнага пакоя «Лялечны дом» у бібліятэку-філіял № 3 ДУК «ЦБС г. Гродна» з удзелам Дзмітрыя Радзівончыка. Пачатак а 16-й гадзіне.*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

На працягу месяца — *на цыкл гутарак сярод вучнёўскай і студэнцкай моладзі «Скарына і яго час», «Кніжнымі шляхамі Беларусі», якія ладзяць горацкія раённыя гісторыка-этнаграфічны музей і бібліятэка імя М. Гарэцкага (у межах праекта «Духоўны патэнцыял кніжнай культуры»).*

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2018 г.

«ЛіМ»	1 месяц	падпісны індэкс
Для індывідуальных падпісчыкаў	5 р. 20 к.	63856
Ведамасная падпіска	14 р. 60 к.	638562
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў	3 р. 60 к.	63815
Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі	11 р. 00 к.	63880

Палачане

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

ЗАЧАРАВАНЫЯ МЕЛЬПАМЕНАЙ

Для мяне і маіх сяброў слова «тэатр» мела магічнае значэнне. Я памятаю, з якім зачараваннем на занятках нашага драматычнага гуртка пры Доме піянераў мы слухалі выступленне госця — акцёра коласаўскага тэатра з Віцебска народнага артыста Фёдара Шмакава, якога адмыслова запрасіў на сустрэчу з намі наш кіраўнік Анатоль Сцяпанавіч Камянкоў.

Славуты артыст, якога можна было ўбачыць на экране ў мастацкіх фільмах і які жыў і працаваў на сцэне ў блізкім, усяго за сто кіламетраў ад Полацка, горадзе, для мяне здаваўся нейкім небажыхаром, які спусціўся на нашу грэшную зямлю.

У Полацку быў народны тэатр, але неяк нас, малых, туды не пускалі, а дзіцячых спектакляў у яго рэпертуары не было.

Гэта потым, праз гады, я пазнаёміўся з легендарнай у горадзе асобай — акцёрам і рэжысёрам Мікалаем Манохіным, але пра гэта крыху пазней. Як і ў кожным, напэўна, горадзе, у Полацку быў свой «Брадвей» — цэнтральная вуліца Карла Маркса. Па вечарах тут можна было сустрэць шмат знаёмых і славутых у горадзе людзей, асабліва маладых, якія няспешна прагульваліся ад плошчы Свабоды да парку адпачынку на беразе Дзвіны. Як зараз памятаю прыгожага светлавалосага юнака Сашу Бяспалага, студэнта Мінскага тэатральна-мастацкага інстытута.

«Ён вучыцца на артыста», — шапталі за яго спінай дзяўчаты, — «будучая славутасць!»

Саша не цураўся цікаўных. З важным выглядам ён распавядаў пра вучобу, пра сваіх славутых настаўнікаў. Мне таксама пару разоў давялося пахадзіць разам са своеасаблівай «світай» будучай славутасці, слухаючы Сашавы расповеды.

Хто тады ведаў, што лёс звядзе нас у сталіцы, што буду глядзець тэатральныя работы Аляксандра Бяспалава ў тэатры кінаакцёра і ўвесь час імкнуцца падысці да яго, узгадаць родны Полацк і нашу маладосць. Ды так здарылася, што вядомы акцёр нечакана пайшоў з жыцця, і нам так і не ўдалося па-сапраўднаму спаткацца.

Затое з другім палачанінам Ігарам Сіговым мы сустрэліся ў студыі на нашым радыё і вельмі цёпла пагаварылі, ужо пасля перадачы, пра наш родны горад, пра агульных знаёмых і пра запаветныя памятныя мясціны нашай маладосці. Сёння Ігар Сігоў — вядомы акцёр купалаўскага тэатра, сапраўдная зорка, мае высокія тэатральныя званні і ўзнагароды, адзіны з нашых землякоў, які быў запрошаны як намінант на ўрачыстае ўручэнне «Оскара».

Але ў далёкія ўжо васьмідзясятыя гады полацкі школьнік трапіў у тэатральны калектыў мясцовага Дома культуры, «захварэў» тэатрам і спрабаваў паступіць у Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут.

Першая спроба была беспаспяховая. Юнак працаваў токарам на полацкім аўтарамонтным заводзе, служыў у войску. Вярнуўшыся пасля службы, спрабаваў сябе ў розных прафесіях у родным горадзе, быў нават шафёрам мясцовай райаграпрамтэхнікі.

І толькі ў 1990 годзе лёс усміхнуўся Ігару, і з таго часу пачалося яго прафесійнае служэнне Мельпамене. Любоў да акцёрскай прафесіі, народжаная ў Полацку, атрымала свой шчаслівы працяг.

І тут я зноў прыгадаю Мікалая Манохіна. Яго лёс і жыццё сталі прыкладам, відаць, не толькі для тых прафесійных тэатральных акцёраў і рэжысёраў, чыя біяграфія звязана з Полацкам, але і для многіх аматараў сцэны ў горадзе над Дзвіной.

Як і калектыву, які ён узначальваў шматлікія гады. Але гэта ўжо заслугоўвае асобнай гаворкі наступным разам.

Пісьменніцкі дом у яго зорныя часы

Не рэкамендую разглядаць мае невялікія ўспаміны як апалагетыку савецкага часу перыяду так званай адлігі, тым больш не звязваю адлігу з Мікітам Хрушчовым, а лічу яе інерцыяй радасці і ўсіх станоўчых пачуццяў, выкліканых Перамогай. А любая інерцыя ўрэшце перапыняецца. Я якраз вельмі добра памятаю, як цяжка і бедна жылі ў той час простыя людзі. Але мне пашчасціла даволі працяглы час знаходзіцца ў элітным доме, у прывілеяваным асяроддзі. Магчыма, меморый пра жыццё пісьменніцкай грамады ў яе залатую эпоху будзе цікавы для чытачоў. На жаль, перадаць *атмасферу часу* ў словах немагчыма…

Мая сям'я засялілася ў дом па мінскай вуліцы Карла Маркса, 36 недзе ў 1954 ці 1955 г., але не пазней. Дом лічыўся «пісьменніцкім» і знаходзіўся якраз насупраць тагачаснага Саюза пісьменнікаў па вуліцы Энгельса. Для арыенціроўкі — побач з кінатэатрам «Піянер». Але, натуральна, кінатэатра тады не існавала: я памятаю, як ён будаваўся. А Саюзу пісьменнікаў улады перадалі той двухпавярховы, на цокалі, будынак, у якім Алена Мазанік знішчыла намесніка Гітлера ў Беларусі — гаўляйтара Кубэ. Пасля вайны гэты, у пэўным сэнсе гістарычны, будынак, які сёння не існуе, адрамантавалі і падарылі пісьменнікам. І жыллё для іх пабудавалі амаль насупраць.

Адрас — вуліца Карла Маркса, 36, але часткова дом заходзіць і на вуліцу Энгельса. Будаваўся ён, я думаю, на сродкі тады багатага Літфонду, але быў, безумоўна, задзейнічаны, як звычайна рабілася, і долевы дзяржаўны капітал. Па гэтай прычыне не ўсе кватэры прызначаліся пісьменнікам. Так, у 3-м пад'ездзе жылі прадстаўнікі розных іншых прафесій, у тым ліку рабочыя. А ў нашым пад'ездзе, сярэднім, які лічыўся элітным, на другім паверсе пасяліўся нейкі надзвычай важны генерал, ці не з КДБ, які абсалютна не кантактаваў, нават не вітаўся са сваімі суседзямі-пісьменнікамі, шумнымі, вясёлымі, дынамічнымі і, на думку ваеннага чалавека (па словах яго хатняй работніцы), яўна палітычна няўстойлівымі.

Такім чынам, толькі два пад'езды пяціпавярховага дома належалі ўласна літаратарам. У першым пад'ездзе, кватэры якога выходзілі і на К. Маркса, і на Энгельса, на кожнай пляцоўцы размяшчалася па чатыры кватэры: двухпакаёвыя і трохпакаёвыя. Тут пасяліліся Усевалад Краўчанка, Іван Грамовіч, Аляксей Зарыцкі, Уладзімір Карпаў, Кастусь Кірэенка, Тарас Хадкевіч і некаторыя іншыя. У прыватнасці, на другім паверсе, у трохпакаёвай кватэры, у мае раннія гады жыў класік беларускай дзіцячай літаратуры Янка Маўр. У яго ў першага з'явіўся тэлевізар, і ўсе дарослыя суседзі, а таксама мы, дзеці, хадзілі да яго глядзець перадачы, якія напачатку ішлі па дзве-тры гадзіны ў дзень. Сядзелі мы, дзеці, на падлозе, на чырвона-чорным дыванку, падораным Маўру гасцямі з Сярэдняй Азіі, аматарамі яго творчасці (!).

У другім пад'ездзе на кожнай пляцоўцы размяшчалася па дзве кватэры: злева — чатырохпакаёвыя, справа — трохпакаёвыя. Усяго восем кватэр, пачынаючы з другога паверха, таму што першы паверх — да будаўніцтва метро, якое прайшло акурат пад домам, — быў поўнасцю заняты кнігарняй — намнога большай плошчы, чым цяпер. Яна называлася «Палітычная кніга», але ў ёй паступова адкрылі аддзелы і па іншых галінах ведаў, а таксама мастацкай літаратуры. Аказаўся тут і вялікі канцылярскі аддзел, які мы, школьнікамі, любілі — куплялі тут алоўкі, фарбы, сшыткі і альбомы. Безумоўна, асартымент быў намнога бяднейшы за цяперашні, але на той час ён задавальняў патрэбы карыстальнікаў, нават і эстэтычныя: памятаю, напрыклад, розныя віды пеналаў. У мяне, скажам, нейкі час быў драўляны, распісаны «пад Хахламу».

У будынка мелася адна канструктыўная асаблівасць, якая сёння адсутнічае. З двара на вуліцу Энгельса ішоў праход на ўсю шырыню дома — менавіта для зручнасці, каб хутчэй трапляць у Саюз пісьменнікаў — дастаткова перайсці дарогу. Па вечарах і начах у праходзе было страшнавата, але за пятнаццаць гадоў, што мы там пражылі, я не памятаю выпадкаў нападу злодзеяў ці іншых непаразуменняў. Ужо ў гады так званай перабудовы праход акупіравала нейкая махлярская крама, якіх з'явілася тады вялікае мноства, і ўсе жыхары, каб трапіць на Энгельса, вымушаны былі абыходзіць па двух дварах у арку, што выходзіць на вуліцу Маркса. Так яны ходзяць і цяпер.

Дом тады нам, дзецям, здаваўся велізарным, а сёння бачыцца кранальна маленькім. Паміж другім пад'ездам, дзе наша сям'я жыла на чацвёртым паверсе, і першым пад'ездам, дзе аказалася шмат сяброў, можна было прайсці не толькі па двары, але і па падвале, і нават па гарышчы. Аднак паколькі мой брат Саша падлеткам трымаў на гарышчы галубоў і часта, ганяючы іх, выбіраўся на дах дома, то, па просьбе Янкі Брыля, які жыў на пятым паверсе, гарышча, урэшце, закрылі на замок і галубятні ліквідавалі. Між тым развядзенне галубоў — цікавая асаблівасць побыту 1950-х гадоў нават у сталічных гарадах СССР. Памятаю проста апантаных аматараў. Але такая форма неардынарнага адпачынку хутка адышла. Праўда, у пісьменніцкіх сем'ях, якія пераважна паходзілі з вёсак, для дзяцей трымалі шмат розных жывёлінак. Так, у нас пастаянна жылі рыбкі, некаторы час — вавёркі, вожыкі, коцікі, даволі доўга — папугайчыкі. Экзатычных птушак прывозілі і мы, і нашы суседзі з Латвіі, калі адпачывалі, прычым даволі часта, у курортнай Юрмале ў Доме творчасці пісьменнікаў СССР.

У нашым доме першапачаткова былі пліты, у якіх палілі дровамі (сёння нават цяжка ўявіць!). Дроўніцы знаходзіліся на дварэ — на тым месцы, дзе цяпер размяшчаецца кінатэатр «Піянер». І яшчэ характэрная для таго часу дэталь: на такі дом, як наш, прызначаўся домакіраўнік — гаспадарнік, які адказваў за ўсю інфраструктуру, вырашаў побытавыя пытанні. Я яго памятаю: былы вайсковец, які, натуральна, добра ведаў жыхароў і іх патрэбы. Але хутка стварылі домакіраўніцтва, у якім чыноўнікам было, ясная справа, не да кожнага асобнага жыхара. Сёння працэс бяздушнай бюракратызацыі, механістычнай манапалізацыі сферы жытла і, значыць, яшчэ большага абязлічвання ўсіх нас, хто жорстка залежыць ад рознага роду манаполій, пайшоў намнога далей. І не толькі ў ЖКГ.

Фота Таццяны Блахіной.

Сучасны выгляд пісьменніцкага дома на Карла Маркса, 36.

У савецкі час таксама існавала шмат бюракратычных структур, служачых, чыноўнікаў. Але ўсё неяк складвалася прасцей і набліжана да чалавека. Скажам, работа пошты. Сёння мала хто памятае, што жыхары атрымлівалі першыя газеты яшчэ да сняданку — да 8 гадзін раніцы. А насілі карэспандэнцыю тры разы на дзень. Тое паштовае аддзяленне — № 30 па вуліцы Кірава, што абслугоўвала дом, і сёння існуе. Ды толькі тады яно працавала без выходных дзён і без перапынкаў на абед. Я памятаю, як абураліся пісьменнікі — а ім прыходзіла шмат карэспандэнцыі, — калі аб'явілі пра перапынак на пошце: такога проста не можа быць, лічылі яны, каб на пошце — і перапынкі!

Па дыяганалі ад уваходу ў кнігарню — Дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, які ў нашым дзяцінстве якраз перабудоўваўся, а сёння адрадзіўся ў ранейшым абліччы пачатку XX стагоддзя. Метамарфозы пры жыцці аднаго пакалення! Між іншым многія пісьменнікі сябравалі з акцёрамі. І таму ў нас дома я часта бачыла карыфеяў таго часу — Глеба Глебава, Яўгена Палосіна, Зінаіду Браварскую, Лявона Рахленку, Лідзію Ржэцкую. Усё жыццё мае бацькі сябравалі з выдатнай актрысай і чалавекам Марыяй Захарэвіч.

Таццяна ШАМЯКІНА,
доктар філалагічных навук, прафесар

(заканчэнне — у наступным нумары)

АПРАЎДАННЕ ДАБРЫНЁЙ

Няма нічога дзіўнага ў тым, што празаіка Уладзіміра Саламаху я ўпершыню адкрыў для сябе, прачытаўшы ў свой час яго дарожныя нататкі. Здавалася б, якое там можа быць адкрыццё, калі чалавек занатоўвае ўсё, што толькі бачыць на сваім шляху. А гаворка тычылася падарожжа ў гурце сяброў па рацэ Бярозе. Але ў ракі ёсць два берагі, і на кожным з іх — сваё жыццё, якое здольны заўважыць толькі дапытлівы і зацікаўлены. У ракі яшчэ ёсць свая плынь, якая таксама мае свой характар і скіроўвае думкі і зрок не толькі ў напрамку руху самой лодкі. А падсілкаваўшы ўсё гэта адчуваннем, развагамі ды суперажываннем, спарадкавана і роздумна можна выгрунтоўваць у шчырую і зацікаўленую размову пра наша асяроддзе, пра людзей і час ды і будучае нашага краю. Усё гэта і было ў аўтара, і яно мяне кранула. Тады і захацелася прачытаць усё астатняе, напісанае ім, яго кнігі «На ўзмежку радасці», «Заўтра ў дарогу», «Кавалёк — лесавая былінка», «Расступіся, зямля», «Цяпло чужога сэрца» і іншыя творы.

Фота Кастуся Дробава.

Уладзімір Саламаха.

Напрыканцы мінулага ўжо веку часта казалі, што ў літаратуру прыходзяць новыя здольныя празаікі, якія, на жаль, часта не маюць сваёй тэмы. І тады, згадваючы ўпамянёныя ўжо нататкі У. Саламахі, прамовілася такое: «Дайце пісьменніку сваю раку — і ён адшукае сваю тэму». Меў я на ўвазе родную для пісьменніка раку Добасну — як і Бяроза, яна належыць да аднаго Дняпроўскага басейна. З той самай крынічкі, што жывіць родную раку, бярэ свае вытокі і талент Уладзіміра Саламахі. Рака дзяцінства невыпадкова прысутнічае амаль у кожным ягоным творы. Вось і герояў сваёй трылогіі «І няма шляху чужога» (першая і другая аповесці надрукаваны ў кнізе «Сустрэчы без расставанняў» (Мн., Мастацкая літаратура, 2016); трэцяя, заключная, — у часопісе «Полымя» № 5—6, 2017) аўтар паселіць на тыя самыя родныя берагі. У творы рака значыцца пад назвай Дубасна. Варта сказаць, што пісьменнік ніколі не паўтараецца, малюючы ўжо знаёмыя па ранейшых творах берагі. Бо і сама рака ў сваёй прыгажосці непаўторная.

І самы патрабавальны чытач не можа ўпікнуць аўтара ў няведанні таго матэрыялу, які ён бярэцца творча асэнсаваць. А гэта падзеі Вялікай Айчыннай вайны і часу блізка пасляваеннага. Як вядома, Уладзімір Саламаха нарадзіўся ў пасляваенны год. Вайны не памятае. Аднак жа існуе і будзе існаваць яшчэ памяць нашых бацькоў, дзядоў і прадзедаў, памяць народа, якой усе мы і памятаем тыя падзеі. Як і прадчувалі нашы папярэднікі, старэйшыя пісьменнікі, тыя, хто ў большасці сам прайшоў праз пекла вайны, трагічная і гераічная тэма яшчэ доўга будзе адгукацца рэхам у творах наступных пакаленняў. І тэма гэта, як паказвае досвед, невычарпальная.

У. Саламаха ў нашым выпадку выступае пераканаўчым і дасведчаным новапраходцам яе. Невыпадкова чытачка з Гомеля А. Целяпнёва, нашмат старэйшая за аўтара, у сваім лісце на яго імя заўважае: «Глыбока зазірнулі вы ў душу вяскоўцаў, што напакутаваліся не па сваёй віне і да вайны, і ў вайну, і потым. Яны ў вас як жывыя… У мяне адчуванне, што я з імі дзесьці сустракалася...». Сапраўды, У. Саламаха здолеў вельмі арганічна, без выдумкі і фальшу прайсці доўгім і пакутлівым шляхам сваіх герояў, перажыў і асэнсаваў усё, што перажыта імі.

Тое, што выпала на жыхароў маленькай прырэчнай вёскі Гуда, і ў страшным сне прысніць немагчыма. Усю вёску разам з пабудовамі карнікі няшчадна знішчылі, пакінуўшы толькі на ўскраіне нейкую трухлявую будыніну. Жыхароў сагналі ў клуб і падпалілі. Выжыць у гэтай трагедыі пашанцавала нямногім. У ліку іх і галоўны герой трылогіі Іосіф Кучынскі. Само жахлівае відовішча знішчэння Гуды аўтар пакажа нам яго вачыма, а зрокам сваім пранікліва зазірне і ў душу героя. Воляй неверагодных абставін старому Іосіфу Кучынскаму наканаваны лёс не толькі пакутніка, але і выгнанніка. Ён адзін мусіць узваліць на свае плечы цяжар таго, што здарылася. А віну яго людзі бачаць у тым, што ён — бацька паліцая Стася, які бярэ непасрэдны ўдзел у карным злачынстве, у расправе над сваімі аднавяскоўцамі.

Як бачна, нават сам час не дае згоды на формулу, якая вынікае з няпісанага закона справядлівасці (бацька не адказвае за сына), як не згадзіўся ён яшчэ нядаўна з зусім падобнай формулай, калі сын не адказвае за бацьку. Адказвалі, яшчэ як адказвалі!

Здавалася б, самыя блізкія людзі, нават сябры, як Яўхім, у цяжкую хвіліну адварочваюцца ад Іосіфа. Такое ўжо лёсавае наканаванне ў галоўнага героя твора. Пакутаў хапала яму яшчэ ў дзяцінстве. Ён — сірата, маці памерла падчас родаў у полі. Нешчаслівае і юнацтва ў Іосіфа. Ён моцна закаханы ў тутэйшую прыгажуню Тэклю, якую гвалціць і прымусова бярэ ў жонкі ненавіснік і нягоднік Аўдзей Юхнавец. Абставіны складваюцца так, што сам Іосіф жэніцца з нялюбай Марыяй, якая кахае зусім іншага чалавека. Пакутуючы ад гэтага, Іосіф яшчэ не ведае, што самых вялікіх пакут яму трэба чакаць ад іхняга з Марыяй сына Стася. Стась вырастае здраднікам. Ён ідзе служыць у паліцыю, здзекуецца з вяскоўцаў, а потым і чыніць над імі расправу.

Тое, што творыцца ў самой збалелай душы Іосіфа, вяскоўцы зразумеюць не адразу. Шукаючы выйсця з нявыйсця, Кучынскі знаходзіць паратунак на далёкім закінутым хутары Кашара, гаспадары якога яшчэ да вайны сасланы ў чужынныя далечы ГУЛАГа. Але і там у адзіноце пакутніцкі боль Іосіфа не сунімаецца, а робіцца яшчэ больш адчувальным. Усвядомленае пачуццё віны ўжо само па сабе ёсць пакараннем для чалавека, а калі да гэтага дадаецца яшчэ чыесьці асуджэнне, непрыязнасць, нават нянавісць, чалавечыя мукі падвойваюцца, а то і патройваюцца. Аўтар трымае чытача ўвесь час у напружанні, як бы ні хацелася перайначыць хаду падзей на іншы, прасцейшы манер.

У простых рэчах і разбірацца проста, тут усё, як кажуць, на паверхні, а складанае ўзмацняе задачу пісьменніка, хай ён і самы дасканалы даследчык. Трэба адзначыць аўтарскае ўменне заглыбляцца ў перажыванні свайго героя. Калі я жыву тым самым, чым жыве і герой твора, — гэта ўжо заслуга аўтара, які заўсёды здольны паставіць сябе на яго месца. Гэта мастацкае пераўвасабленне даецца заўсёды не проста. Сама жыццёвая праўда вымагае ад пісьменніка не простага суперажывання, але і душэўнай самаахвярнасці, умення пераадольваць звыклыя схемы, а самае галоўнае — разумення паводзін чалавека ў пэўных абставінах, асабліва калі яны экстрэмальныя. Веданне жыцця — галоўная перадумова аўтарскага поспеху. Усё гэта добра разумее Уладзімір Саламаха, інакш бы і не браўся за такую адказную тэму.

Можна смела сцвярджаць, што яна ў яго выпакутавана не толькі ягонымі героямі, але і ўласным вопытам. Мы не памылімся, калі скажам, што ў пісьменніка багатая інтуіцыя, якая дазваляе высвечваць праўдзівым зрокам не толькі рэальнае, але і ўяўнае. Зусім не займальніцтвам, не нейкімі прыгодніцкімі эпізодамі аўтар імкнецца прыцягнуць увагу чытача, а менавіта праўдай, нідзе не прыхарошваючы яе, але і не перабольшваючы да неверагоднасці ўсяго магчымага. Пісьменнік валодае сваёй, толькі яму ўласцівай манерай празаічнага расповеду, якая носіць не столькі назіральны, колькі аналітычны характар.

Трагічнага шмат не толькі ў першых дзвюх аповесцях маштабнага твора — яно скрозь прасочваецца і ў заключнай аповесці «Калі ўпадзе адзін...». Трагічнае творыцца ўнутры самога галоўнага героя, менавіта ў яго душы. Праўда, у бязлюднай адзіноце, адчуваючы сябе самотным рабінзонам па няволі, жывучы ў пастаянным страху перад невядомасцю, баючыся нават сустрэчы з людзьмі, чакаючы толькі горшага, надараюцца і хвіліны душэўнага прасвятлення і нават узвышэння. Дзесьці з небыцця вяртаецца да Іосіфа яго даўняе каханне, яго Тэклюшка. І гэта як своеасаблівае вяртанне ў маладосць, да таго, што павінна было адбыцца, але не адбылося. Тады нават позняя пяшчота здаецца дзіўнай раскошай: «...Яму здавалася, што пяшчота тая сыходзіла аднекуль здалёк, з іхніх маладых гадоў. Яна наплывала паступова. Кранала ўсё навокал: асвятляла лес, на які ўжо апускалася валкаватая шэрасць, цёмна-зялёную траву, па якой былі раскіданы чырвоныя, блакітныя, белыя кветкі, сіняе неба з шыза-жоўтымі аблокамі, і паступова ўлівалася ў яго душу».

На працягу ўсяго дзеяння ў заключнай аповесці «Калі ўпадзе адзін...» аўтар нібы шукае апраўдання свайму герою і знаходзіць яго ў чалавечай дабрыні. Вайна, хоць і паставіла чалавека перад вялікім выбарам, часта штурхаючы яго ў стан безвыходнасці, не адмежавала ад той дабрыні, якая спрадвеку чалавека ратавала і ўзвышала. Дабрыня — паняцце спрадвечнае. У пісьменніка Уладзіміра Саламахі, які і сам у жыцці шмат чаго перажыў, разуменне яе абвостранае. Нездарма амаль у кожным сваім творы ён апелюе толькі да дабрыні. Менавіта дабрыня, тая самая чалавечнасць — галоўны крытэрый у творчасці У. Саламахі. Аўтар перакананы, што ўсё адмоўнае ў нашым жыцці — і звышнапорыстае зло, і ваяўнічая бездухоўнасць — заўсёды адступае перад ёй, хай сабе і безабароннай, дабрынёй. На дапамогу Іосіфу Кучынскаму прыйдуць і яго былы сябра Яўхім, які і сам пакутуе не менш ад Іосіфа, і яго ўнук Валік. Шлях да разумення чалавека заўсёды ляжыць праз ісціну. Часта, каб дайсці да яе, трэба не толькі прамераць на лодцы шлях ад Гуды да хутара Кашары, трэба яшчэ адолець перашкоды сумненняў і нявер'я. Бо часта віну чалавеку ствараюць не яго ўчынкі і перакананні, а людская падазронасць, нежаданне зразумець ці няўменне зазірнуць у душу. Урэшце стане зразумелым, што паліцай Стась не сын Іосіфу. Ён сам і прызнаецца Яўхіму: «Нікому не казаў, а табе скажу: не з маёй ён яблыні». І яшчэ адно цяжкае прызнанне Іосіфа: «Тады, калі вёску спалілі, калі людзей знішчылі, я сына свайго хацеў застрэліць… Кат ён, з ворагам быў. Вінтоўку на яго наставіў, і не змог». Гэта, другое прызнанне, нібыта канчаткова перакрэслівае ўсю віну галоўнага героя. З гэтага моманту вяскоўцам будзе зразумела, што зусім не крыўда трымала яго тут, на далёкім хутары, цэлых сем гадоў. За гэты час ён па-пакутніцку пражыў нібы другое жыццё і цяпер мусіць вяртацца да першага.

Апраўданне чалавека дабрынёй і апраўданне і абарона самой дабрыні — менавіта гэтыя высакародныя задачы ставіць перад сабой аўтар у сваім разгорнутым творы і вырашае іх па-свойму пераканаўча і для чытача запамінальна.

Апошняя, заключная аповесць трылогіі бадай самая дынамічная і разнапланава разгорнутая. Мы не толькі ўважліва адсочваем пакутніцкае жыццё Іосіфа Кучынскага на закінутым хутары, але і з'яўляемся сведкамі адраджэння спаленай вёскі, бачым і адчуваем, як цяжка загойваецца рана.

І вяртаецца да жыцця ўсё тое, што скалечана вайной. Рэтраспектыўна ў канву аповесці ўплецены і падзеі пачатку Вялікай Айчыннай вайны, самыя трагічныя моманты адступлення, зараджэнне партызанскага руху ў акупаванай фашыстамі краіне. Ваенныя эпізоды цалкам грунтуюцца на дакументальнай аснове, пра што і папярэджвае нас аўтар у своеасаблівых зносках. Адна з іх сцвярджае: «Гісторыя баявых таварышаў майго бацькі Пятра Максімавіча, франтавога шафёра». Думаецца, гэты нечаканы аўтарскі прыём зусім не змяншае вартасці аповесці.

Новы твор Уладзіміра Саламахі — гэта асэнсаванне далёкіх ваенных падзей вачыма і роздумам нашага сучасніка. Але цікавы для нас ён не толькі гэтым, але і сваёй узважанасцю перажытага народам і краінай, добрай мерай разважлівасці, шчырасцю і глыбінёй думкі.

Казімір КАМЕЙША

Ад злосці... да мілосці

З'яўленне перакладу «Суперкнігі пра Біла з Болаю (Біл разумны, а Бола вясёлая)» Гунілы Бэргстрэм, выкананага Андрэем Хадановічам пры ўдзеле Алесі Башарымавай і Надзеі Кандрусевіч («Кнігазбор», 2017. Падсерыя «Каляровы ровар»), — з'ява не шараговая. З аднаго боку, гэта не першая кніга для дзяцей «пра страшнае» — ужо маем, як найменш, «Кніжку пра смерць» Пэрнілы Стафэльт (2014), таксама перакладзеную са шведскай мовы. У нашай культурнай прасторы ёсць досвед і «кніг пра іншых» — адрозных у псіхафізічных адносінах. Праўда, у асноўным рускамоўных.

Сінція Лорд, аўтар перакладзенай на рускую мову кнігі «Правілы. Не здымай нагавіцы ў акварыуме» наведвала Мінск і распавядала беларусам пра сваю кнігу і сям'ю, гісторыя якой паслужыла асновай для кнігі: расповед тут вядзецца ад імя сястры асаблівага хлопчыка. Беларуская пісьменніца і рэжысёр Людміла Шапавал (Міла Пархац), маці хлопчыка з аўтызмам, у 2014 годзе выдала кнігу казак «Аўтыліус», а ў 2017-м зняла кароткаметражны фільм «Абібу» паводле адной з казак кнігі. Але трэба прызнацца, што аўдыторыя гэтых праектаў даволі вузкая, збольшага спецыялізаваная, у тым ліку праз «балючасць» і непапулярнасць тэмы. Аднак у гэтых творах пазначаны сучасны падыход да ўключэння асаблівага чалавека ў грамадства: не аддзяліць яго, змясціўшы ў «спецыяльную ўстанову», не змусіць падладкоўвацца пад грамадскія патрабаванні, а спрыяць пашырэнню талерантнасці, вылучэнню нішаў для тых, хто не адпавядае пакуль што існым параметрам «грамадскай карыснасці і прымальнасці».

«Суперкніга пра Біла з Болаю» ў Беларусі ад пачатку існуе не толькі як выданне, але як сацыяльны праект. Надзея Кандрусевіч, ініцыятар перакладу, у адным з інтэрв'ю зазначае, што імкнулася зрабіць перакладчыцкую працу над кнігай як мага больш масавай, каб прыцягнуць да яе праблематыкі больш людзей. Пасля выхаду кнігі распачаліся выступы перакладчыкаў, у тым ліку з тэатралізаваным чытаннем, якое зладзіў лялечны тэатрык «Лямцавая батлейка», і гэта паказвае, што яны хочуць дабіцца шырокага розгаласу: не толькі каб як найбольш чытачоў атрымалі добрую кнігу, але і каб задумаліся над узнятай у кнізе праблемай.

Мастацкія вартасці выдання спрыяюць гэтаму. Як арыгінал, так і пераклад таленавітыя, здольныя захапіць не толькі важкасцю праблемы, але і гумарам, і афарыстычнымі радкамі, і слоўнай гульнёй.

Кніга паказвае праблему з'яўлення асаблівага чалавека «знутры» — з гледзішча сям'і, у якой расце незвычайная дачка. Гэта гарманічная сям'я, тут новага чалавечка чакаюць, яго нараджэнню радуюцца і ўспрымаюць як цуд. Але з цягам часу высвятляецца, што цуд «з сюрпрызам», і далей жыццё пойдзе не так, як планавалася. Аднак аўтар часта акцэнтуе не спецыфічнае, уласцівае сем'ям, якія сутыкнуліся з хваробай ці асаблівасцямі развіцця дзіцяці, а ўніверсальнае: нараджэнне новага, свайго любімага малога — невымоўны цуд. Гэты чалавечак будзе заставацца блізкім і любімым незалежна ад таго, што з ім здарыцца далей. Усе ў сям'і, малыя і вялікія, прыслухоўваюцца адно да аднаго, паважаюць адно аднаго, і гэта дазваляе пераадольваць цяжкасці.

Сям'ю — герояў кнігі — ратуе і гумар, які перамагае сум і страх. Парадаксальнае, абсурдна-клоўнскае спалучэнне жахлівага і вясёлага заяўлена ад пачатку кнігі:

Гэты аповед жахлівы бязмежна!
Страшны і сумны...
аж робіцца смешна!

Смех — вядомы рэцэпт пераадолення жахаў, і ён паслядоўна выкарыстоўваецца Гунілай Бэргстрэм, а за ёю — і беларускімі перакладчыкамі.

Жахлівы аповед працягваем далей!
Вам страшна? А будзе... яшчэ весялей!

Канчаткова тэма жахаў вырашаецца ў фінальным вершы, дзе сямігадовы Біл развітваецца з «жахалкамі» для малых, але з ім застаецца Бола, і гэта ўжо не жах, а цуд, які робіць успрыманне жыцця вастрэйшым.

Побыт сям'і з усімі мілымі (і не надта) немаўлячымі дробязямі самы звычайны, і гэта робіць падзеі кнігі блізкім для ўсіх сем'яў з дзецьмі. Бяда, што прыходзіць у сям'ю, здаецца, падзяляе жыццё на дзве часткі — «да» і «пасля», паміж якімі стаіць страшнае «больш ніколі»:

Ёй ніколі-ніколі на свеце,
Больш НІКОЛІ не быць
Як усе!

Аднак цікава, што і тут працягваюцца гульні на дзіцячы ўзор: у тэксце гэта найперш гульні са словамі. Беларуская мова і перакладчыцкая вынаходлівасць дазваляюць гуляць нават з імёнамі герояў. У выпадку Болы гэта сумная гульня: Бола — боль — «больш ніколі». Але магчымая і цалкам вясёлая: «Болачка! Глядзі! Булачка!».

Гэткім жа чынам, паўсур'ёзна-паўжартам, з «дзіцячымі» наватворамі, апісваецца бясконцы шэраг спецыялістаў-дыягностаў, што прыйшлі да Болы:

Прыйшлі дыетолаг,
Дзіцёлаг, гульнёлаг —
І нават адзін арнітолаг...

Гульнёй слоў афармлены і самы дакладны з усіх пастаўленых Боле дыягназаў: «Яна думае. Только паволі». Тут пытанне ў тым, куды паставіць акцэнт. Калі на «паволі» і нават «толькі паволі» — то бок «выключна паволі», — то карціна сумная. Калі на «думае», а «толькі паволі» («проста паволі») успрымаць як удакладненне хуткасці думання, карціна значна весялейшая. І, мабыць, гэтае пазітыўнае стаўленне і бярэцца за аснову сям'ёй Болы.

Гульня адбываецца з рытмам: Андрэй Хадановіч, каментуючы яго, кажа пра «дзіцячы рэпчык», але мы мусім адзначыць гнуткае выкарыстанне рытмаў, уласцівых менавіта дзіцячай паэзіі, таму акцэнт паставілі б не на «рэпчыку», а на «дзіцячым». Пры гэтым усе ваганні рытму абумоўлены зместам.

Перакладчык захоўвае і «калажную» цытатнасць арыгінальнага тэксту, якая адпавядае тэхніцы ілюстрацый. Пры гэтым цытаты добра пазнавальныя менавіта для сучасных беларусаў: «Што не з'есць — панадкусвае» — кажацца пра дачыненні Болы да яблыкаў у краме, дзе ў продажы ёсць, між іншым, і вышымайкі. Сама мова перакладу, з сучаснымі гутарковымі ўключэннямі, нагадвае калаж з фэйсбучных постаў або каментарыяў пад праблемнымі артыкуламі. Але гэта мае грунт: бо гутарка пра надзённае, сур'ёзнае вядзецца проста, ад чалавека да чалавека, без пасрэдніцтва стылістычных умоўнасцяў.

Самыя балючыя кропкі расстаўлены вельмі проста і, можна сказаць, афарыстычна.

Мы аплаквалі беды свае,
І ніхто не зірнуў на яе! — кажуць дарослыя, абудзіўшыся (дзякуючы Білу) ад суцэльнага перажывання гора.

Дыскусійныя разважанні пра стаўленне да «іншага», «адрознага» (у тым ліку ў самім сабе) вытрыманыя ў той жа нязмушанай стылістыцы:

Ды хто мы такія,
Што знаем адвеку,
Якім трэба іншаму
Быць чалавеку?..

Як усе быць? Чаму «як усе»?
Будзь як ёсць — ува ўсёй красе!

І нарэшце:

Каб не дзеці з загадкай цяжкой,
То навошта бацькі
з іх разумнай-разумнай башкой?

Гэта напраўду просталінейна, але трапна сфармуляваная нагода задумацца для дарослых.

Разумныя ў кнізе не толькі дарослыя. У загалоўку адзначана, што найперш тут разумны Біл. Праз гэтага персанажа выказана не толькі праблематыка, звязаная з жыццём сіблінгаў (братоў і сясцёр) асаблівых дзяцей. Біл таксама асаблівы — бо ён разумны. Гэта ён дае Боле імя, ён дорыць ёй найлепшы падарунак на дзень нараджэння, ён праходзіць праз злосць («Верш злосці», «...яшчэ адзін верш злосці») да мілосці («Верш мілосці»), ён сам аказваецца здольным справіцца з крыўднымі дражнілкамі сяброў з двара, мудра зазначыўшы:

Быць старэйшым братам дурнічкі —
Справа звычкі.

(Заўважым у дужках: і не толькі старэйшым братам. Прымаць іншых — увогуле справа звычкі, проста пакуль што ў нашага грамадства звычкі іншыя.)

Мабыць, не кожнае дзіця здольнае на такі разважлівы падыход да вырашэння недзіцячых цяжкіх пытанняў. Ці ў такім разважанні схаваная недаацэнка здольнасцяў нашых дзяцей? Магчыма, калі давяраць ім болей і размаўляць з імі як з разумнымі, яны напраўду акажуцца разумнымі?

«Суперкніга пра Біла з Болаю» прымушае задумацца. У нашай культуры, асабліва ў яе дарослых прадстаўнікоў, яна, не выключана, можа выклікаць нават дысананс. Як гэта так: Бола пашкодзіла не менш за палову крамы, беззваротна сапсаваўшы тавары, а бацькі аплацілі з усяго гэтага толькі пірог і яблыкі (нават не цукеркі, якія Бола панадкусвала разам з Білам)! І як дзіўна рэагуюць іншыя пакупнікі: даведаўшыся, што Бола нездаровая, яны ўсе пачынаюць яе шкадаваць, даваць карысныя парады, і ніхто не працягвае асуджаць бацькоў ці, тым больш, не згадвае пра які-небудзь спецінтэрнат, куды дагэтуль могуць «скіраваць» бацькоў з незвычайным дзіцём у нас.

Магчыма, спрэчным падасца і «рэцэпт» ад «хваробы» Болы, прапанаваны яе найбольш дакладным дыягностам: «Трэба любоў і клопат». Але гэта напраўду самы дакладны рэцэпт. На маю думку, гэта адзін з галоўных універсальных сэнсаў кнігі, якую, дарэчы, ужо вызначалі як «кнігу пра любоў»: любоў і клопат адно пра аднаго, не толькі ў сям'і, але і ў грамадстве, можа дапамагчы справіцца з мноствам самых разнастайных бедаў. І гэты выхаваўчы і тэрапеўтычны сэнс кнігі, будзем спадзявацца, паўплывае на многіх яе чытачоў — і малых, і вялікіх.

Вельмі хацелася б, каб абмеркаванне пытанняў, узнятых Гунілай Бэргстрэм, не спынілася на гэтай кнізе. Філасофскі змест, які смела і адначасова даступна падаецца тут, нетыповы для дзіцячай літаратуры ўвогуле, але дзецям патрэбныя і такія творы.

Вера БУРЛАК

Бачыць розныя колеры

Кніга Гунілы Бэргстрэм — адна з нешматлікіх, якая распавядае адначасова пра шчасце і вялікі боль, радасць і пачуццё бездапаможнасці сям'і, у якой нарадзілася незвычайнае дзіця — дзіця з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, паводле медыцынскай тэрміналогіі.

Як чалавек, які ўжо болей за 20 гадоў працуе ў псіхіятрыі, я даволі часта сустракаюся з праблемамі такіх сем'яў.

Спачатку ўсё файна.
Малая расце звычайна.

Аўтызм сапраўды наступае як нябачны вораг. Спачатку дзіця развіваецца, як усе, а часам нават і апераджае аднагодак. Але на нейкім этапе раптоўна выяўляецца знікненне навыкаў, шмат хто размаўляе так званай птушынай мовай альбо ўвогуле перастае размаўляць. Развіццё нібыта спыняецца, бацькі звяртаюцца па дапамогу да спецыялістаў. Яшчэ ёсць надзея, што ўсё выправіцца і дзіця будзе звычайным, нармальным. Пачынаецца ўнутраная барацьба, якая мае вынікам прызнаць праблему і прыняць сваё дзіця такім, якім яно ёсць, навучыцца з гэтым жыць. На жаль, гэта не заўсёды атрымліваецца.

Таму вельмі важная, на мой погляд, размова Біла з маці, калі ён кажа:

Я не хачу мець такой
сястры!
Чуеш, мама!
І мама прызнаецца ў адказ:
О Госпадзе, я таксама…
А яшчэ б хацела мець
іншыя рысы твару я,
І не шэрыя вочы, а карыя!
І яшчэ не хацела б дажджу,
Але ён ідзе, і я пад
дажджом хаджу.

На жаль, сёння ў нашым грамадстве няма спрыяльнага стаўлення да такіх дзетак, як Бола. Сумняваюся, што нашы суайчыннікі задумваюцца, што адчуваюць такія «асаблівыя» мамы і таты, старэйшыя ці малодшыя браты і сёстры. Нежаданне Біла мець такую сястру ёсць вынікам несуцешанага болю за яе і праз немагчымасць супрацьстаяць негатыўнай рэакцыі атачэння. Біл пакутуе не менш за бацькоў. І калі чытачы далучаюцца да гэтых эмоцый, ім хочацца падтрымаць Біла. І гэта таксама адзін з найважнейшых момантаў у кнізе — абудзіць спагаду да праблем, пачуццяў, перажыванняў іншага чалавека, якому, магчыма, акурат у гэты момант патрэбная нашая дапамога.

Кніга Гунілы Бэргстрэм не толькі звяртае ўвагу на незвычайных, асаблівых дзяцей, але і дае магчымасць даведацца, што адбываецца з сям'ёй, у якой з'явілася такое дзіця, паглядзець на праблему іншымі вачыма. Найперш з пазіцый дапамогі ў адаптацыі такіх дзяцей.

Сапраўды неверагодна, што аўтар — мама дзяўчынкі з аўтызмам — знайшла ў сабе сілы распавесці гэтую гісторыю. Актуальнасць такіх кніг у нашым грамадстве відавочная. Кожнаму бацьку ці маці асаблівага дзіцяці важна ведаць, што яны не адзіныя з такой праблемай у гэтым свеце. Ёсць многа сямей, якія змаглі пераадолець унутранае супраціўленне ў такой складанай жыццёвай сітуацыі: прыняць сваё дзіця такім, якое яно ёсць, пакрысе вучыцца жыць па-новаму, разам з ім і яго асаблівасцямі. У жыцці шмат розных колераў і сэнсаў. Галоўнае — хацець гэта ўбачыць.

Наталля ЛІСОЎСКАЯ,
псіхолаг Гарадскога клінічнага дзіцячага псіхіятрычнага дыспансера, кансультант тэлефона даверу для дзяцей і падлеткаў

МАСКВІЧ З ДУШОЮ БЕЛАРУСА

Івана Бурсава нярэдка прадстаўляюць як вялікага рускага пісьменніка-казачніка. Але ж ён з нашых — з беларусаў. Так склаўся лёс, што ўраджэнец Магілёўшчыны працяглы час жыве ў Маскве. Яго, несумненна, варта далучыць да імён тых знакамітых выхадцаў з зямлі беларускай, якія здабылі сабе славу ў іншых месцах, ніколі не забываючыся пра свае карані. Асоба творцы Івана Бурсава — гэта яшчэ адно пацвярджэнне высокага духоўнага патэнцыялу беларускай нацыі.

19 снежня — знакавая дата ў жыцці нашага суайчыньніка. Івану Бурсаву спаўняецца 90 гадоў.

...Чытаю пра рознакаляровых коцікаў, дзевяноста пяць вожыкаў, муху-модніцу і не ўтрымліваюся ад смеху, чытаю ўголас. Мая дзяўчынка-падлетак, занятая куды больш сур'ёзнай літаратурай, просіць: «Пачытай яшчэ!» Пытаецца: «Хто аўтар гэтых вясёлых гісторый?»

Кнігі Івана Бурсава адрасаваныя, як быццам, маленькаму чытачу. Аднак захапленне поўнымі забаў і добрага гумару вершаванымі радкамі выключна юнай аўдыторыяй вельмі ўмоўнае. За гэтым, відаць, і хаваецца адказ на рытарычнае пытанне: каго можна лічыць сапраўдным творцам? Таго, хто, як Іван Бурсаў, умее быць цікавым для ўсіх. Бацькі, як вядома, будуць чытаць дзецям тыя кніжкі, якія даспадобы самім.

Дарэчы, у творчай скарбонцы аўтара — больш за 70 зборнікаў вершаў. У былыя часы кнігі мудрага казачніка разляталіся па ўсёй савецкай краіне, цяпер яго імя больш вядома ў Расіі. А вось у саміх вершыках праблісквацюць залацінкі беларускага гумару, слоўцы беларускага фальклору, што надае асобным творам пэўны нацыянальны каларыт. Гэта тое крэўнае, што няўмольна звязвае вялікага майстра мастацкага слова са сваёй Радзімай.

Казачныя чытанкі для маленькіх — усяго толькі частка літаратурнай спадчыны нашага земляка. Паэт, перакладчык, даследчык літаратуры — у яго асобе спалучыўся рознабаковы талент. Менавіта дзякуючы Івану Бурсаву творы многіх беларускіх паэтаў загучалі на рускай мове. У 2011 годзе ён прадставіў зборнік «Шаги» — своеасаблівую анталогію беларускай паэзіі XVIII—XX стагоддзяў. Летам мінулага года адбылася прэзентацыя новага выдання — зборніка вершаў 94-х беларускіх паэтаў пад назвай «Дыхание времени».

Перакладчык засяродзіў увагу на найбольш знакамітых імёнах на беларускім паэтычным небасхіле, сярод якіх — Яўгенія Янішчыц, Генадзь Бураўкін, Данута Бічэль-Загнетава, Вера Вярба, Максім Танк. Але не абышоў увагай і малапрыкметных у літаратурным асяродку аўтараў.

Такім чынам, сваім маскоўскім бачаннем ён ахапіў Беларусь паэтычную амаль за ўсё XX стагоддзе. Зрабіў айчынную паэзію даступнай для рускага чытача за вялікі прамежак часу. І разам з тым даў магчымасць літаратузнаўцам весці дослед развіцця беларускага паэтычнага слова на фоне супярэчлівага мінулага стагоддзя.

Іван Бурсаў знаёмы з многімі беларускімі літаратарамі і вядомы як чалавек-легенда. Відавочна, што маштаб яго асобы патрабуе прызнання куды больш шырокімі коламі. Кажуць, Рыгор Барадулін замест звароту «Іван Цярэнцьевіч» выкарыстоўваў жартаўлівае «Іван Цярэшкавіч». Зразумела, маючы на ўвазе вобраз фальклорнага Цярэшкі з вясёлага беларускага абраду.

І сёння, у свае 90, нават знешнім выглядам Іван Цярэнцьевіч нагадвае жаданага ў кожным доме добрага казачніка — шчырага суразмоўцу і душэўнага апавядальніка.

Алена СТЭЛЬМАХ

ІМЕНЫ ДАРАГІЯ

Забываем Васіля Макарэвіча?

Рэдка які нумар часопісаў «Полымя», «Нёман» або «Маладосць», ды і штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» выходзіў да нядаўняга часу без той ці іншай публікацыі Васіля Макарэвіча. Бясспрэчны талент гэтага нястомнага творцы праяўляўся ва ўсіх жанрах паэзіі, прозы, літаратуразнаўства і нават сатыры. Аднак перш за ўсё ён быў цудоўным самабытным паэтам. Пра гэта сведчаць зборнікі паэзіі: «Вогненная камета», «Мерыдыяны і паралелі», «Ліставей», «Вечнае дрэва», «Радоўка», «Праталіна», «Відушчы посах», «Сумежжа», «Квадратура круга» і іншыя. Лаўрэат прэміі імя Аркадзя Куляшова і «Залаты Купідон»...

У сваёй лімаўскай рэцэнзіі на кнігу «Неба ў руках» я некалі зазначыў, што Васіль Макарэвіч — паэт прасторавага светаадчування, што многія яго вершы паэмнага характару, і не столькі памерамі, колькі паводле сюжэтнай і паэтычнай змястоўнасці. Паэтычны жэст яго заўжды маштабны і пры ўсёй неверагоднасці пераканаўчы. Ён шкадуе, што «плячом адвесці небасхіл не змог», «не пагасіў і кратэра кадзіла». Паэзію знаходзіць у незвычайным спалучэнні звычайных слоў. Верш, разгорнуты ў адзіную метафару, — таксама яго паэтычная адметнасць. Варта перачытаць адзін з іх — «Літасці не выпрасіць у лёсу», каб пераканацца ў гэтым.

Зноў чмялі басяць, як і басілі,
Вербы цэдзяць цені на ваду…
Выйшаў я да іх з-за небасхілу
І за небасхіл адсюль пайду…

Цытую адно, а ў думках паўтараю папярэднія афарыстычныя радкі з гэтага ж верша: «Стома ўсяго не забірала, дол ці забярэ мяне ўсяго». У пранікнёных словах — і прадчуванне, і надзея. Так, паэт, які толькі ў гэтай прыгаданай кнізе «Неба ў руках» (цудоўная метафара!) змясціў паэмы-прысвячэнні Максіму Танку («Кругі»), Пімену Панчанку («Лісты з Юрмалы»), Еўдакіі Лось («Паэма памяці»), Дастаеўскаму («Дастаеўскі»), меў усе падставы спадзявацца, што «дол не забярэ яго ўсяго». Ды і ці толькі таму! Гартаю падпісаную нам з Соф'яй Шах яго кнігу «Святло імёнаў дарагіх», у якой творчыя партрэты Анатоля Вялюгіна, Аркадзя Куляшова, Адама Русака, Сяргея Грахоўскага, Сцяпана Гаўрусёва, Уладзіміра Федасеенкі, Уладзіміра Карызны, Алеся Наўроцкага, Браніслава Спрынчана, Анатоля Сербантовіча, Хведара Чэрні, Уладзіслава Нядзведскага, Генадзя Пашкова, Міколы Мятліцкага, Казіміра Камейшы, Міколы Маляўкі, Алега Салтука, Алеся Дзятлава, Васіля Гадулькі, і думаю, што за межамі яе засталіся шматлікія публікацыі ў часопісах і газетах. У прадмове Мікалай Чаргінец слушна заўважыў: «Аўтар кнігі "Святло імёнаў дарагіх" аналізуе і разглядае вершы паэтаў з розных бакоў, заглыбляецца ў сутнасць паэтычнага майстэрства і магію мастацкага слова, выяўляючы трывалую повязь і знітаванасць з жыццёвымі з'явамі і падзеямі, праўдзівасць і амаль дакументальную даставернасць».

Дык ці можа літаратар такога таленту «пайсці ў дол», не разлічваючы на нашу ўдзячную памяць яму ў адказ? Але як пастаяны падпісчык «Полымя», «Нёмана» і «ЛіМа» не бачу ніводнага прыгадвання Васіля Макарэвіча пасля яго адыходу ў іншы свет. Не ведаю, можа, і была створана камісія па творчай спадчыне, але пакуль яна публічна сябе нічым не праявіла. А спадчына, без сумневу, павінна быць значнай. У тэлефонных размовах са мной ён прыгадваў, што падрыхтаваў сваю першую празаічную кнігу. Збіраўся шукаць грошы для яе выдання, магчыма, у «Кнігазборы». Гаварыў пра шматлікія вершы і паэмы. Дзе яно? Сын Васіля Сцяпанавіча, не пазбаўлены паэтычнага густу, разумее значнасць літаратурнай спадчыны бацькі. Але што ён можа зрабіць?

І наогул, ці ёсць каму мэтанакіравана клапаціцца пра рукапісы, якія застаюцца беспрытульнымі пасля смерці іх аўтараў? Магу дадаць яшчэ шмат прозвішчаў паэтаў і празаікаў, якіх дружна забываем. Ды і кожны, хто, магчыма, прачытае гэтыя сумныя радкі, здольны прадоўжыць пералік. Мабыць, далёка не ўсе пісьменнікі маюць права разлічваць на тое, што іх рукапісы трапяць у Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Праўда, цяпер, калі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь узначаліў сапраўдны руплівец збірання нашага агульнага літаратурнага і краязнаўчага багацця Аляксандр Карлюкевіч, можна спадзявацца, што на выданне творчай спадчыны будуць асобна прадугледжаны і пэўныя сродкі, і выдавецкія пазіцыі. Ды і Саюз пісьменнікаў мог бы рабіць больш. Пачытайце штотыднёвыя запрашэнні абласных аддзяленняў СПБ у «ЛіМе». Ці шмат там запрашэнняў на вечарыны, прысвечаныя памяці таго ці іншага пісьменніка? Па ўсёй верагоднасці, задаю нетактоўнае пытанне. Але ж тут, у «ЛіМе», побач з гэтымі запрашэннямі друкуецца каляндар нагаданых юбілейных дат. Чаму б не скарыстацца гэтай інфармацыяй? Было б толькі жаданне арыентавацца на сапраўдныя, а не ўяўныя літаратурныя каштоўнасці. А хіба філалагічныя факультэты нашых універсітэтаў і інстытутаў як мае быць далучыліся да асэнсавання літаратурнай спадчыны хаця б сваіх землякоў? Ды і бібліятэкі робяць не ўсё належнае.

Каб не заканчваць артыкул на такой сумнай ноце, зноў вяртаюся да светлай памяці Васіля Макарэвіча, які быў і застаецца сапраўдным майстрам паэтычнага слова. Гукапіс яго вершаў заўсёды адпавядае іх сэнсу. Што ж датычыць рыфмаў, то можна толькі дзівіцца вынаходлівасці паэта, якая пераканаўча сцвярджае патаемныя магчымасці мовы. Калісьці жартам, а потым усё больш усур'ёз у час тэлефоных размоў пытаўся, калі ён урэшце зоймецца складаннем слоўніка ўласных рыфмаў. Перакананы, што гэта быў бы ўнікальны дапаможнік. Іншая справа, што сэнсавая насычанасць яго рыфмаў індывідуальная і для выкарыстання кімсьці, мабыць, была б не надта прыдатная. Сам Васіль Сцяпанавіч быццам бы не адмаўляўся ад прапановы. Зараз не ведаю, ці знойдзецца літаратуразнаўца, каб ажыццявіць гэтую прапанову. Можа, і знойдзецца. Ды справа зусім не ў гэтым слоўніку, а ва ўсёй творчай спадчыне паэта. І не толькі — яго.

Калісьці я сказаў у адным са сваіх вершаў: «Даны чтоб напечатать — вечность и только жизнь — чтоб написать…». Цяпер разумею, што сказаў занадта аптымістычна. Усё залежыць ад таго, хто жыве і будзе жыць у гэтай зямной вечнасці.

Ізяслаў КАТЛЯРОЎ

Дарэчы

Рэдакцыя «ЛіМа» звярнулася па ўдакладненне ў Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва: архіў Васіля Макарэвіча нядаўна паступіў у БДАМЛМ, і сёння ўжо распачата праца па яго ўпарадкаванні.

Генрых ТАРАСЕВІЧ

***

Даўно вядома, што сентыментальнасць
Найбольш даймае вопытных людзей.
Мінулых год душэўная ўспрымальнасць
Падчас змяняе сэнс былых падзей.

Што ўчора падавалася няшчасцем —
Сягоння выклікае толькі смех,
Сардэчныя юнацкія напасці
Цяпер здаюцца чарадой уцех.

Даўнейшых дзён яскравыя ўспаміны,
Занатаваўшы шчасныя хвіліны,
У нетрах нашай памяці жывуць.

У атачэнні зманлівых ілюзій,
Фальшывых спрэчак і пустых дыскусій
Яны душу ад бруду берагуць.

***

Пануе ўвосень сумная прырода
Пасля спякотнай сонечнай пары.
Заўжды цяплу на змену год ад году
Нясуць імжыстасць з поўначы вятры.

Ды ўсё ж штогод такая рэчаіснасць
Не надта засмучае жыхароў,
А восені адметная квяцістасць
Натхняе ўсіх паэтаў зноў і зноў.

Затым усё як быццам замірае,
Вясной ізноў прырода ажывае,
Каб аднавіць свой вечны карагод.

...Злятае з дрэў увосень пазалота.
Вось так бы і душэўная згрызота
Спадала прэч, як пераспелы плод.

***

У чыстым полі белая бяроза
Сярод травы пажоўклае стаіць.
У прадчуванні першага марозу
Лісцём змарнелым ціха шапаціць.

Яшчэ нядаўна ўсё было іначай —
Дарыла дрэва ўвесну людзям сок,
А ў час жніва — пары ва ўсім гарачай —
Для адпачынку збаўчы халадок.

Маёй Радзімы лёс наўздзіў падобны,
Ён быў шчаслівым і да слёз гаротным —
Засведчыць процьма твораў і легенд.

Гасподзь нам даў ізноў сваю краіну,
Цяпер мы ўсе ў адказе за Айчыну:
Студэнт, рабочы, фермер, прэзідэнт...

***

Карысна адвячоркам ля каміна
Са шклянкай моцнай кавы пасядзець,
Каб спраў штодзённых звыклую карціну
Было зручней у думках праглядзець.

Не трэба ганарыцца тым, што здолеў,
І гараваць аб тым, чаго не змог.
Таму і ўдачу не чакай ніколі,
Калі ёй трохі сам не дапамог.

Ды ў пошуках празмерных дабрабыту
Марнеюць людзі, у якіх нібыта
Бракуе ежы і нястача піць.

Ад сквапнасці ўсё ліха на планеце,
Больш сціпла трэба жыць
на белым свеце,
Каб Госпада дарэмна не гнявіць.

Носьбіт

Я пільны носьбіт памяці народа,
Ягоны дух у еднасці са мной.
Людзей імкненне да глытка свабоды
Заўжды ўспрымаю палка ўсёй душой.

Мяне сілкуе вопыт пакаленняў
Ад даўніх да цяперашніх вякоў,
Дае натхненне мне Купалы геній
Для шчырых, верай спраўджаных радкоў.

Хапіла, зрэшты, і ліхіх чужынцаў,
За родны край усіх масцей «рупліўцаў» —
Імя ім, праўду кажуць, легіён.

О, Беларусь! Наследная Радзіма,
Ты для мяне апора за плячыма,
Надзей паэта моцны бастыён.

Паказчыкі

Паказчыкі плануюцца ў краіне
Па розных накірунках развіцця.
Заўжды дзяржаўнай планавай машыне
Патрэбна ў лічбах ведаць пульс жыцця.

Дакладна прагназуюцца (да сотых)
На кожны ўкладзены працэнтны пункт
Прыбытак, сабекошт, маржа, даходы
І валавы унутраны прадукт…

Каб выканаць пазначаныя планы,
Працаўнікі ўвіхаюцца старанна,
Як кажуць, слава знойдзе іх пазней.

Вось так бы хоць на некалькі адсоткаў
Зламыснікам за кошт душэўных сродкаў
Адносіны палепшыць да людзей.

Раство Хрыстова

Сонцаварот зімовы на Каляды —
Яскравы прыклад зменнасці быцця.
А тое, што ўсе людзі Сонцу рады,
Здаецца аксіёмаю жыцця.

У гэты дзень пад Віфлеемскай зоркай
Радзіўся Збаўца Свету — Божы Сын.
Праз шмат гадоў прыняў Ён
вырак горкі —
За ўсіх грахі пайшоў на смерць адзін.

Фота Таццяны Блахіной.

Ад тых часоў вады ўцякло нямала,
На чалавецтва многа перапала,
Ды ўсё ж не стаў дабрэйшым чалавек.

Дае надзею нам Раство Хрыстова
Адужаць зло, пачаць жыццё нанова,
Каб потым з чыстым сэрцам жыць
свой век.

***

Апошнім часам мала крэатыву
Ва ўсіх праявах звыклага жыцця.
Бракуе штосьці творчага парыву
Адносна спраў людскога развіцця.

Жывём мы па тыповым распарадку
Ў шпакоўнях аднастайных гарадскіх.
На пасяджэннях пляскаем у ладкі,
Паслухаўшы прамоўцаў гаваркіх.

Пустыя словы лжывых папулістаў
Не выклікаюць шквалу аптымізму,
Што хутка будзе ўсё у нас як след.

Даюць надзею творчыя натуры,
Яны, як кажуць, вылезуць са скуры,
Каб стаў прывабным навакольны свет.

***

Не трэба вінаваціць прэзідэнта
За тое, што зрабіць павінен сам.
Для пільных спраў уласнага сегмента
Расходаваць патрэбна свой бальзам.

Навошта спадзявацца на краіну,
Што за цябе ўсё вырашыць яна.
Каб улюбіць жаданую жанчыну —
Сябе належыць паказаць спаўна.

Мы творцы ўсе свайго зямнога шчасця,
Таму павінен розныя напасці
Пераадольваць кожны чалавек.

І ўсё ж без ценю ўсякага сумнення
Малю, каб болей радасных імгненняў
Прынёс народу дваццаць першы век.

***

Люблю з юнацтва блізкіх юбілеі
Ў кампаніі душэўнай святкаваць
І выкарыстаць госця прывілею —
Стагоддзя юбіляру пажадаць.

Замацаваць свой тост патрэбна
чаркай,
Каб здзейснілася ўсё, што наказаў.
Мне гэты ход падзей вядомы змалку —
Нязменны атрыбут застольных спраў.

Так ёсць, было і, пэўна, гэтак будзе,
Жадаць дабра заўсёды будуць людзі
Адно другому праз усе вякі.

Але найбольш узрушаныя словы
Гучаць у шчырых за сталом размовах,
Калі гуляюць разам сваякі.

Павел АСТРАВУХ

***

Хіба што няма аніякіх словаў,
Якія не можна было б аспрэчыць.
Калі і хто твой Горад засноўваў?
І якія крыніцы аб гэтым сведчаць?

Сваю ты ісціну кажаш мне,
Сумнеўную, правільную, любую, —
Ці не лепей адшукваць яе ў віне?
Пераконваць навошта цябе спрабую?

І бяззбройны спрачацца на гэты конт,
Камечу каментары ў адчаі.
Я пішу, губляючы лексікон,
Паступова сыходзячы ў маўчанне.

Бо Лі

Нехта на Захадзе скажа: «Mi boli»,
З Усходу ў адказ данясецца: «Болит».
Ў кантэксце ўзнікае
(Ніяк не знікае)
Сучасны, няшчасны, прыўкрасны
больліт.

Праз Копішча

Ціха глядзяць на мяне
Белыя вочы лесу.
Праз гэтых суквецяў снег
Я без дарогі лезу.
Цяпло пералесак кране —
Горада агароджу,
І раптам падасца мне:
Я з гэтага месца паходжу.
Сасна да яліны льне,
Дуб, што стаіць побач,
Цікаўна глядзіць на мяне
Лесу зялёны пробашч.
Адкінь недарэчны сумнеў,
Проста праходзячы міма,
Трэба, каб ты разумеў:
Гэта і ёсць радзіма.
Дыхаць так лёгка мне!
І, ідучы па краі,
Пяшчотна, як першы снег,
Белыя кветкі кранаю.

Выспаспеў (feat. H.S.)

Не выспа ветру — я кажу табе:
Карункі хваляў мусяць паўтарыцца.
Ніяк не стомяцца,
нібыта пры сяўбе,
Галіны дрэў губляць ігліцу.

Не высь палае — то за краем край
Ў далёкі акіян спаўзае сонца.
Не выкіпай, прашу, і не згасай,
Свяці мне па магчымасці бясконца.

Не высь, паверхня тут трымае нас
Вышэй сябе, за карані ўсё роўна,
Але прыспее непрыкметна час,
Як спусцімся ніжэй яе узроўню.

Не вы спалохаецеся агню
У краі, дзе вада непераможна
Сабою напаўняе цішыню,
Дзе шаты дрэваў лашчаць вышыню,
Дзе выспа высіцца з вады абложна.

На Дзяды

Старыя дрэвы
Павыразалі,
Старыя людзі
Паўміралі.
І засталося — крыжы ды камні,
Крыжы ды промні
Божае ласкі:
Божая маці
У кожнай хаце.

***

Вада падмыла бераг Нёмна,
Дзе рыба плавае па дну.
Я плаваць так не навучыўся —
Тану.

Шляхетны сон

Мне снілася, што час спыніў хаду,
І ў Дроздаве, за Ельняю старою
Сядзяць ўдваіх, схіліўшысь над сталом,
Пацына Ян з усмешачкай сваёю
І бацька мой, стары паважны шляхціц.

Мікола БУСЬКО

ПУШЧАНСКІ ГЛАДЫЯТАР

(урывак з апавядання)

...На ўзгорку высіцца гаманкі лес, у ім бачылася змрочная паваротка, заціснутая з усіх бакоў надузнятымі вяршынямі, а за ёй высіўся змайстраваны з кругляка паклонны крыж. «На ўдачу крыж» — сведчыў надпіс. Алеся зацікавіла гэта, і ён прыпыніўся. Адбіў паклон чалавек.

Паляўнічы адчуў бадзёрасць, яму рупіла хутчэй ехаць, але з кожным разам прабірацца было цяжэй: лыжы правальваліся ў снег, ён часцяком прыпыняўся, неаслабна ўглядаўся па баках, паварочваўся, разглядаючы пройдзены шлях, стараўся хутчэй наткнуцца на сляды звяроў. Пасля некалькіх гадзін блуканняў ён адчуў нейкую зморанасць — несумненна існавала патрэба ў адпачынку.

— А вось і пянёк якраз, — прысеў, падклаўшы заплечнік.

Сядзець было няспрытна, раптоўна пацягнула халадэчай, пасыпаўся снег з абвіслага галля. Нечакана з сіняй далечы даляцела ашалелае выццё «А-у-у!..» Жахлівая звярыная злосць ледзяніла душу сваім дрыжачым басам. Непаводдаль стройная асінка ліхаманкава затрэслася ад пачутага страхоцця.

— Лес наш і ўсё тут наша! — пачуўся строгі голас звяр'я.

— Ты, звяруга, не застрашыш мяне, не ўдасца гэта!..

Ізноў прагучалі дзве настойлівыя серыі выцця, яны паступова аддаляліся і паміралі ў лясным гушчары, але праз некалькі хвілін паўтараліся.

— А гэта самец цягне, — распазнаў Алесь. — Так, так. Яго баявая сяброўка дапамагае, вышэй бярэ, — раскусіў праўду і дастаў вабік.

— А-у-у! — раз-пораз разнеслася ў прасторы, падзываючы ваўкоў.

Алесь магутны, сажнёвага росту мужык (шмат увагі ўдзяляў свайму фізічнаму развіццю — шырокія плечы яго выказвалі сілу), не злякаўся лясных драпежнікаў, але, тым не менш, яму сталася крыху ніякавата, ухапіўся за стрэльбу.

З далечы данеслася некалькі стрэлаў. Сяды-тады яны паўтараліся. Значыць, тут не адзін я, яшчэ нехта бахкае. Відаць, не на ваўкоў палюе, а каб заваліць дзіка ці лася, без ліку і сэнсу знішчае звяр'ё і птушак... І такія ёсць...

Нядаўні стрэл грымнуў бліжэй — дадаў нервознасці паляўнічаму.

— Хто ж там бахкае?

Над галавой сарока сарваляся з вершаліны дрэва і лёцьма зайшлася крыкам, апавясціўшы лясных істот. Задзірлівае стракатанне птушкі не раздражняла чалавека, ён, аналізуючы жыццё насельнікаў пушчы, засяродзіўся на пытанні: прырода вечна нешта стварае і спрадвечна разбурае. Здаецца, гэты кругаварот не мае ні пачатку, ні канца. Вочы яго ўпіваюцца ў незвычайную мяккасць адценняў, разбягаюцца позіркі ад дзівоснай зімовай красы, унікальных тварэнняў прыроды. Мову прыроды зразумець стараўся, спасцігаў яе таямніцы, вучыўся ў прыроды ўвесь час — іншых настаўнікаў у яго не было. Прырода — хараство і мудрасць!

Зімні бог — мароз — неадрыўна сачыў за чалавекам, слухаў яго разважанні і прыйшоў да высновы: паляўнічы і пушча — жывая сувязь чалавека і прыроды.

Доўга сядзець было няўсцерп, даймаў холад, абутак падубеў, егер мусіў ісці далей, і адтуль, з лясного ўзвышка, даляцела звыклае выццё — яно то ўзмацнялася, то меншала.

— Ах, выказваюць сваю нястрыманасць, перагукаюцца, абменьваюцца інфармацыяй, хай сабе... — адчуў засмучэнне паляніўчы.

Хутчэй за ўсё звер вартаваў паляўнічага, заглыбіўся ў ельнік, там недзе затаіўся і зноўку завыў. У яго гуках было нешта загадкавае: што і пра што звяры дамаўляюцца?

Каб паляванне было паспяховым, паміж ваўкамі існуе ўстойлівая сістэмная сувязь — каналы абмену інфармацыяй. Загадкавыя пушчанскія абшары хаваюць даволі каштоўныя звесткі пра наваколь-нае жыццё пушчы, каб хутчэй паведаміць нешта досыць важнае сваім родным. Дзеля гэтага звяры выкарыстоўваюць на ўсю моц свае галасавыя звязкі, як усведамленне важнасці прынятага сігналу.

Прайшло з паўгадзіны, і жаданне крочыць уперад не пакідала Алеся, тым больш гэтаму спрыяла надвор'е: сонца і сняжок спяшаліся радаваць яго. Якое лагоднае сонейка! Густое праменне працінала вершаліны дрэў, якія няспешна скідалі серабрыстыя сняжынкі, што безупынна мітусіліся ў паветры, як дрыгва.

Высакарослы дуб, што раскінуўся на паляне, гучна варушыў цёмна-чырвонымі губамі і са здзіўленнем аглядаў табун дзікоў, снег рыпеў пад імі, і чулася паспешлівае — жалудамі — хрусь-хрусь! Дзікі старанна разрывалі снег, даставалі аж да каранёў, і лясны волат ад пачуцця болю нейкі час уздрыгваў сваім магутным целам, аж голле на ім хадзіла сюды-туды, як бы нашэптваючы людское: дзе дуб — там і дзікі!

— Хай ласуюцца на здароўе!

Дзікі не бачылі злачынцу ў асобе паляўнічага, не спалохаліся чалавечага позірку, бо ведалі, што ён не адважыцца пульнуць, а толькі будзе пазіраць, уражвацца. Гэтае відовішча ўзрушыла яго душу, моцна паўплывала, заняло прыдатнае месца ў яго галаве, але, відаць, не доўга — яго трывожылі іншыя турботы, ад якіх яму рабілася нудна.

Ходзячы па лесе, паляўнічы-егер стараўся дабыць звесткі пра паводзіны звяроў, тым больш падставы іх пазнаць у яго былі. Як ні разважай, а ўсё роўна прыйдзецца прыняць на веру прыроду такую, якая яна ёсць і што ў ей ёсць, таму быццам да магніта прыцягваліся яго выгадныя мроі: выхаваць ваўка як заступніка і сябра ў старасці, што прынясе яму яўную карысць, хай сабе і ўразрэз з розумам. Усё можна чакаць ад чалавека, надзеленага дзіўнымі якасцямі, ён прыдумае сабе розныя пакуты, каб толькі дасягнуць свайго.

У маркотнай разважнасці прабеглі яшчэ некалькі хвілін, і Алесю падалося, што нібыта і не было ніякага крадзяжу ваўчаняці ў той незабыўны пачатак вясны. Чалавек углядаўся ў лес, і перад ім досыць ярка ўсплывалі ўспаміны тых мясцін, дзе лясны бадзяга-егер, седзячы на беразе ўзгорыстага яру, прыкмеціў некалькі ваўчанят, якія імгненна шмыганулі ў гушчар. Загарэўшыся ідэяй злавіць дзіця лесу, жыць з ім і пазнаваць усе яго невядомасці, таямніцы, ён успыхнуў яркім полымем жадання і з надзвычайнай цікавасцю разглядаў звяркоў. Яму страшэнна хацелася займець шчанят, і гэтая акалічнасць пазбавіла асцярожнасці і штурхнула на рызыкоўны ўчынак.

Чалавек сапраўды пачынае цаніць жыццё тады, калі пагібель стаіць над яго галавой. Неабходна цаніць жыццё ў кожным імгненні, у кожнай травінцы, у кожнай казюрцы.

— А раптам ваўчыца? — трымаючы драбавік, ён пільна ўгледзеўся ў імжыстую каламуць глыбокай упадзіны.

Сустрэцца сам-насам са зверам — форс-мажор!

Духмяны пах жывіцы на соснах, блакітна-фіялетавае неба над імі, першая зеляніна на ўзгорках, свежыя жоўцікі падбелу на схілах ставілі жаданую мэту пад сумненне, ператвараючы яе ў нікчэмную і ў нічога не вартую капеечку.

І усё-ткі Алесь вырашыў, перахрысцыўся, выказаў нешта магічнае, што прасіла душа, і адважыўся апусціцца ўніз. Ён намеціўся злавіць ваўчаня, яго вочы забегалі ва ўсе бакі, ад нецярплівасці рукі замітусіліся, абмацвалі кусцікі, звяркі хаваліся, сыкалі, шчанячыя гукі мацнелі ад інстынктыўнага адчування небяспекі, але гэта зусім не аслабіла яго намеру займець дзіцятка прыроды. Нарэшце ў гэтай вар'яцкай сумятні намаганняў удалося ваўчанятка ўхапіць. Жывы мяккі камячок ён закінуў пад кашулю і з надзвычайнай паспешлівасцю кінуўся наверх. Здарылася тое, пра што марыў столькі год.

— Ой, балазе, паспеў!

***

Згадваючы той, двухгадовай даўнасці, час, Алесь адчуў гаркаваты прысмак: «Мусібыць, раскрыецца калісьці мой учынак, адчуюць нядобразычліўцы злосную радасць, можа, і насядуць на мяне, але ўсё мінецца ў часе, забудзецца, пройдзе». Мінуючы свядомасць, ён грэбаваў правіламі лесу, а болей кіраваўся сваёй самаўпэўненасцю апраўдаць злачынства, звесці свой грэх да звычайнай правіны ваўкоў.

Перасіліўшы ўспаміны, ён нявесела ўсміхнуўся, паправіў стрэльбу і пакрочыў хутчэй паміж сумётамі ды ельнікамі. Нечакана да яго даляцеў прыглушаны пошум кустоў, шолах пакрысе набліжаўся, узмацняўся, і перад ім раптам вырасла задыханая істота.

— А-а-а, — здзіўленым позіркам углядаўся паляўнічы... — Дык гэта ж ты, мой Мудры!

Пазіраючы на сабаку, ён згубіўся ў здагадках:

— Як жа ты вылез? А як знайшоў мяне?..

Сабака палашчыўся, вінавата згарбаціўся і, пакруціўшы хвастом, лізнуў гаспадара. Той некалькі хвілін стаяў, раздзіраемы процілегласцямі: ісці дамоў ці не?

Дзень стаяў без ветру, кожная галінка, роўна ўпрыгожаная снегам, ганарылася чысцінёй убранства — мноствам іскрыстых сняжынак. Надвор'е — цуд! Марнаваць час не выпадае, пойдзем разам, будзе весялей. Ісці было нялёгка: ногі правальваліся ў снег, толькі Мудры, апераджаючы гаспадара, бег уперадзе, затым спыніўся. Снег быў прашыты глыбокімі слядамі. Нечакана пачуўся голасны брэх сабакі. Ён рвануўся наперад, спусціўся па касагоры і натрапіў на доўгую баразну на снезе, узараную да зямлі. След заглыбіўся ў лес, там-сям валяліся белыя пасмы беляка. Крыху далей Мудры старанна разгроб снег, дастаў косці, частка якіх захавала відавочныя сляды гвалтоўнай смерці казулі. Адсюль след вывеў сабаку на крывавую пляму, што выступала выразна скрозь галіны.

— Там нешта ёсць...

Умяціны рознай даўнасці ад прахадных звяроў заўважыць было лёгка.

Гэта гаворыць аб іх прыналежнасці вепру.

Паляўнічы пачаў часцей карыстацца біноклем, углядаўся па баках, прыслухоўваўся да строкату сарок, якія беспамылкова могуць падказаць прысутнасць звера, калі той не паспеў яшчэ адысці далёка. Чым бліжэй Алесь падкрадаўся да гушчарніку, тым неспакойней паводзілі сябе сарокі. Паступова, крок за крокам, наставіўшы стрэльбу, ён пасунуўся ўперад. Птушкі перамахнулі з дрэва на дрэва і ўсчалі вэрхал. Дзік цяжкімі і працяглымі высілкамі дапоўз у гушчыню кустоўя і злёг, сілы пакрысе згасалі — жыццё пайшло на спад. Відаць, сляды на снезе знікаюць пад сумётам з навіслага вецця і не выходзяць з процілеглага боку. Мудры, нарабіўшы брэху, прыціснуўся да ног гаспадара. Ён, здзіўлены ўвагай сабакі, наблізіўся на адлегласць выстралу і прыкмеціў апруцянелага звера. За некалькі крокаў праз галлё на чалавека ўтаропіліся вузенькія вочы. У гэты ж момант паляўнічы прыкмеціў пакрытую сняжком галаву дзіка. Яна была нерухомая. Скон... Нейкую хвіліну паляўнічы стаяў у маўклівым засмучэнні. Узважыўшы злачынства зграі, гатовы быў выказаць спачуванне загінуламу вепру. Гэтая адметная прыгода ўспрымалася як турботы за насельнікаў пушчы.

Уважлівы і цікаўны да ўсяго, Алесь угледзеўся ў вынослівага звера, у дужую ахвярную дзічыну. Страшыла яго аскаленая зяпа. Па краях вострых, як шыла, зубоў тырчэлі два дзябёлыя клыкі. Шчацінне надта густое, пругкае, амаль увесь жывот выгрызены, зыркія кроплі свяціліся на снезе, левае падрабрынне было разарванае, з яго струменілася кроў колеру спелых журавін, выносячы рэшткі жыцця з дужага цела. Засталася некранутай спіна. Гразюка на ёй, змяшаная са смалою, калі звер чухаецца аб сасну, ператвараецца ў бронекамізэльку, непрабіваемую нават для кулі.

Жахлівы выгляд звера ўзрушыў паляўнічага, уяўлялася параўнальна нядаўняя барацьба дзіка з ваўкамі. Ён нешта прашаптаў, цяжка ўздыхнуў, ткнуў стрэльбай — пераканаўся: аджыў...

Алесю падалося, нібыта ён чуе стогны дзіка, яго жахлівы адчай у безвыходнасці.

— Ён ажывае?!.. — ад нечакаясці запытаў сам сябе.

Бясспрэчна было відаць, што дзік мёртвы, Алесь мацней абхапіў зброю і адскочыў назад.

У гэты час аднекуль данеслася працяглае «А-у-у!» Воўк пагрозліва заявіў аб сабе на поўныя грудзі, разлічваючы на сапраўднае водгулле роднай крыві, прыязнай, даверлівай. Але почуту ад важака зграі не было нейкі час.

— Гэта яна цягне, — завыўка звера прымусіла паляўнічага занепакоіцца.

Тым часам ваўчыца хавалася ў засені дрэў. Адчуўшы заспакаенне, прыўстала, выцягнулася, выпрастаўшы маладое цела, зайшлася выццём, раскрыла зяпу, дэманструючы магутныя клыкі, адпрэчыла пачуццё самоты, адчула прыліў сілы, адвагі, энергіі і галоўнае — жыццядайнай патрэбы ў прадаўжэнні роду. Яна качалася па снезе, церлася аб дрэвы, рабіла высокія падскокі, каб прывесці сябе ў баявую форму, старалася ведаць усё, што робіцца ў лесе, што надавала ёй рашучасці і бясстрашнасці.

Мудры, што сядзеў на хвасце, варухнуў вушамі, пранюхаў паветра, павёў вачыма, прыпадняўся і няспешна патупаў у напрамку стагоў.

— Мудры, назад! Назад! — твар у Алеся зрабіўся бурачковы.

Сабака на покліч не адгукнуўся.

Нудная вусцішнасць накрыла паляўнічага, ён узіраўся здзіўлена, неадрыўна глядзеў сабаку ўслед збянтэжана і трывожна. Мудры ў нястрымным парыванні кінуўся шпарчэй, памчаўся дзівоснымі скачкамі, ратуючыся ад чалавечай залежнасці, час ад часу азіраўся, як бы кідаючы развітальныя позіркі, даючы зразумець гаспадару, што вяровачка іх адносін разрываецца назаўсёды.

Душа паляўнічага гарэла трывожным агнём, і гэта вывела яго з раўнавагі. Усвядоміўшы, што сабака ўцякае ад яго, Алесь кінуўся бегчы без лыжаў. Адчуванне ростані раздзірала яго, ён пакрочыў па слядах, але ўцяміў марнасць свайго намеру, застыў, неадводна аглядаючы далячынь.

Стоячы на прыгорку, яго ўвага пераключалася то на адзін, то на іншы стог. Тут позірк трапіў на невысокі раскіданы стог саломы.

— Аво! — у чорнае вока бінокля трапілі дзве жывыя постаці. Яны нерухома застылі насупраць адзін аднаго. Ваўчыца ўздыбіла загрывак, зморчыла нос, ашчэрыла зубы, загыркала некалькі разоў запар, выклікаючы на зацяты бой. Але тут яна прыкмеціла, што сабака махнуў хвастом, і досыць асцярожна пачалося знаёмства, затым дазволіла незнаёмцу лізнуць яе ў шыю, паказваючы пачуццё прыязнасці і спакою...

НАЙПЕРШ ПРАКТЫКА

Як стаць асяродкамі культуры: ад тэорый да ідэй і праектаў

Фота Яўгена Пясецкага.

Тамара Данілюк, дырэктар Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага:

— У Брэсцкай вобласці працуе 486 публічных бібліятэк. На працягу года ішла аптымізацыя сеткі, што актывізавала і работу перасоўных бібліятэк. Сёння ў рэгіёне працуе 15 бібліёбусаў, што абслугоўваюць 520 населеных пунктаў, у якіх больш за 6 тыс. жыхароў маюць магчымасць чытаць кнігі і атрымліваць перыядычныя выданні.

Традыцыйна краязнаўства — візітоўка бібліятэк Брэстчыны. Так, Пінская раённая сістэма распрацавала мэтавую праграму «Зямля бацькоў — жыцця крыніца», ганцавіцкія бібліятэкары працуюць у рамках праекта «Вартыя памяці людской». Аграгарадок Дварэц Лунінецкага раёна на працягу пяці апошніх гадоў праводзіць свята «Лунінецкія клубніцы», адзін з арганізатараў якога — і мясцовая бібліятэка.

На працягу 2017 года прыхільнікі беларускай культуры вобласці наведвалі традыцыйныя і арыгінальныя бібліятэчныя мерапрыемствы. Так, брастчане і госці горада ўзялі ўдзел у гістарычным подыуме «Першая гістарычная кніга: погляд праз прызму часу» і гістарычных ракурсах «З гісторыі беларускага кнігадрукавання», «Пачатак выдавецкай дзейнасці», якія адбыліся ў Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А. С. Пушкіна. Сумесна з валанцёрамі праваслаўнага маладзёжнага брацтва ў гонар свяціцеля Мікалая пры Свята-Мікалаеўскім брацкім храме супрацоўнікі спецыялізаванай бібліятэкі-філіяла № 12 правялі ўрок духоўнасці «Кніга сусветнай славы» для чытачоў з абмежаванымі магчымасцямі зроку. Да 500-годдзя з пачатку выдавецкай дзейнасці Ф. Скарыны прайшоў шэраг мерапрыемстваў у бібліятэках вобласці: у Баранавічах, Бярозе і Белаазёрску, бібліятэках Ганцавіцкага раёна...

З анонсамі цікавых сустрэч можна пазнаёміцца на сайтах цэнтральных і абласной бібліятэк.

Дырэктар Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна Таццяна Адамян:

— Адыходзячы год адзначаны шматлікімі сацыякультурнымі акцыямі і праектамі. З партнёрамі з Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, пры актыўнай падтрымцы галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама рэалізаваны праект «Віцебск: гісторыя рэальная і папулярная». Цікавы і праект, у якім былі занятыя супрацоўнікі аддзела дзіцячай літаратуры, — «Гісторыя кнігі сваімі рукамі». А самы буйны, прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, — гэта міжнародная навукова-практычная краязнаўчая канферэнцыя, якая адбылася 23 лістапада.

Інавацыйнай і запатрабаванай формай работы з дзецьмі сталі бібліятэчныя літаратурныя ўрокі для школьнікаў, якія нашы спецыялісты праводзілі ў новым фармаце. Гэта літаратурна-музычныя кампазіцыі па творчасці асобных пісьменнікаў. У прыватнасці, адбыўся пробны ўрок па Льюісу Кэралу «Аліса ў Краіне цудаў» — з элементамі музыкі, тэатралізацыі, інтэрактыўнасці.

У самай буйной бібліятэцы вобласці ёсць магчымасць задаволіць усе чытацкія запыты і патрабаванні. У 2017-м у фонд бібліятэкі паступіла звыш 8000 экзэмпляраў дакументаў, з іх 4900 — перыядычныя выданні, набыта 102 аўдыякнігі.

Сёлета актыўна калектыў бібліятэкі супрацоўнічаў з замежнымі калегамі. З Пскоўскай абласной бібліятэкай праводзілі сумесныя віртуальныя праекты, конкурсы, удзельнічалі ў III Міжрэгіянальным літаратурным фестывалі «Пскоўская восень». У Смаленскай абласной бібліятэцы, з якой заключаны дагавор аб супрацоўніцтве, пабывалі дырэктары раённых бібліятэчных сістэм Віцебшчыны. Цікавай атрымалася сумесная выстаўка-інсталяцыя «Смаленск і Віцебск у час Вялікай Айчыннай вайны». З бібліятэкай Смаленскага дзяржуніверсітэта актыўна працавалі па напаўненні сумеснай базы дадзеных «Беларускія смаляне, смаленскія беларусы».

Новы год калектыў бібліятэкі сустракае з аптымізмам: па колькасці чытачоў, кнігавыдачы і наведваннях Віцебская абласная бібліятэка ў першай тройцы сярод аналагічных устаноў краіны. Абноўлены актавая зала, фае, лесвіца, у аддзелах стала прыгажэй, зручней, сучасней.

Дырэктар Гомельскай абласной бібліятэкі Марына Рафеева:

— Год навукі і год 500-годдзя беларускага кнігадрукавання — гэтыя тэмы сталі ключавымі ў праектах Гомельскай абласной бібліятэкі. Пачало працаваць «Проста навуковае кафэ» — дыскусійная пляцоўка, дзе абмяркоўваюцца навукова-папулярныя тэмы, ёсць магчымасць выказацца, задаць пытанне вядомым у горадзе навукоўцам і спецыялістам-практыкам.

Краязнаўцамі выдзелены экспазіцыйны шэраг навукоўцаў з сусветнымі імёнамі, ураджэнцаў Гомельшчыны, пра кожнага з іх падрыхтаваны відэаролік для размяшчэння на сайце бібліятэкі і *YouTube*. У бібліятэцы ладзіцца цыкл сустрэч з вядомымі людзьмі: культурна-інфармацыйны праект «Гомель у асобах» уключае творчы вечар са знакамітасцю і наступнае выданне біябібліяграфічнага зборніка. Новае развіццё атрымала і літаратурнае краязнаўства. Сёння мы можам казаць аб Літаратурным музеі пісьменнікаў Гомельшчыны, які змяшчае рукапісы і асабістыя рэчы народных пісьменнікаў Беларусі І. Навуменкі, І. Мележа, І. Шамякіна і А. Макаёнка. Актыўна выкарыстоўваецца аналаг стацыянарнага — банерны музей для мерапрыемстваў па-за сценамі бібліятэкі і электронны рэсурс — Літаратурная карта Гомельшчыны, прадстаўленая на сайце бібліятэкі, (з інфармацыяй пра больш за 200 персаналій).

Адкрыўся абноўлены дзіцячы аддзел, у якім створана заніраваная прастора па матывах казкі А. Талстога «Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна». Дзіцячы культурна-адукацыйны праект «Экслібрыс», які ладзіцца ў непасрэдным асяроддзі сапраўдных артэфактаў музея рэдкай кнігі, знаёміць з гісторыяй пісьменства і кнігі ў розных краінах.

Пад кіраўніцтвам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі вядзецца актыўная работа па стварэнні рэгіянальнага зводнага электроннага каталога, які забяспечыць свабодны доступ любому інтэрнэт-карыстальніку да інфармацыйных рэсурсаў Гомельшчыны. Для папулярызацыі работы бібліятэкі развіваем кам'юніці-менеджмент: нашы групы і старонкі ў сацыяльных сетках дазваляюць не толькі прыцягваць актыўную частку насельніцтва ў бібліятэку, але і атрымліваць зваротную сувязь.

Галіна Сцяпанава, загадчыца аддзела бібліятэказнаўства Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага:

— Гродзенскі раён сярод іншых вылучае актыўны ўдзел бібліятэк у маштабных мерапрыемствах, што ладзяцца на Аўгустоўскім канале. Цікава, што амаль у кожнай бібліятэцы раёна ёсць адмысловыя гульнявыя пакоі для маленькіх карыстальнікаў, дзе бацькі могуць смела пакінуць дзяцей на некаторы час. Мастоўская дзіцячая бібліятэка пайшла яшчэ далей: там прадастаўляюць дадатковыя паслугі, згодна з якімі ў бібліятэцы можна правесці дзень нараджэння. Забаўляльныя праграмы з літаратурнымі героямі разлічаны на дзяцей рознага ўзросту.

На базе Скідальскай гарадской бібліятэкі сямейнага чытання з мая працуе так званая велабібліятэка, якая развозіць кнігі пенсіянерам ды людзям з абмежаванымі магчымасцямі, актыўна бярэ ўдзел у масавых мерапрыемствах. Акрамя таго, па Гродзенскім раёне ходзяць так званыя бібліёбусы. У Іўе паспяхова працуе «Музей бібліятэчнай справы» — адзіная ўстанова ў Гродзенскай вобласці, дзе можна знайсці інфармацыю пра развіццё бібліятэчнай справы ў Іўеўскім раёне. У Свіслацкім раёне ўпершыню на абласным узроўні правялі фестываль «Кніга і час», дзе кожная бібліятэка-ўдзельніца прадставіла свае дасягненні на асобным бібліятэчным дворыку. Навагрудская бібліятэчная сістэма прэзентавала экспазіцыю міні-макетаў «Страчаная спадчына». Таксама там працуе інфармацыйна-краязнаўчы тур «Праз кнігу да дабра і святла», мерапрыемствы якога сёлета былі прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання.

Марыя Камарова, дырэктар Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы горада Гродна:

— На працягу года ў Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэме горада Гродна адбыліся тры асноўныя праекты. Па-першае, мы стварылі два біябібліяграфічныя даведнікі: «Ганаровыя грамадзяне горада Гродна» і «Кнігаславы горада Гродна». Кнігі (кожны даведнік выйшаў накладам 150 асобнікаў) былі ўрачыста прэзентаваныя і перададзеныя ў бібліятэкі горада. Па-другое, мы займаліся стварэннем тактыльных кніг для спецыяльнай бібліятэкі інвалідаў па зроку: фонд азначанай установы ўзбагаціўся на 22 тактыльныя кнігі. Па-трэцяе, неўзабаве скончыцца падрыхтаваны нашымі супрацоўнікамі праект па агучцы кніг гродзенскіх краязнаўцаў Віктара Саяпіна і Андрэя Вашкевіча, таксама скіраваны на дапамогу карыстальнікам са слабым зрокам.

Дырэктар Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна Ілона Сарокіна:

— Сёлета праект «Пазнай Беларусь» знаёміў з жыццём і дзейнасцю знакамітых беларусаў. Арганізавана сумесна з актывістамі БРСМ серыя турніраў інтэлектуальных гульняў «Што? Дзе? Калі?». Пазнавальнымі былі VII Пысінскія чытанні, дзе прадстаўнік Смаленскага дзяржаўнага ўніверсітэта Таццяна Ладожына распавяла пра літаратурныя сувязі смаленска-магілёўскага памежжа. Бібліятэку з гэтым універсітэтам звязвае работа над стварэннем базы дадзеных «Беларускія смаляне, смаленскія беларусы», першы том зборніка ўключае 400 імёнаў, якія звязалі Смаленшчыну і прыгранічныя вобласці Беларусі: Магілёўскую, Гомельскую і Віцебскую. Магілёўская абласная бібліятэка перадала для зборніка 12 звестак аб персаналіях, 9 з якіх — ураджэнцы Магілёўшчыны.

З нагоды 135-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа ў бібліятэцы прайшлі паэтычныя вечарыны, праведзена літаратурнае падарожжа «Сцежкамі песняроў зямлі беларускай». Па ініцыятыве Магілёўскай гарадской суполкі «Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны» адбылася сустрэча з унучкамі Якуба Коласа Марыяй Міхайлаўнай і Верай Данілаўнай Міцкевіч.

Да 105-годдзя з дня нараджэння самабытнага празаіка і паэта Барыса Мікуліча намаганнямі яго сваякоў і бабруйскіх бібліятэкараў выдадзены двухтомны зборнік выбраных твораў пісьменніка, які ўжо стаў бібліяграфічнай рэдкасцю. Выданне ажыццявілася дзякуючы перамозе ў рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры» і атрыманай грашовай прэміі. Пасля гэты зборнік выдала «Мастацкая літаратура».

Прыемна, што з 8 работ, дасланых установамі вобласці на рэспубліканскі конкурс «Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры», 7 прызнаныя пераможцамі. А па выніках III Рэспубліканскага конкурсу на лепшую работу сярод бібліятэк па духоўна-маральнай адукацыі і выхаванню першае месца ў намінацыі «Сям'я — спадчынніца маральных і духоўных каштоўнасцяў» атрымала Звянчацкая сельская бібліятэка Клімавіцкай бібліятэчнай сістэмы.

Аксана Кніжнікава, дырэктар Мінскай абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна:

— Сёлета ў нашай і публічных бібліятэках Мінскай вобласці адбылося шмат цікавых сустрэч з айчыннымі і замежнымі дзеячамі навукі, літаратуры, культуры і мастацтва.

У аддзеле замежнай літаратуры прайшоў шэраг лекцый, семінараў, вэбінараў і майстар-класаў. Аўстралійскі эколаг Дэвід Браўн, правазнаўца Алэн Боскель (Арлеанскі ўніверсітэт), палітолаг Жан П'ер Колін (Рэймскі ўніверсітэт) прадставілі вынікі сваёй навуковай працы, італьянскі рэжысёр П'ерпаола Бетоні зладзіў майстар-клас па стварэнні фільмаў на мабільных прыладах.

Напрыканцы вясны адбыўся Дзясяты абласны форум маладых паэтаў Міншчыны «Слова Купалы да творчасці кліча».

У маі ў Маладзечне прайшоў раённы злёт юных талентаў «Усё пачыналася з таблічкі, світка, бяросты», прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. Удзельнікі прадставілі малюнкі, празаічныя і вершаваныя творы. Штогадовыя навуковыя і культурныя мерапрыемствы прайшлі ў Дзяржынску, Слуцку, Нясвіжы, Барысаве.

Супрацоўнікі Мінскай абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна сумесна з сацыяльна-асветніцкай установай «Цэнтр падтрымкі анкапацыентаў "У імя жыцця"» рэалізуюць праект «У імя жыцця». Майстар-класы, размовы, кніжныя выстаўкі спрыяюць комплекснай рэабілітацыі анкапацыентаў і іх блізкіх, развіццю груп падтрымкі і ўзаемадапамогі.

Алена Кубышкіна, дырэктар сталічнай Цэнтральнай бібліятэкі імя Янкі Купалы:

У складзе Цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўных публічных бібліятэк Мінска — 25 кніжных, у тым ліку 2 спецыялізаваныя: нотна-музычная і спецыяльная гарадская бібліятэка для сляпых. Штогод бібліятэкі абслугоўваюць каля 180 тыс. чытачоў, наведвальнікам выдаецца да 3 млн асобнікаў кніг і перыядычных выданняў.

У апошнія гады значна ўзрасла актуальнасць сацыяльнай функцыі ўстаноў культуры. Бібліятэка бярэ дадатковы абавязак па абслугоўванні на даму ветэранаў, інвалідаў, адзінокіх пажылых людзей. Для інвалідаў па зроку і невідушчых чытачоў у Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы ўсталяваны электронны стацыянарны відэапавелічальнік, апаратна-праграмны комплекс «Машына для чытання».

Сёлета ў Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы адноўлена выставачная прастора. Сапраўдным святам стала прэзентацыя сумеснага з Беларускім дзяржаўным архівам кінафотафонадакументаў фотапраекта «Мінск, пачатак 50-х». Супольна з Мінскім дзяржаўным мастацкім каледжам імя А. Глебава быў падрыхтаваны культурна-мастацкі праект «Песняру беларускага краю. Ад Чытання да Творчасці» да 135-гадовага юбілею Янкі Купалы.

Падарункам таксама стала віртуальная вандроўка «Купалаўскія мясціны Мінска».

У Цэнтралізаванай сістэме дзяржаўных публічных бібліятэк сталіцы працуе пераможца конкурсу «Лепшы бібліятэкар 2017» Надзея Саладуха, загадчык бібліятэкі № 2 імя Н. К. Крупскай, якая атрымала Ганаровае званне «Мінскі майстар-2017» у намінацыі «Лепшы бібліятэкар».

Пад нумарам 53659

Браслаўская бібліятэка далучылася да сусветнага праекта, атрымаўшы пасведчанне з ЗША

Падыдзі да загадкавага мініяцюрнага кніжнага доміка на вуліцы, адчыні дзверцы, выберы кнігу… І адчуй асалоду чытання з дапамогай бібліятэкі на вольным паветры! Цяпер чытанне стала бліжэйшым і ў Браславе. Разам з адмысловымі азёрнымі краявідамі горад сёння славіцца і важнай сацыякультурнай адметнасцю — культурным комплексам «Свабодная вулічная бібліятэка» на тэрыторыі Цэнтральнай бібліятэкі, створаны на прыкладзе сусветнага сацыяльнага праекта *Little Free Library* («Маленькая бясплатная бібліятэка»). У Беларусі пакуль толькі дзве бібліятэкі падтрымалі гэты сусветны праект: першай стала навуковая бібліятэка БНТУ (у 2014 г.), другой — Цэнтральная бібліятэка ў Браславе.

Little Free Library — маленькая бясплатная бібліятэка — сусветны сацыяльны праект стварэння міні-бібліятэк на вольным паветры. Гэта сетка грамадска даступных пунктаў для бясплатнага чытання кніг і іх абмену. З маленькіх бібліятэк фарміруюць незвычайныя арт-аб'екты і ўпісваюць у гарадскі асяродак, чым упрыгожваюць прастору.

Першыя бібліятэкі на вольным паветры з'явіліся ў ЗША ў сярэдзіне XX стагоддзя. У Еўропе праект *Little Free Library* дзейнічае з 2009 года. Цяпер у ім удзельнічаюць больш як 50 тысяч бібліятэк з 60 краін свету. Сутнасць праекта у тым, каб браць кнігі з вулічнай міні-бібліятэкі і вяртаць пасля чытання, свайго роду буккросінг. Кнігі нідзе не трэба запісваць, рэгістраваць. Можна прыносіць свае асобнікі з дамашняй бібліятэкі. У розных краінах у гэтага праекта розныя назвы: «Вулічная бібліятэка», «Маленькая бясплатная бібліятэка», «Бібліятэка на вольным паветры», «Адкрытая бібліятэка». Але дэвіз руху свабоднага абмену кнігамі ва ўсіх краінах аднолькавы — *«Take a book — return a book»* («Вазьмі кнігу — вярні кнігу»).

Little Free Library ў Браславе.

Праект «Свабодная вулічная бібліятэка» ў Браславе афіцыйна зарэгістраваны ў міжнародным руху маленькіх бясплатных бібліятэк. Цэнтральная бібліятэка Браслава атрымала з ЗША ад каардынатараў праекта спецыяльную металічную таблічку, на якой указаны арыгінальны міжнародны нумар — 53659. Менавіта пад такім нумарам зарэгістравалі Свабодную вулічную бібліятэку Браслава ў міжнародным руху *Little Free Library*.

— Ідэя стварыць культурны комплекс «Свабодная вулічная бібліятэка» ў Браславе належыць Цэнтральнай бібліятэцы, творча ўвасобіць праект дапамог Відзаўскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж. І, вядома, нічога не было б без галоўнага складніка — фінансавага: матэрыяльнае спрыянне аказаў Браслаўскі раённы выканаўчы камітэт. Вельмі ганарымся, што давялі гэтую справу да канца. Бо вулічных бібліятэк існуе шмат, але многія без рэгістрацыі, а мы з нумарам з Амерыкі і на міжнароднай карце праекта, — расказвае Ірына Макарэвіч, загадчыца аддзела бібліятэчнага маркетынгу Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Браслаўскага раёна.

Свабодная бібліятэка сёння — гэта не толькі магчымасць у любы час узяць з кніжнага доміка ўпадабаныя выданні. Акрамя сваёй асноўнай функцыі — свабоднага абмену кнігамі — вулічная бібліятэка выкарыстоўваецца як пляцоўка для мерапрыемстваў, сустрэч, акцый.

Для папаўнення фонду свабоднай вулічнай бібліятэкі Цэнтральная бібліятэка Браслава аб'яўляла акцыю «Падары бібліятэцы патрэбную кнігу». З дапамогай такіх акцый вулічны домік папаўняецца новай цікавай літаратурай.

Наталля СВЯТЛОВА

Кабінет савецкага пісьменніка

У Гомельскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Аляксандра Герцэна пачала дзейнічаць новая экспазіцыя Музея аўтографа — «Кабінет пісьменніка». У аснову экспазіцыі пакладзена прыватная бібліятэка пісьменнікаў Сяргея і Галіны Масяшаў. Сяргей Паўлавіч — член Саюза расійскіх пісьменнікаў, лаўрэат прэміі імя В. Пікуля, аўтар серыі вядомых гістарычных раманаў і аповесцяў («Аляксандр Неўскі», «Слуга сямі цароў», «Адысея Бацькі Махно» і інш.). Галіна Фёдараўна — дзіцячая пісьменніца (творчы псеўданім Галіна Фёдарава).

Сяргей і Галіна Масяшы — унікальны сямейны творчы тандэм. На працягу многіх гадоў яны сябравалі з бібліятэкай імя А. Герцэна, тут адбываліся прэзентацыі іх новых кніг і юбілейныя вечарыны. Пасля смерці Сяргея Паўлавіча Галіна Фёдараўна падаравала бібліятэцы кнігі, сабраныя разам з мужам, — 589 экзэмпляраў розных выданняў. Кнігі Масяшаў сталі бібліятэкай у бібліятэцы. Экспазіцыя, афармленая як кабінет пісьменніка, дазваляе не толькі пазнаёміцца з прыватнай бібліятэкай пісьменнікаў і сферай іх зацікаўленняў, прасачыць этапы працы па напісанні гістарычных раманаў Сяргея Масяша, але і адчуць атмасферу савецкай эпохі і тагачаснага літаратурнага працэсу. Адкрыццё выстаўкі было прымеркавана да дзевяностагоддзя з дня нараджэння Сяргея Масяша.

Юлія ШПАКОВА

Конкурс «УРОКІ СУЧАСНАСЦІ»

ТАЯМНІЦЫ МАРМУРОВАГА АНЁЛА

Урок пазакласнага чытання
па беларускай літаратуры
ў 8 класе па аповесці
Людмілы Рублеўскай
«Сэрца мармуровага анёла»

Абгрунтаванне актуальнасці тэмы. «Сэрца мармуровага анёла» — адзін з твораў, якія распачынаюць літаратуру XXI стагоддзя, бо пабачыў свет у 2000 годзе. Людміла Рублеўская працягвае традыцыі знакамітага Уладзіміра Караткевіча. Вучні нашай школы ведаюць яе па творах «Янук, рыцар Мятлушкі» і «Сэрца мармуровага анёла». Гістарычныя раманы з элементамі готыкі і дэтэктыва захопліваюць з першых старонак. Магчыма, неўзабаве ў школе будуць вывучаць не толькі «Сэрца мармуровага анёла», але і «Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега».

Творы, па якіх праводзяцца заняткі. Аповесць Л. Рублеўскай «Сэрца мармуровага анёла» і верш Л. Рублеўскай «Мармуровы герой на букеты мае не зважае…»

Мармуровы герой на букеты
мае не зважае.
У расколінах рукі яго,
а ў вачніцах — залева.
А дарога сядзібнага парку,
нібыта вужака,
Выгінае сваё брукаванае
цела між дрэваў.
Да каменных не страшна
хадзіць.
Расчароўвацца позна,
А насмешлівасць ім
не ўласціва.
Каменныя вусны
Крыўдным словам
не зганьбяць.
Ігліцай засыпалі сосны
След крывавых дзяянняў
героя
і вечнасці руны.
Тут лацвей, чым з жывымі…
Яны аплятаюць, як змеі,
Злой увагай, зайздрослівым
поглядам,
прагнай любоўю.
У цябе не адняўшы нічога,
любіць — не умеюць.
А тваёю любоўю сілкуюцца,
быццам крывёю.
Мармуровы герой,
безыменны,
як гэтыя хмары,
Затаецца на варце,
бы сонца ў разбітае шыбе.
Водар восеньскіх кветак
гаркавы,
як дым ад пажару,
У якім інсургенцкая наша
згарэла сядзіба.

Арыгінальнасць правядзення ўрока. Вучні без вялікай ахвоты чытаюць творы беларускай літаратуры. Таму хацелася, каб гэты твор не проста прачыталі, але і запомнілі. Запомнілі не толькі герояў і іх прыгоды, але і тое, што «кожны чалавек — гэта свет», а непажаданая вандроўка можа стаць адкрыццём і кахання, і чалавека, і новай старонкі ў жыцці. Для ўрока была абрана форма гульні з выкарыстаннем гексаў (сучасны педагагічны прыём). На гексах былі запісаны заданні для кожнай каманды. На гэтыя пытанні вучні павінны даць правільныя адказы, а потым скласці гексысоты так, каб на адваротным баку змаглі прачытаць верш Л. Рублеўскай «Мармуровы герой...».

Пытанні, напісаныя на гексах, патрабавалі ад вучняў ведання не толькі тэксту аповесці, але і ведаў па геаграфіі, гісторыі і рэаліях сённяшняга жыцця.

1. Вёска, у якую адправілася Кася, мае назву Наўе. Як тлумачыцца гэта назва?

2. У якім паселішчы Віцебскай вобласці маглі адбывацца падзеі?

3. Што ўяўляюць сабою драўляныя скульптуры XVII стагоддзя?

4. Высокі нязграбны чалавек — ці прывід? Апішыце знешні выгляд Вінцука.

5. Жанчына нецярпліва пастукала аб драўляную падлогу дасканалым боцікам з казачнай бліскучай скуры на высокім абцасе. Хто гэта жанчына і якую ролю адыграла яна ў разгадцы таямніц аповесці?

6. Крыж падарыла Грыню Вяржбіцкаму сама каралева Бона. Хто гэтая каралева і якую ролю адыграла яна ў лёсе Міколы Гусоўскага?

7. Дзіўна. Можа, падалося? Не, свеціцца… Што хаваецца за гэтымі радкамі?

8. Пра які талісман згадвае ў лісце ваша бабуля?

9. У тупіку я знайшла маленькія дзверы без шыльды. Якую таямніцу адкрыла Кася для сябе за гэтымі дзвярыма?

10. Я расцаніў гэта як добры знак і заглынуў нажыўку разам з кручком. Што стала нажыўкай і для каго?

11. Прачытайце шыфроўку і растлумачце, як яна звязана з Віктарам Іванавічам Палецкім?

Ёненбыўвлякімжоастыанмертаўпяцьуджыўанюўрогпыажныдбныромікемньчакымі.

12. — Позна... — выкрыкнуў антыквар. Што адбылося за некалькі хвілін перад гэтым?

13. Хто такі даўншыфтар? І ці можам мы назваць Вінцука такім чалавекам? (размова герояў у 7 раздзеле аповесці)

Удзел вучняў у занятках. Вучні на ўроку маглі карыстацца гаджэтамі для пошукаў правільных адказаў. Час на выкананне заданняў быў абмежаваны, як пры праходжанні этапаў шматлікіх квэстаў, пра якія добра ведаюць навучэнцы. Гэта давала азарту. На пошук адказаў было 30 хвілін. Потым вучні праверылі адказы, вызначылі пераможцаў і паразмаўлялі пра змест верша.

Вынікі. Вынік усцешыў. Праца мела працяг. Такая форма ўрока вельмі спадабалася вучням. Гісторыя Касі і Вінцука засталася ў памяці, бо прымусіла задумацца над жыццёвымі каштоўнасцямі. Вучні прапанавалі правесці ў такой форме і адзіны ўрок дадатковага чытання ў 9 класе. Засталося абраць такі ж цікавы твор са спіса рэкамендаванай літаратуры для 9 класа.

Алег АТРАХІМОВІЧ,
настаўнік Варапаеўскай сярэдняй школы
Пастаўскага раёна

ВЕЧНЫЯ ТРАДЫЦЫІ

85 гадоў гісторыі Беларускай акадэміі музыкі і 800 персаналій змясцілі ў адну кнігу «Беларуская дзяржаўная кансерваторыя — Акадэмія музыкі. Гісторыя ў тварах». Працу над выданнем цягам двух гадоў вялі 10 чалавек, звесткі шукалі ў архівах, паспрабавалі прасачыць гісторыю Акадэміі музыкі нават у складаныя часы вайны. Кіравала рэдкалегіяй дацэнт кафедры тэорыі музыкі Нэлі Вячаславаўна Мацабярыдзэ, за плячыма якой каля 70 даследчыцкіх публікацый на тэму музыкі:

— Мы разам з дацэнтам кафедры гісторыі музыкі Наталляй Гамул і кандыдатам навук Святланай Нямцовай-Амбаран працавалі над канцэпцыяй і напаўненнем выдання, а астатняя частка калектыву працавала непасрэдна з людзьмі: размаўлялі з відавочцамі падзей, бо ў нас дагэтуль працуюць асобы, якія могуць шмат узгадаць, яны па зярнятках збіралі гісторыю і памятаюць яе нягледзячы на карэктывы часу. Мы пераглядзелі ўсе асабістыя справы, якія знайшлі, і сышліся на меркаванні, што самае складанае — прасачыць гісторыю падчас вайны: кансерваторыя ўзнавіла работу толькі ў 1944 годзе, таму шмат інфармацыі згубілася, хоць і атрымалася знайсці звесткі пра рэктара, які працаваў у гэты складаны час.

Кніга з'явілася не на пустым месцы: гэта працяг гісторыі навучальнай установы, якую пачалі дакументаваць у падобным выданні 2005 года — менавіта гэтыя сведчанні паклалі ў аснову новай энцыклапедыі (сёлетняя кніга заканчвае летапісанне гісторыі акадэміі лістападам 2017 года).

Укладальнікі адзначаюць, што ў старым выданні няма твараў, таму і вырашылі стварыць «кнігу твараў», каб выбітных дзеячаў мастацтва можна было пазнаць. Дарэчы, архіўныя фотаздымкі не захаваліся ў неабходнай якасці, таму шмат намаганняў выдаткавалі на працу з візуальным матэрыялам. Самі асобы раскрываюцца ў кнізе па-новаму: у дэфініцыях (чым займаўся музыказнаўца, якія мае званні, адукацыю, над чым працаваў і якія мае публікацыі), у незвычайных фактах і ў саміх імёнах, многія з якіх упершыню гучаць на кніжных старонках, тлумачыць Нэлі Мацабярыдзэ:

— Мы многае ўзнавілі: першае выданне заканчваецца пералікам прозвішчаў, якія знайшліся падчас даследавання, — гэта і было нашым пунктам адліку, мы пачалі працу па пошуку біяграфій гэтых людзей. Зразумела, у нас з'явіліся і свае знаходкі, таму пасля працы над гэтым выданнем я бачу сілуэт наступнага. Напрыклад, нас здзівіў той факт, што вельмі складана прасачыць храналогію, ёсць блытаніна ў фактах, таму хочацца прайсці шлях новай кнігі, звярнуўшы ўвагу на хронас.

У першую чаргу кніга — гэта даведнік, які можа даць поўнае ўяўленне пра ўсе сферы дзейнасці персаналій, але, як бы навукова гэта ні гучала, стваральнікі падкрэсліваюць, што энцыклапедыя стане дарадцам не толькі для даследчыкаў ды студэнтаў (у кнізе ёсць спасылкі на навуковыя публікацыі), але і для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй музычнага мастацтва: выданне выконвае і папулярызатарскую ролю.

Што да герояў кнігі, то гэта вельмі розныя людзі: ад вядомых Аладава ды Алоўнікава да балерын, пра якіх ужо не вельмі памятаюць, ёсць звесткі пра вялікіх дырыжораў Праваторава, Штэйна, Катаева, харэографаў Лапо і Саркісяна. Праведзена тытанічная праца: усе факты біяграфій трэба было ўдакладняць. Энцыклапедыя не будзе выданнем для аматараў лёгкага ды забаўляльнага чытва: мінімум цікавых малюнкаў, затое ёсць важныя гістарычныя старонкі, каб праілюстраваць час. Напрыклад, у аўтараў атрымалася знайсці фотаздымак першага выпуску навучальнай установы. Дарэчы, з таго першага выпуску мала што змянілася: людзі жывуць тымі ж імкненнямі. Змяняецца толькі час, адзначае Нэлі Мацабярыдзэ:

— Чым больш даследаванняў, тым больш зразумела, што час ідзе па спіралі. Напрыклад, прасачыўшы гісторыю развіцця опернай студыі, мы заўважылі, што многія оперы чырвонай лініяй праходзяць скрозь час. Праца розных рэжысёраў, дырыжораў і студэнтаў усё роўна вяртаецца да класікі, без якой немагчымая акадэмічная адукацыя. Штосьці застаецца вечным, і, на маю думку, гэта зварот да душы чалавека.

Калі паразважаць пра лічбу ў 800 персаналій, з'яўляюцца пытанні: гэта шмат ці не для 85 гадоў музычнай адукацыі?.. Ці ўсё ж талентаў з'яўляецца столькі, колькі патрэбна, каб традыцыі беларускай музычнай школы працягваліся надалей.

Маргарыта ДЗЯХЦЯР

Viva,

Кацярына Дулава.

Падыход быў акадэмічны, але, з іншага боку, у нас адкрыўся адзін з вядучых кірункаў — факультэт народных інструментаў: ён развіваецца, і цікавасць студэнтаў да спецыяльнасцей, звязаных з народным выканальніцтвам, не згасае. Тады ж прыходзілі працаваць выдатныя майстры, самародкі, як тыя ж Жыновіч ці Жыхараў.

— Якім чынам сёння адбіраюцца таленавітыя дзеці?

— Гэта, па сутнасці, эксклюзіўная праца. Да нас паступіць адразу пасля школы немагчыма. Усе добра разумеюць, што музыка — гэта мастацтва. Каб яго засвоіць, існуе традыцыя вельмі ранняга ўключэння ў адукацыю — так жа, як, напрыклад, у класічным танцы (балеце). Гэта звязана з фізіялогіяй чалавека, з развіццём слыху і музычнай мовы, на якой музыкант мысліць. Таму ў нас створана своеасаблівая адукацыйная вертыкаль, стройная сістэма, якой хутка каля 200 гадоў і якая стабільна працуе. Сёння ёсць гімназія-каледж пры акадэміі, дзе нашы прафесары выкладаюць, кансультуюць і ведаюць тых, хто рыхтуецца і мог бы паступаць да нас. Гэты каледж забяспечвае абітурыентамі ВНУ. Далей — сістэма музычных каледжаў, якія ёсць у розных рэгіёнах краіны: кожны рэгіён адрозніваецца ад іншага. Некалі нехта вельмі разумны размясціў іх на карце нашай краіны з улікам спецыфікі рэгіёна, каб гэтыя навучальныя ўстановы не толькі падтрымлівалі адукацыю, але і былі своеасаблівымі культурнымі цэнтрамі — асветнымі, адукацыйнымі, выхаваўчымі, музычнымі. Што такое сёння каледж дзесьці ў Лідзе, у Баранавічах, у Наваполацку? Гэта наяўнасць сваіх творчых калектываў, канцэртнай залы, па сутнасці, маленькая філармонія — дзіцячая. І там таксама фарміруюцца кадры, якія хацелі б працягнуць адукацыю. Мы выкарыстоўваем рычагі прафесійна-арыентацыйнай работы, маем куратараў ад акадэміі ў кожным вучылішчы. Ведаем, што адбываецца ў дзіцячых музычных школах, бо там працуюць пераважна нашы выпускнікі. Такім чынам утварылася структура, у якой аб'яднаны ўсе зацікаўленыя: прадстаўнікі дзіцячых музычных школ, сярэднеспецыяльныя навучальныя ўстановы, акадэмія і тыя, каму патрэбны нашы кадры (аркестры, хары, тэатры, тыя ж школы і каледжы), каб потым атрымаць спецыялістаў. Дзякуючы створанай нацыянальнай сістэме музычнай адукацыі мы можам загадзя ведаць лічбу прыёму, разумеючы, колькі будзе выпускнікоў.

— Моладзь, якая да вас прыходзіць, мае разуменне, што музыка патрабуе ахвярнасці?

— Думаю, што ў пераважнай большасці яно сфарміравана жыццём, у нашай адукацыі сплецены навучанне і практыка, таму што без выступленняў музыкант не расце. Вядома, маленькае дзіця хоча гуляць, бегаць па вуліцы, як яго аднагодкі. А тут трэба гадзінамі займацца. Па сутнасці, ужо нейкая частка жыцця маленькага чалавека прынесена ў ахвяру. Па-іншаму не атрымаецца, калі вырашыў звязаць сваё жыццё з гэтым відам мастацтва. Прыходзячы ў акадэмію, навучэнцы гэты рытм падтрымліваюць. Не буду ідэалізаваць карціну: сустракаюцца людзі, якія пакідаюць прафесію, але гэта мінімальная колькасць у параўнанні з тымі, хто сапраўды вырашыў звязаць сваё жыццё з музыкай. Таму што потым гэта прафесія адорвае тым, чаго ў большасці іншых людзей няма.

— Вашы студэнты пачынаюць канцэртаваць з малых гадоў. Ёсць конкурсы, якія даюць магчымасць удасканальвацца. Ці аблягчае гэта потым творчае жыццё?

— Я магла б сказаць, што і без конкурсаў можна вырасці. Але ёсць аналогія са спортам: без духу спаборніцтва, магчыма, няма матыву рухацца ў прафесіі. Атрыманая перамога не толькі надае сілы, але і ўздымае на прыступку вышэй: разумееш, чаго можаш дасягнуць. Але калі конкурсная сітуацыя ставіцца ў аснову, калі мама з татам дзеля гэтага жывуць, то дзіцяці гэта можа прынесці цяжкія ўзрушэнні адмоўнага характару. У той жа час конкурс падтрымлівае здаровыя прафесійныя амбіцыі. У чалавека фарміруецца зарад прафесійнай дзейнасці з ранніх гадоў (у нас школьнікі ўдзельнічаюць у сур'ёзных конкурсных спаборніцтвах). У студэнцкія гады гэта пашырае бачанне сябе ў прафесіі, фарміруе «паслужны спіс». Званні лаўрэатаў, дыпламантаў даюць магчымасць рухацца далей пры пераходзе з аднаго адукацыйнага ўзроўню на другі: такі чалавек мае перавагу. Яна ёсць і пры залічэнні ў ВНУ: кіраўнік дзяржавы даў нам магчымасць рабіць прыярытэтам творчыя іспыты, пры роўнай колькасці балаў мы прымем таго, хто мае багаж і запас прафесійнай трываласці. Гэта дае перавагу і пры паступленні ў магістратуру і аспірантуру. У чалавека з такімі рэгаліямі будуць перавагі пры працаўладкаванні.

— У нас робіцца ўхіл на індывідуальнае майстэрства, ці ўлічваецца будучая калектыўная дзейнасць?

— Тут трэба сказаць пра спецыфіку індывідуальнай адукацыі ў творчых ВНУ. Ёсць музыканты, якія маюць толькі індывідуальны досвед, а ёсць музыканты, жыццё якіх будзе звязана з калектыўнай дзейнасцю ў аркестры ці хары. І адны, і другія павінны выхоўвацца ў адпаведных умовах. У нас больш за 10 творчых калектываў, дзе студэнты могуць набываць гэты досвед. Сёння нашы студэнты ўдзельнічаюць у сацыяльных праектах, у праектах дыпламатычнай сферы, калі мы павінны паказаць нашу адметную беларускую музыку. Удзел у дзяржаўных мерапрыемствах дае магчымасць адчуваць, што яны патрэбны сваёй краіне: творчая моладзь паказвае сябе на самых буйных пляцоўках з удзелам кіраўніка дзяржавы і ў праектах за мяжой, якія ажыццяўляюць нашы ВНУ-партнёры. Асобныя музыканты выступаюць у якасці салістаў.

Але не будзем прымяншаць дзейнасць і творчы рост тых, хто не ўдзельнічаў у конкурсах. Не ўсе ўздымаюцца на творчы Алімп, але я з вялікім задавальненнем сачу за тымі студэнтамі, якія паступаюць са сціплымі магчымасцямі і паступова раскрываюцца. З іх атрымліваюцца выдатныя педагогі. Яшчэ невядома, што жыццёва больш аб'ектыўна: вундэркінд, які ўражвае з малых гадоў, ці чалавек, талент якога раскрываецца праз працу. Тут я аддаю належнае таленавітым педагогам, якія здольны гэта ўбачыць і запаліць.

— Для творчых ВНУ актуальна паняцце «майстра»...

— Па кожнай спецыяльнасці ў нас ёсць не проста майстар, а яго творчая школа. Гэта самы лепшы варыянт развіцця выканальніцкага кірунку, калі ёсць выдатны педагог (напрыклад, піяніст, скрыпач), які вядзе сваіх вучняў і перадае ім майстэрства: як здабываць гук, як інтэрпрэтаваць твор або той ці іншы стылявы кірунак. Таму нармальным з'яўляецца пытанне: «У каго ты вучыўся?»... Адзначаю піетэт, што існуе ў нашых выхаванцаў у адносінах да педагога, які падчас вучобы становіцца блізкім чалавекам.

— У нас яшчэ працуюць выкладчыкі, падрыхтаваныя ў Пецярбургу ці ў Маскве. Ці рыхтуе акадэмія сама выкладчыцкія кадры?

— Гадоў 30—40 таму патрапіць у нашу ВНУ па размеркаванні было даволі няпроста, для гэтага трэба было заявіць пра сябе. Сёння мы разумеем, што кафедра павінна ўтрымліваць некалькі пакаленняў выкладчыкаў, у тым ліку маладых. За апошнія 3—4 гады больш за 20 чалавек з ліку нашых выпускнікоў працаўладкаваны ў Акадэміі музыкі. Ужо можна казаць, што мы фарміруем уласныя адукацыйныя традыцыі. Але карані палягаюць у касцяку прафесараў, якія атрымлівалі адукацыю ў вялікіх майстроў. Сёння з задавальненнем магу гаварыць пра фартэпіянную школу, якую фарміруюць Ігар Алоўнікаў, Юрый Гільдзюк, Уладзімір Дулаў, Уладзімір Няхаенка. У нас працуе Ніна Шарубіна, якая вядзе вакальную справу. Ёсць школа харавога майстэрства, якую стварыў Віктар Роўда і традыцыі якой працягвае загадчык кафедры харавога дырыжыравання Інэса Бадзяка, школа выканальніцтва на духавых інструментах на чале з прафесарамі М. М. Волкавым, У. П. Скараходавым, Б. У. Нічковым, школа спеваў, старэйшы прадстаўнік якой — народная артыстка СССР, прафесар Т. М. Ніжнікава, школа выканальніцтва на беларускіх цымбалах, заснаваная І. І. Жыновічам, традыцыі якога плённа развіваецца сёння народны артыст Беларусі, прафесар Я. П .Гладкоў, і шматлікія іншыя.

— Школа і ўзровень падрыхтоўкі прыцягваюць у акадэмію замежных студэнтаў. Таму што напрацаваны пэўны імідж?

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Academia!

— Так, ён фарміруецца і пад уплывам таго, што мы жывём у сучасным свеце. У нас вялікая колькасць ВНУ-партнёраў — каля 60, і з імі ў нас розныя ўзаемаадносіны: стажыроўкі, павышэнне кваліфікацыі, адукацыйныя працэсы, акадэмічная мабільнасць у межах праграмы «Эрасмус». Нашы замежныя партнёры разумеюць, што тут у аснове — акадэмічная (так званая «руская») школа. Але было даволі нечакана, калі нашы кітайскія партнёры зацікавіліся навучаннем на беларускіх цымбалах!

Замежнікі едуць сюды і таму, што чулі пра цудоўных педагогаў: і духавікаў, і піяністаў, і выкладчыкаў акадэмічнага вакалу... Мы даём усе формы адукацыі: яны ўдзельнічаюць у нас і ў аркестрах, і ў ансамблях, і ў опернай студыі. Замежныя студэнты бяруць удзел у міжнародных конкурсах, прадстаўляючы сваю дзяржаву. Гэта адкрытае існаванне студэнцтва ў сучасным свеце.

Фота Таццяны Блахіной.

Шмат нашых выпускнікоў з Кітайскай Народнай Рэспублікі занялі кіруючыя пасты ў кітайскіх ВНУ і за межамі сваёй краіны. Але адна з нашых выпускніц, вучаніца Віктара Роўды, вырашыла звязаць сваё жыццё з Беларуссю. Грамадзянка КНР Гун Лі скончыла аспірантуру, працуе дацэнтам на кафедры харавога дырыжыравання Акадэміі музыкі, мае від на жыхарства Рэспублікі Беларусь. Перавезла мужа, які таксама скончыў нашу акадэмію, нарадзіла дзяўчынку і збіраецца далей працягваць тут працу. Сёння ў нас 205 замежных грамадзян на розных ступенях адукацыі.

Мы таксама маем магчымасць накіроўваць сваіх студэнтаў на навучальныя праграмы ў ВНУ-партнёры.

— І беларускія музыканты дзякуючы сваёй падрыхтоўцы ўладкоўваюцца за мяжой…

— Добра, калі гэта адбываецца так, як нам хацелася б, калі яны не з'язджаюць зусім, атрымаўшы адукацыю, і мы болей пра іх нічога не ведаем. Ёсць людзі, якія выступаюць у спаборніцтвах пад сцягам Рэспублікі Беларусь, прыязджаюць сюды і даюць канцэрты, займаюцца адукацыйнай дзейнасцю. Напрыклад, першы трубач Францыі і Французскага нацыянальнага сімфанічнага аркестра Андрэй Кавалінскі апякае духавую адукацыйную прастору ў нашай краіне. Скрыпач Арцём Шышкоў дае майстар-класы, удзельнічаў у юбілейным канцэрце з нашым сімфанічным аркестрам. Цымбаліст Міхаіл Лявончык жыве ў Германіі і ў кожны свой прыезд дадому стараецца кантактаваць са студэнтамі і выступаць у гонар нашай ВНУ. Аксана Волкава, якая вядзе актыўную замежную дзейнасць, жыве тут і спрыяе таму, каб пра беларускую адукацыйную школу даведаліся за мяжой. Для мяне важная зваротная сувязь. Мы разумеем, што музыкант — чалавек свету, ён валодае ўнікальнай мовай, якая не патрабуе перакладу. Добра, калі дзякуючы такой працы больш даведаюцца пра нашу культуру.

Мне ўяўляецца, што Беларусь і Мінск могуць стаць месцам, куды будуць з'язджацца слухаць выдатных музыкантаў, будуць прыязджаць нашы выдатныя выпускнікі, у якіх жыццё звязана з замежнай дзейнасцю. Важна, каб у нашай інфраструктуры фарміраваўся такі кірунак, як музычны турызм. Калі людзі едуць у Прагу, Зальцбург ці Берлін слухаць музыку, то чаму тыя ж музыканты не маглі б выступаць тут, у нас? У добрых залах!.. Мы ўжо маем два знакавыя фестывалі, у рамках якіх выступаюць і беларускія музыканты: фестываль Юрыя Башмета і фестываль Уладзіміра Співакова, а таксама буйныя фестывалі, якія арганізуе Беларуская дзяржаўная філармонія — міжнародны музычны фестываль «Мінская вясна», міжнародны фестываль мастацтваў «Беларуская музычная восень». Пераканана, што гэтая тэндэнцыя павінна выйсці на новы ўзровень, таму што яна здольна падтрымаць імідж нашай краіны — не толькі як міралюбівага цэнтра Еўропы праз яе прымірэнчую дзейнасць, але і як культурнага цэнтра.

— Ці бачыце перспектыву для папулярызацыі музыкі, створанай беларускімі кампазітарамі?

— Гэта адзін з найважнейшых нашых кірункаў і ў навуковай, і ў выканальніцкай сферы. Сёння ўсе курсы напоўнены беларускай музыкай. Мы адзіныя, хто выдае музыку беларускіх кампазітараў, — партытуры, клавіры, неабходныя для адукацыйнай дзейнасці. Выдаём даследчыцкія працы, прысвечаныя беларускай музыцы. Адзначу два буйныя выданні, прысвечаныя Анатолю Багатырову і Мікалаю Аладаву, заснавальнікам беларускай кампазітарскай школы. З'явіліся і сёлета знакавыя выданні.

Змяніўся вектар, інтарэс у студэнтаў вялікі. Пра гэта сведчаць творчыя праекты маладых беларускіх кампазітараў. Ёсць інструменталісты, якія апантана выконваюць беларускую музыку, напрыклад, цымбалістка Вераніка Прадзед. У тэатрах ідуць оперы і балеты беларускіх кампазітараў, якія атрымліваюць высокія ўзнагароды. Працуе на гэта і філарманічная сцэна. Нацыянальная культура як сфера асветная і выхаваўчая задзейнічана ў адукацыйным працэсе — у выканальніцкім кірунку, вакальным, нават харэаграфічным (у нас працуе Валянцін Елізар'еў, стваральнік беларускіх балетаў).

— А што рабіць, каб нацыянальная культура — музычная частка — прысутнічала ў разуменні нашых грамадзян?

— Як рэктар я сутыкнулася з тым, што людзі ў шэрагу выпадкаў хочуць дакранацца да высокага акадэмічнага мастацтва, разумеючы, як гэта прыўздымае, паглыбляе ў іншы асяродак, які чалавеку неабходны, таму што ў кожным з нас жывая боская душа, яна шукае прыгажосці. Таму ладзім рэгіянальныя выезды, праводзім канцэрты ў дамах культуры. Мы ўпершыню ажыццявілі сацыяльны праект «Дакрананне», скіраваны на падлеткаў са складаных сем'яў, ці тых, хто апынуўся ў няпростай сітуацыі, для дзяцей-інвалідаў, для дзяцей, якія ніколі не мелі адносін да творчасці, каму тата з мамай не сказалі, што гэта можа быць у іх жыцці. Я была пераканана, што жывыя зносіны з інструментамі могуць раскрыць талент у кімсьці з гэтых дзяцей — калі яны ўбачаць гітару, трубу, ударныя інструменты… Гэта былі прамыя зносіны, безбар'ерны асяродак. Музыка выконвалася розная: з мультфільмаў, блокбастараў, класіка. Мы праехалі па Мінскай вобласці вялікім складам у 100 чалавек. Я для сябе вызначыла: гэта місія дакранання да чалавечай душы.

Але сапраўды гэта сур'ёзная тэма — менеджмент у сферы акадэмічнага мастацтва, які, на жаль, у нас зусім не развіты, пры тым што нейкае прадзюсіраванне ёсць хіба што ў сферы папулярнай музыкі. Магчыма, пры Акадэміі музыкі ці пры філармоніі павінен быць асобны цэнтр прасоўвання нацыянальнага выканальніцкага мастацтва, які б падтрымліваў і забяспечваў магчымасць яркім таленавітым маладым людзям рэалізоўваць сябе і ў Беларусі, і за мяжой. Магчыма, ёсць неабходнасць фарміравання буйнога канцэртнага комплексу, з добрым прафесійным абсталяваннем, дзе маглі б рэалізавацца гэтыя ідэі.

— Дзейнасць у Савеце Рэспублікі дае магчымасць паўплываць на тое, як у грамадстве выбудоўваюцца культурныя прыярытэты?

— Усцешана, што ёсць магчымасць удзельнічаць у гэтых працэсах з цудоўным дэвізам урачоў: «Не нашкодзь». Калі рыхтуецца важны дакумент, згодна з якім будзем жыць і працаваць, трэба, каб хтосьці кваліфікавана пракансультаваў, як гэта павінна быць. Мяне прыцягнулі ў рабочую групу па працы над унясеннем змен у Закон аб інтэлектуальнай уласнасці — гэта непасрэдна тычылася дзеячаў музычнага мастацтва. Другі дакумент, які мы чакаем з нецярпленнем, — Кодэкс аб адукацыі, дзе адлюстроўваецца і падрыхтоўка спецыялістаў у сферы мастацтваў, у тым ліку музыкі. Важны дакумент — Кодэкс аб культуры, якому хутка споўніцца год. Мы мелі магчымасць зразумець, як ён адлюстроўвае рэальнае жыццё і што можна дапрацаваць. Я ўсяляк падтрымліваю прапановы па ўдасканаленні галіновых дакументаў, якія тычацца нашай дзейнасці. Як член Савета Рэспублікі на асабістых прыёмах працую з дзеячамі культуры, каб даведвацца пра надзённыя праблемы. І нешта для мяне адкрываецца нанова...

Ларыса ЦІМОШЫК

«ДАЗВОЛЕНА ДА ВЫКАНАННЯ»

Юбілей Акадэміі музыкі адзначаюць з Купалам ды Коласам

Да 85-годдзя Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшла кніга «Повязь мастацтваў». Назва сведчыць пра сувязь музыкі і літаратуры, бо выданне прымеркаванае яшчэ і да святкаванняў юбілеяў класікаў айчыннай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа. Пра тое, як сумясціць факсіміле рукапісаў кампазітараў і творы беларускіх пісьменнікаў, распавяла **загадчыца нотна-навуковай бібліятэкі Акадэміі музыкі, адна з укладальнікаў кнігі Ганна Гамеза.**

— Пасля святкавання папярэдняга юбілею Акадэміі музыкі ўзнікла ідэя падрыхтаваць эталоннае выданне, якое б паказала, што за багацці мы захоўваем у фондзе бібліятэкі. Асаблівую каштоўнасць маюць рукапісы беларускіх кампазітараў. У свой час Міністэрства культуры перадало нам рукапісны фонд Беларускага саюза кампазітараў, і мы займаліся яго апрацоўкай ды апісаннем. Але пра гэтыя дакументы ведае абмежаванае кола людзей, і нам захацелася папулярызаваць іх праз адмысловую кнігу. Доўга разважалі над тым, як лепш арганізаваць выданне: рукапісаў і творцаў шмат, прадстаўленыя розныя жанры... Сёлета так супала, што юбілей не толькі ў Акадэміі музыкі, але і ў Янкі Купалы ды Якуба Коласа. Таму вырашылі абмежаваць тэматыку: узялі камерныя вакальныя творы беларускіх кампазітараў на вершы юбіляраў. І менавіта аўтографы — аўтарскія рукапісы, якія кампазітар пісаў уласнай рукой. Пры адборы аўтараў мы не глядзелі на папулярнасць і заслугі кампазітара, таму ў выданні ёсць імёны, пра якія ведаюць мала.

Кніга стваралася для ўсіх, каму цікавыя беларуская культура, музыка, паэзія. Яна прыцягне ўвагу кожнага карыстальніка бібліятэкі: і музыказнаўцы, і літаратара. Галоўнае — нашы студэнты атрымалі магчымасць убачыць, як кампазітары пісалі музыку раней, калі не ўсё рабілася на камп'ютарах пры дапамозе спецыяльных праграм. Тут кожная нотка выпісаная ад рукі, і да таго ж можна адкрыць любы аркуш і пачаць іграць. У кнізе сабраныя рукапісы, створаныя пасля вайны і да 1970-х гадоў (але самы стары рукапіс, прадстаўлены ў нашай падборцы, датаваны 1935 годам). Азначана цэлая эпоха! Здаецца, вайна, разбурэнне, цяжкі час, а песні з'яўляліся не толькі патрыятычныя, але і пра каханне.

У кнізе прадстаўлены не толькі факсіміле рукапісаў, але і кароткая інфармацыя пра кампазітараў, чые аўтографы ўключаны ў зборнік. Не забыліся і на пісьменнікаў-юбіляраў: асобна прадстаўленыя і Янка Купала ды Якуб Колас. Змясцілі інфармацыю нават пра асноўныя штампы, якія можна сустрэць на рукапісах, і пра арганізацыі, што іх ставілі. Прыкладам, штамп «Дазволена да выканання» нагадвае пра тое, што кожны рукапіс праходзіў цэнзуру. Асобна падаецца пералік інцыпітаў — пачатковых радкоў песен, пры дапамозе якіх можна знайсці патрэбны тэкст, нават калі не ведаеш яго назву. Рукапісы былі ў добрым стане, таму пададзеныя ў першапачатковым выглядзе. Факсіміле на старонках стаяць у «поўны рост»: адзін твор кампазітара Аладава нават не ўвайшоў у зборнік з-за вялікага фармату.

Не абышлося і без складанасцяў. Прыкладам, калі кампазітар ужо пакінуў гэты свет, высветліць, аўтарскі рукапіс перад намі ці не, зусім няпроста. Давялося звяртацца ў архіў і праглядаць шмат іншых рукапісных дакументаў, каб параўнаць почырк. Недзе ўдакладнялі гады жыцця і смерці творцы, бо інфармацыя ў даведніках адрознівалася ад архіўных звестак. З датаваннем рукапісаў таксама было складана: калі вялікія творы падпісваюць па ўсіх правілах, то камерныя звычайна без даты. На шчасце, творцы давалі справаздачу ў Саюз кампазітараў Беларусі, дзе пазначалі, што і калі зрабілі...

Кнігу выпусцілі на трох мовах — беларускай, рускай ды англійскай, бо «Повязь мастацтваў» мае на мэце папулярызаваць Акадэмію музыкі, яе фонды ды беларускую музыку ўвогуле.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

МАСКА, МЫ ВАС ВЕДАЕМ!

Калядны настрой з Надзеяй Кучар, Аксанай Волкавай і тымі, чые імёны пакуль не называем

Снежань у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі можна смела назваць месяцам оперы: напярэдадні Новага года на сцэне Вялікага тэатра ўжо восьмы раз ладзіцца Мінскі міжнародны Калядны оперны форум. Гэтая падзея штогод збірае знакамітых оперных выканаўцаў з розных куткоў свету. Беларускія оперныя прэм'еры, замежныя калектывы, вядомыя імёны... Што прапануе Калядны оперны форум — 2017?

Напярэдадні VIII Мінскага міжнароднага Каляднага опернага форуму генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі Уладзімір Грыдзюшка азначыў праграму мерапрыемства. Гэтым разам беларускі глядач убачыць тры прэм'еры ад роднага тэатра. Сёння, у першы дзень форуму, на сцэне з'явіцца бессмяротная «Чароўная флейта» В. А. Моцарта, якую паставіў рэжысёр-пастаноўшчык Ханс Ёахім Фрай (у 2013 годзе ён узбагаціў рэпертуар Вялікага тэатра операй «Лятучы галандзец» Р. Вагнера). Увечары аматараў опернага мастацтва чакае сюрпрыз: у ролі Царыцы ночы ў «Чароўнай флейце» выйдзе Надзея Кучар — двойчы лаўрэат Расійскай нацыянальнай тэатральнай прэміі «Залатая маска», пераможца міжнароднага конкурсу оперных спевакоў Бі-Бі-Сі ў Кардыфе (ганаровы тытул «Спявак свету»). Заўтра форум працягнецца спектаклем ад галоўнага рэжысёра Вялікага тэатра Беларусі Міхаіла Панджавідзэ. Тут таксама не абышлося без запрошаных артыстаў: партыі Турыда ў «Сельскім гонары» выканае заслужаны артыст Расіі, спявак з Марыінскага тэатра Ахмед Агадзі. Трэцяя прэм'ера — «Травіята» ў пастаноўцы латвійскага рэжысёра Андрэйса Жагарса — шосты раз з'явіцца на сцэне 18 снежня. Віялету Валеры ў асучасненым шэдэўры Вердзі ўвасобіць Надзея Паўлава, уладальніца Гран-Пры Мінскага конкурсу вакалістаў — 2015.

Значная для Вялікага тэатра Беларусі опера Жоржа Бізэ «Кармэн» (менавіта ад яе ідзе адлік спектакляў тэатра) сёлета паўстане перад гледачом у інтэрпрэтацыі рэжысёра Беата Рэдо-Добер і артыстаў Падляскай оперы і філармоніі (Еўрапейскі цэнтр мастацтваў у Беластоку). Гэтая «Кармэн» асучаснівае твор Жоржа Бізэ і моцна адрозніваецца ад папярэдніх варыянтаў оперы. Але нешта застанецца нязменным: галоўную партыю выканае Аксана Волкава — любімая Кармэн беларусаў, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі.

Як і заўсёды, Мінскі міжнародны Калядны оперны форум скончыцца на высокай ноце — заключэннем выступаў стане гала-канцэрт зорак сусветнай оперы. На сцэну выйдуць 22 салісты з 15 краін свету, сярод якіх — і трыумфатары Каляднага конкурсу вакалістаў мінулага года Тыгран Аганян (Арменія) і Андрэй Немзер (Расія). Хто пераможа ў IV Мінскім міжнародным Калядным конкурсе вакалістаў і з'явіцца на гала-канцэрце разам са знакамітымі опернымі спевакамі, даведаемся падчас фіналу конкурсу 20 снежня.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

У Цэнтры падзей

Ад «Сталіцы Эраўнд» Сяргея Гіргеля — да «Калгаснікаў» паводле Паўла Пражко. Сёлета Цэнтр беларускай драматургіі святкуе дзесяцігоддзе з дня заснавання. І гэтая нагода спрыяе не проста традыцыйнаму тэатральнаму падвядзенню вынікаў 2017-га, а размове пра цэлую дэкаду. Што змянілася ў беларускім тэатральным ландшафце дзякуючы Цэнтру?

П'ЕСА + РЭПЕРТУАР

ЦБД ствараўся як лабараторыя, што мусіла актыўна працаваць з новымі тэкстамі для тэатра і наладжваць трывалыя сувязі паміж удзельнікамі тэатральнага працэсу. Рэпертуарны тэатр, заціснуты ў межы паказчыкаў і планаў што тады, што цяпер не меў і не мае такіх мажлівасцей для манеўраў ды эксперыментаў. Для Цэнтра ж лабараторны працэс быў галоўнай задачай. Адным з першых масткоў, удала ўзведзеных ЦБД, стала наладжванне сувязі паміж новай хваляй драматургіі ды рэпертуарам РТБД, а пасля і іншых тэатраў. Першай удачай стаў дэбют драматурга Сяргея Гіргеля і рэжысёра Вольгі Саратокінай «Сталіца Эраўнд». Парадаксальная камедыя пра двух хлапцоў, выпадкова захраслых у вагоне метро, пастаўленая на пляцоўцы Цэнтра, увайшла ў рэпертуар РТБД, дзе з поспехам пратрымалася амаль дзесяць гадоў. Тым жа шляхам, напрыклад, на афішах тэатра з'явіўся спектакль «Ліфт» (драматург Юлія Чарняўская, рэжысёр Галіна Чарнабаева). А вынікі Міжнароднай драматургічнай лабараторыі, што на працягу шасці гадоў ладзіць Цэнтр, паспрыялі таму, каб нямецкі рэжысёр Моніка Дабраўлянска паставіла на сцэне РТБД п'есу Андрэя Іванова «Гэта ўсё яна».

Сцэна са спектакля «Мабыць?».

ДРАМАТУРГ + РЭЖЫСЁР

Адной з галоўных задач Цэнтра стаў пошук узаемаразумення паміж драматургамі і рэжысёрамі. Новая драматургія (п'есы Паўла Пражко, Канстанціна Сцешыка, Мікалая Рудкоўскага, Дзмітрыя Багаслаўскага ды мноства іншых) патрабавала новай сцэнічнай мовы для ўвасаблення. Яе пошукам шмат у чым паспрыяла створаная у 2012-м Міжнародная драматургічная лабараторыя. Шэсць гадоў запар прыблізна на тыдзень беларускія драматургі і рэжысёры з розных краін пустэльнікамі выпраўляюцца за горад, дзе пад кіраўніцтвам тэатральнага гуру працуюць над новымі п'есамі. Кіраўнікамі лабараторыі ў розныя гады сталі слынныя рэжысёры і драматургі: Міхаіл Дурнянкоў, Міхаіл Угараў, Яраслава Пуліновіч, Павел Ар'е ды інш. Шасцігадовы дыялог і сумесная праца над тэкстам адназначна зменшылі частотнасць пытання «Як гэта ставіць?» ад рэжысёраў. А драматургам дазволілі пашырыць стылістычную палітру і выйсці на раней не ўласцівую ім тэрыторыю. Так, напрыклад, дуэт драматурга Дзмітрыя Багаслаўскага і рэжысёра Яўгена Карняга стварыў абсурднаіранічную п'есу «Блондзі» пра ці то шчанюкоў аўчаркі Гітлера, ці то жанчын у замкнёнай прасторы. А дыялог украінскага рэжысёра Стаса Жыркова і беларускага драматурга Андрэя Іванова спрадуцыраваў чорную камедыю «З вучылішча»: навучэнка ПТВ кахае свайго выкладчыка філасофіі, той карыстаецца сітуацыяй дзеля выгады і трапляе ў пастку. Дарэчы, сёлета менавіта гэтая п'еса Андрэя Іванова, створаная ў межах Лабараторыі-2016, стала адной з чатырох прэтэндэнтак на галоўную тэатральную прэмію Расіі «Залатая маска» ў намінацыі «Драма / праца драматурга».

Цэнтр беларускай драматургіі створаны ў 2007 годзе, існуе пры Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі. Першым кіраўніком Цэнтра была тэатразнаўца Хрысціна Смольская. З 2009 года ЦБД узначальвае акцёр і рэжысёр Аляксандр Марчанка. Галоўная мэта Цэнтра — пошук і падтрымка маладых драматургаў і рэжысёраў, збіранне і распаўсюджванне лепшых узораў беларускай сучаснай драматургіі.

ТЭОРЫЯ + ПРАКТЫКА

Асаблівую ўвагу ў гэта дзесяцігоддзе ЦБД прысвячаў адукацыйнай дзейнасці, імкнучыся засвоіць найноўшыя тэатральныя тэндэнцыі. У розны час, дзякуючы працы Цэнтра, у Мінску прайшлі лекцыі, семінары, майстар-класы топавых тэатральных дзеячаў СНД і Еўропы. Сваім вопытам з беларускай супольнасцю дзяліліся стваральнік тальяцінскай школы драматургіі Вадзім Леванаў, кіраўнік Цэнтра імя Ус. Меерхольда, рэжысёр Віктар Рыжакоў, крытык Павел Руднеў, драматург і адзін з арганізатараў фестывалю сучаснай драматургіі «Любімаўка» Міхаіл Дурнянкоў, драматург і рэжысёр Іван Вырыпаеў, драматург і сцэнарыст Любоў Мульменка. Ідэі шмат якіх важных для беларускага тэатральнага працэсу работ былі народжаны менавіта ў межах гэтых адукацыйных праектаў. Напрыклад, ідэя спектакля пра таемнага беларуса — які ён сучасны беларус? — упершыню прагучала на двухдзённым семінары па дакументальным тэатры Любові Мульменкі. А праз колькі часу трансфармавалася ў адзін з самых важных спектакляў апошняга часу — дакументальнае даследаванне міфаў пра сучасных беларусаў «Мабыць?», што ідзе на сцэне РТБД.

Акрамя таго, Цэнтр намагаецца абагульніць і вопыт айчынных тэарэтыкаў тэатра. Лекцыі Святланы Ганчаровай-Грабоўскай, Таццяны Арцімовіч, Наталлі Валанцэвіч ды іншых даследчыкаў гучалі ў межах ужо традыцыйнага Тыдня беларускай драматургіі і шматлікіх фестываляў.

МЫ + ЯНЫ

Нягледзячы на азначэнне «беларускай», Цэнтр ніколі не замыкаўся ў межах нацыянальнай драматургіі, захоўваючы адкрытасць свету і вопыту іншых краін. Адным з самых плённых супрацоўніцтваў сталі сумесныя праекты з Інстытутам імя Гётэ ў Беларусі ды прэзентацыя зборнікаў сучаснай нямецкамоўнай драматургіі «ШАГ-3», «ШАГ-4» і сучаснай нямецкамоўнай драматургіі для падлеткаў «ШАГ 11+». Беларускія рэжысёры змаглі ўвасобіць, а гледачы — пабачыць п'есы Дэа Лоэр, Марыуса фон Маенбурга, Роланда Шымельпфенінга. Адным з самых паспяховых праектаў гэтай серыі быў завершаны ўжо ў Цэнтры эксперыментальнай рэжысуры спектакль рэжысёра Наталлі Ляванавай паводле п'есы Філіпа Лёле «Яго клікалі спадар», галоўны герой якога пакутуе пасля таго, як яго ламу адбірае «Грынпіс», і жадае адасобіцца ад капіталістычнага грамадства.

УНУТРЫ + ВАКОЛ

Усведамляючы, што ў выйгрышы сёння застаецца той, хто сінтэзуе і спалучае, здавалася б, неспалучальнае, ЦБД падтрымлівае шмат якія ініцыятывы і па праве заслужыў рэпутацыю адной з самых адкрытых тэатральных пляцовак краіны. Апошняй такой «сінтэтычнай» падзеяй сталі ЛАРПы — ролевыя гульні жывога дзеяння паводле тэксту «Онікс» Максіма Дасько, прысвечанага гангстарскаму жыццю падлеткаў 1990-х у спальным раёне на захадзе Мінска. Паяднальнымі якасцямі валодаюць і праекты, што нарадзіліся ў Цэнтры, але потым выйшлі за яго межы. У прыватнасці, мак'юментары п'еса «Опіум» пра вайну ў галовах і жыццё ў Рагачове, створаная падчас адной з драматургічных лабараторый Віталём Каралёвым. Аляксандр Марчанка паставіў яе ў Цэнтры візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «АРТ Карпарэйшн». «Опіум» стаў першым паспяховым тэатральным краўдфандынгавым праектам у Беларусі. Тэатральная супольнасць з'ядналася шчыльней і, дзеля таго каб пабачыць «Опіум» на сцэне, сабрала крыху больш за 4 000 BYN на візуальнае афармленне спектакля, які па розных прычынах наўрад ці адбыўся б на сцэне рэпертуарных тэатраў.

X + Y

Гэты летапіс бліскучага дзесяцігоддзя стварае ўражанне залатога веку. Насамрэч праблем хапае: і сучаснай драматургіі ў рэпертуарах пакуль не засілле, і ў пошуку ключоў да яе не стае разнастайнасці. Аднак галоўнае, што хацелася падкрэсліць творчай справаздачай, — станоўчую дынаміку. Сёння праблемай сучаснай беларускай драматургіі ўжо не з'яўляецца яе адсутнасць. Адбылося гэта шмат у чым дзякуючы Цэнтру беларускай драматургіі. І ў яго лабараторыі паранейшаму вядзецца праца над тым, каб замяніць невядомыя пакуль што пераменныя новымі неабходнымі складнікамі тэатральнага працэсу.

Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ

Кіно

КРЫК ДУШЫ

Дакументалістыка пра тое, як важна быць пачутым

Дакументалістыка заўжды была чымсьці элітарным, сур'ёзным, нагодай для роздумаў. Такія стужкі маюць сваю армію прыхільнікаў у выглядзе гледачоў і арганізатараў кінафестываляў. Зараз у Мінску праходзіць фестываль сур'ёзнага дакументальнага кіно на тэму правоў чалавека *WATCH DOCS Belarus*: у кінатэатры «Мір», Гістарычнай майстэрні і Цэнтры культурных інавацый *ok16* паказваюць стужкі з розных краін з беларускімі і рускімі субцітрамі. Арганізатар фестывалю Таццяна Яворская распавяла, як сабраць грошы на кіно праз кавярні і якія фільмы з праграмы трэба ўбачыць абавязкова.

— Таццяна, *WATCH DOCS* з'явіўся ў Варшаве ў 2001 годзе, а тры гады таму вы прывезлі яго ў Мінск. Ці складана гэта было?

— Я даведалася пра фестываль 10 гадоў назад і вырашыла паехаць у Варшаву, таму што мяне цікавіць тэма правоў чалавека. Убачанае спадабалася, таму вырашыла, што няма лепшага спосабу паразмаўляць з людзьмі на такую складаную тэму, і прывязла ідэю ў Беларусь. Перакананая, што такія фільмы дазваляюць гледачу паставіць сябе на месца героя, бо сюжэт — гэта рэальная гісторыя, і менавіта праз такія асабістыя гісторыі лягчэй дагрукацца да гледача.

— Як вы адбіраеце кіно? І хто гэтым займаецца?

— Усё робіць наша каманда, але кожную вясну ў сацсетках мы прапаноўваем гледачам фільмы (з праграмы польскага фестывалю ці проста кіно, якое нам падаецца трапным), з якіх можна выбраць тое, што спадабалася, і мы ўключым гэта ў праграму. Безумоўна, тут спрацоўвае і наша асабістае меркаванне: асноўны крытэрый — актуальнасць для Беларусі. Напрыклад, тэмы сёлетняга фестывалю тычацца кожнага з нас: у блок «Памяць» уключаныя фільмы, якія нагадаюць пра пераасэнсаванне мінулага, пра памылкі продкаў, якія не трэба паўтараць; «Агульны свет» — гэта прыгожае кіно для душы, якое нагадвае: кожны з нас нябачна ўплывае на тое, што адбываецца ў свеце. То-бок, мы выбіраем фільм з шырокім поглядам на рэчы і зацікаўленыя ў тым, каб паказваць кіно беларускіх рэжысёраў, якога дагэтуль не было.

— Вы ствараеце фестываль з камандай валанцёраў і нават маеце ўнутраны дэвіз...

— Так, усе дапамагаюць фестывалю на валанцёрскіх пачатках: калі я толькі прывезла *WATCH DOCS*, прасіла дапамагчы сяброў і калег, а пасля людзі самі пачалі прыходзіць і прапаноўваць дапамогу — многія з іх і зараз застаюцца асноўным касцяком каманды. Што да дэвізу, то ён у нас заключаецца ў словах «правы чалавека праз эстэтыку кіно». І слова «эстэтыка» тут не пусты гук, бо фільмы, якія мы паказваем, знятыя выдатнымі рэжысёрамі, а іх якасць даказаная безліччу ўзнагарод. Нам хочацца, каб пасля прагляду ў аўдыторыі змяняўся погляд на рэчы і прыходзіла разуменне, што дакрануліся да мастацтва. Але асноўная ідэя фестывалю — каб пасля прагляду людзі падумалі пра праблемы, якія ўбачылі на экране.

— Фестываль бясплатны, а грошы вы збіраеце праз краўдфандынг. Ці гатовыя людзі фінансаваць такія ініцыятывы?

— Бясплатныя паказы — гэта не толькі прапаганда правоў чалавека, але і жаданне дыстрыб'ютараў: яны бясплатна альбо за даступныя грошы даюць нам кіно. Мяркую, гэтая сістэма працуе бездакорна: гледачоў становіцца больш. А што тычыцца краўдфандынгу, так, мы збіраем грошы на платформе «Талака», а таксама ўжо другі год ладзім акцыю разам з кавярнямі: можна набыць кубак кавы і заплаціць на 50 капеек больш, а з кожнага такога кубка кавярня перадае фестывалю 1 рубель. Гэтая акцыя была маёй ідэяй: я зразумела, што людзі гатовыя падзяліцца невялікай сумай, але не хочуць яе кудысьці несці ці пералічваць. Таму мы прыдумалі спосаб, калі чалавек аддае грошы на фестываль, але атрымлівае штосьці для сябе.

— Фестываль ладзіцца ўжо трэці раз, гэта значыць, што цікавасць ёсць. Хто прыходзіць на прагляды?

— Шчыра кажучы, мы дагэтуль не разумеем сваю аўдыторыю. Прыходзяць людзі вельмі розныя: ад моладзі да сталых гледачоў. Адно дакладна: аўдыторыя актыўная і зацікаўленая. Мы задаволеныя вынікам мінулагодніх фестываляў, было шмат людзей, нягледзячы на тое, што мы паказвалі кіно на альтэрнатыўных пляцоўках. Сёлета вырашылі зрабіць эксперымент і выйсці на вялікі экран кінатэатра «Мір». Думаем і пра паказы ў рэгіёнах, калі знойдуцца энтузіясты, якія захочуць дамапагчы з арганізацыяй. Дарэчы, у Гродне, Брэсце і Стоўбцах у нас атрымалася правесці такія паказы. Праз кіно мы ствараем пляцоўку для абмеркавання праблем, пра якія паказваем фільмы.

— Якія фільмы з праграмы вы абавязкова раілі б паглядзець кожнаму?

— Дакладна стужку «Хто смяецца апошнім» — фільм, які прапаноўвае нестандартны погляд на рэчы, у дадзеным выпадку — на халакост. Стужка складаецца з інтэрв'ю з людзьмі, якія жылі ў гета і жартавалі, а смех дапамог ім выжыць у такіх бесчалавечных абставінах. Звычайна на тэму халакосту здымаюць сумнае кіно, а гэтая стужка выклікае і ўсмешку, і суперажыванне. Яшчэ адзін фільм, які трэба ўбачыць, — бразільскі «Кюрумім», унікальная стужка пра чалавека, якога прыгаварылі да смяротнага пакарання. Рэжысёр перадаў яму камеру ў турму, таму будзе шмат здымкаў адтуль у чаканні смерці, а таксама шмат тэлефонных размоў з рэжысёрам: галоўны герой вельмі хоча, каб яго пачулі і не паўтаралі яго памылак. І трэцяя карціна — неверагодна прыгожае кіно «Дзякуй за дождж» з унікальнымі здымкамі. Гэта гісторыя чалавека, які літаральна змагаецца за жыццё сваёй сям'і: у яго афрыканскім рэгіёне капрызны клімат. У стужцы мы ўбачым, як са звычайнага фермера герой ператвараецца ў глабальнага актывіста.

Маргарыта ДЗЯХЦЯР

Art-кірунак

Трансфармацыя і рух наперад

У Беларусі ўпершыню прадставілі праект «Графіка года»

Алесь Некрашэвіч «Тэрмінатар», 2017 г.

Беларуская арт-суполка ганарыцца айчыннай школай графікі. Сапраўды, у краіне ёсць людзі, якія змаглі ў гэтым кірунку дасягнуць высокага прафесіяналізму, пра які, дарэчы, ведаюць не толькі ў нашай краіне, але і за межамі. І гэты факт выклікае гонар. Аднак старшыня секцыі графікі Беларускага саюза мастакоў Андрэй Басалыга лічыць, што, нягледзячы на поспехі ў развіцці айчыннай школы, трэба карыстацца досведам розных краін і пры гэтым не губляць індывідуальнасці. Год таму творца вырашыў арганізаваць конкурс «Графіка года», каб прадэманстраваць патэнцыял і магчымасці беларускіх аўтараў. Праект прадставілі ў Палацы мастацтваў.

Праект увабраў у сябе ўсё самае лепшае, што было зроблена ў графіцы за мінулы год. Малюнак, акварэль, эстамп, магчымасці лічбавых тэхналогій — творцы спрабавалі зачапіць тэхнікай, ідэяй, філасофскім падыходам і індывідуальнасцю. Паколькі пад праект была адведзена невялікая тэрыторыя выставачнай прасторы, патрабаванні да твораў былі сур'ёзныя.

— Зыходзячы з таго, што прастора ў нас абмежаваная, хацелася паказаць усё самае лепшае, — расказвае куратар выстаўкі Андрэй Басалыга. — Прыйшлося камусьці адмовіць. Напрыклад, творы ў фармаце ілюстрацыі мы не прымалі, плакаты — таксама. У асноўным гэта быў малюнак, таксама вырашылі прысвяціць увагу акварэлі і эстампу. Выставілі некалькі мастакоў не з графічнага, а з жывапіснага цэха: гэта Зоя Літвінава, Зоя Луцэвіч і Святлана Каткова. Большасць работ датаваныя 2017 годам, аднак прымалі мы і некаторыя творы, зробленыя раней. Менавіта якасць твораў паўплывала на гэта рашэнне, гледачу будзе важна ўбачыць іх, аднак у конкурсе яны ўдзел не бралі.

Уладзімір Мехавіч «Успамінаючы. Памяці К.Ю».

Сёлета арганізатары вылучылі два прызы — за арыгінальную графіку, дзе прадстаўлены малюнак, акварэль, розныя змешаныя тэхнікі, і за друкаваную, якую можна дубліраваць, у гэтую ж намінацыю ўваходзіў лічбавы друк. У кожнай намінацыі было па тры прэтэндэнты. Пераможцамі ў намінацыі «Тыражная графіка» сталі два аўтары — Андрэй Савіч і Андрэй Кошалеў. Мастакі прадставілі праект «Дзень усіх святых. Карта для гульні». Дыплом у намінацыі «Тыражная графіка» за дзве работы, аб'яднаныя назвай «Архітэктура», атрымаў Андрэй Басалыга. Трэцім намінантам стала маладая мастачка Аліна Простак, якая прадставіла лінагравюру. У намінацыі «Арыгінальная графіка» пераможцам стаў мастак-манументаліст Аляксандр Некрашэвіч, які прадставіў цікавы па стылізацыі твор «Тэрмінатар». Дыпломамі былі адзначаны Уладзімір Вішнеўскі за графічны трыпціх, Тамара Шэлест за работу «Не перашкаджайце глядзець на птушак» і Дзмітрый Шапавалаў за тонкі і скрупулёзны малюнак, падобны да разцовай гравюры.

У журы працавалі графік Валерый Славук, мастацтвазнаўца Кацярына Ізафатава, мастацтвазнаўца Мікалай Пагранаўскі, мастачка Наталля Залозная, намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Леанід Хобатаў і дырэктар Палаца мастацтваў Аляксандр Зінкевіч.

Адчуваецца, як розныя пакаленні творцаў захапіліся адной ідэяй і імкнуліся дакладна і зразумела данесці яе да гледача.

— Паколькі ў выстаўцы бяруць удзел прадстаўнікі маладога пакалення, то можна казаць пра давер да іх, — падкрэслівае Андрэй Басалыга. — У маладога аўтара з'яўляецца стымул і цікавасць. Выстаўляцца разам з такімі мэтрамі, як, напрыклад, Зоя Літвінава, — гэта ж сапраўды дасягненне. Але на гэтай выстаўцы мне не хочацца дзяліць мастакоў на пакаленні. Мы ўсе калегі і ў гэтай прасторы на роўных. У дадзеным выпадку вучацца не толькі маладыя, але і мэтры графікі, яны спрабуюць зразумець, чым жыве моладзь, як адчувае жыццё. Хоць наша школа моцная, мы не павінны замыкацца толькі ў яе рамках. Калі будзем варыцца ва ўласным соку, кроў будзе застойвацца. Павінны быць і погляды ў сусветную прастору графічнага мастацтва. Трэба не баяцца мяняцца, а нашай школе варта спакойна ўспрымаць такую з'яву, як трансфармацыя.

Андрэй Басалыга плануе зрабіць праект «Графіка года» рэгулярным, а праз кожныя тры гады арганізоўваць трыенале.

Вікторыя АСКЕРА

З абярэгам!

А. Кіш «Дзева на водах», 1930—1949 гг.

У жыцці кожнага ёсць такія рэчы, якія станавіліся прадвеснікамі радасці і шчасця. З імі не хочацца расставацца, яны нібыта талісманы, да якіх звяртаешся як у складаныя, так і ў самыя прыемныя перыяды жыцця. Іх паказвае выстаўка маляваных дываноў «На шчасце, на долю» з фондаў Гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе», што працуе ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры». Гэтыя дываны калісьці былі тымі самымі абярэгамі для многіх беларускіх сем'яў. Людзі лічылі, што яны дапамогуць ім зберагчы ў доме дабрабыт і спакой.

Усе экспанаты разам выглядаюць быццам адна вялікая карта, па якой можна прасачыць лёс не толькі чалавека, але і грамадства. У наш час немагчыма ставіцца да гэтых экспанатаў як да звычайных рэчаў, якія могуць упрыгожваць дом, — гэта нацыянальная каштоўнасць, адметная тэхнікай, каларыстыкай і нават філасофскім падыходам. На выстаўцы экспануюцца творы такіх знакамітых майстроў, як Фёдар Сухавіла, Язэп Драздовіч, Алена Кіш… Ёсць творы і невядомых аўтараў, якія таксама сталі хрэстаматыйнымі, іх можна ўбачыць у розных беларускіх энцыклапедыях, падручніках. Найбольшае распаўсюджанне маляваныя дываны атрымалі прыкладна ў 20—60-я гады XX стагоддзя ў вёсках і мястэчках Беларусі, асабліва ў Глыбоцкім, Шаркаўшчынскім раёнах Віцебскай вобласці, Слуцкім, Салігорскім раёнах Мінскай вобласці і на Палессі.

— Усё пачалося з моманту, калі летась мы зладзілі выстаўку па выніках міжнароднага пленэру «З Алёнай Кіш у сэрцы», — расказвае дырэктар галерэі «Універсітэт культуры» Павел Сапоцька. — Тады мы выставілі некалькі твораў толькі Алёны Кіш і мастакоў, якія прысвячалі ёй свае работы на пленэры. З таго часу мы пачалі супрацоўнічаць з Гісторыка-культурным музеем-запаведнікам «Заслаўе», які прапанаваў нам правесці вялікую выстаўку маляваных дываноў. Гэтым разам на выстаўцы прадстаўлена сорак чатыры творы, прычым вельмі вядомых аўтараў. Зыходзячы з выставачнага досведу мінулага года, мы зразумелі, што на Алену Кіш прыходзіць шмат людзей. Гледачы маглі не ведаць пра Алену Кіш нічога, але яны зацікаўлена разглядалі яе дываны, а пасля слухалі біяграфію гэтай таленавітай жанчыны. Таму мы зразумелі, што вялікая калекцыя таксама будзе мець поспех.

Я. Драздовіч «Красналюдка — казачнік — бай», 1948 г.

Творы кожнага аўтара абсалютна розныя і па стылістыцы, і па ідэі. Ёсць дываны, якія адлюстроўваць сутнасць прыроды, яе гармонію, ёсць творы, якія непасрэдна звязаныя з лёсам чалавека і яго месцам у жыцці, ёсць проста сімвалічныя дываны, якія разгадваеш, нібы загадку. Гэтае традыцыйнае народнае мастацтва застаецца той жыватворнай крыніцай, якая ратуе ад бяспамяцтва і душэўнай чэрствасці, натхняе на творчасць і аналіз.

— Распаўсюджванне тэхнікі і перыяд стварэння маляваных дываноў усё ж такі невялікі — літаральна некалькі дзесяцігоддзяў, — падкрэслівае Павел Сапоцька. — У беларускіх вёсках у кожнай хаце знаходзіліся маляваныя дываны і кожны лічыў за гонар размясціць у сябе творы майстроў. Цяпер патрэбы такой няма, але вялікая цікавасць да гэтых работ засталася. Ёсць асаблівасці тэрытарыяльныя, якія былі выяўлены даследчыкамі. Напрыклад, вельмі добра апісана, як маляваныя дываны ствараліся на Палессі або ў Віцебскай вобласці. А што тычыцца цікавасці замежнікаў, прывяду такі прыклад: у нашай галерэі эстонскія калегі адкрывалі выстаўку і ўбачылі калекцыю дываноў. Яны вельмі зацікавіліся ёй і задавалі шмат пытанняў, сказалі, што ніколі не бачылі такіх твораў, нават і не чулі пра іх (а гэта людзі, якія арганізоўваюць выстаўкі ў самых розных краінах). Магчыма, эстонскія калегі прапануюць нам прывезці гэтую выстаўку да іх.

Аўтары стваралі дываны з мэтай несці людзям радасць, не задумваліся пра святлацені, перспектыву, не прадумвалі планы і фарматы. Ёсць адчуванне, што нашаму народу не хапае менавіта такіх цёплых твораў: наіўнае мастацтва не выклікае негатыву або абыякавасці. Мы ведаем, што некаторыя з гэтых твораў былі сапраўды выпакутаваны. У пошуках ежы і прытулку Алёна Кіш прыдумляла геніяльныя кампазіцыі, з дапамогай якіх прадвызначала не толькі свой шлях, але і дарыла людзям радасць. Гэтыя экспанаты скараюць неверагоднай энергетыкай: побач з імі задумваешся пра сваё месца ў жыцці, пра свае абярэгі.

Вікторыя АСКЕРА

І. Ворса «Дзяўчынка і музыка», 1953 г.

Культурны ракурс

Тыдзень таму адбылася значная падзея ў культурным жыцці Мінска: на Алеі зорак на Усходніх (Маскоўскіх) могілках адкрылі помнік выбітнаму акцёру тэатра і кіно, народнаму артысту Беларусі, народнаму артысту СССР Расціславу Янкоўскаму.

Вядомы беларускі скульптар Мікалай Байрачны адлюстраваў Янкоўскага ў адным з яго самых вядомых тэатральных вобразаў — Караля Станіслава Радзівіла са спектакля «Пане Каханку». Байрачны прапанаваў сваё бачанне помніка, і сваякі акцёра пагадзіліся з яго ідэяй. Помнік атрымаўся вельмі выразны і прыгожы. Янкоўскі сядзіць у высокім крэсле, як на троне, і глядзіць на крыж, на які апусціўся голуб... Скульптура проста зачароўвае!

У 1957 годзе Расціслаў Янкоўскі разам з сям'ёй пераехаў у Мінск і быў прыняты акцёрам у Дзяржаўны рускі драматычны тэатр Беларускай ССР імя М. Горкага (цяпер Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага). 160 галоўных роляў у тэатры і каля 60 у кіно прынеслі яму ўсенародную вядомасць і любоў гледачоў як у Беларусі, так і за яе межамі.

На працягу пятнаццаці гадоў — з 1995 па 2010 — быў старшынёй Міжнароднага кінафестывалю краін СНД і Балтыі «Лістапад» у Мінску.

На жаль, народны артыст СССР, легенда сцэны, пайшоў з жыцця мінулым летам — на 87-м годзе.

Галіна ПАШКЕВІЧ

Да ўвагі чытачоў! «ЛіМ» працягвае конкурс «Культурны ракурс». Умовы творчага спаборніцтва змешчаны ў № 2 нашай газеты. Чакаем цікавых і крэатыўных фотаздымкаў з арыгінальным тлумачэннем.

ЛіМ
Выходзіць з 1932 года
16 +
Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь,
грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі»,
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»
Галоўны рэдактар
Ларыса Іванаўна ЦІМОШЫК

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zvyazda.minsk.by
Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by
Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
аддзел «Кніжны свет» — 292-56-53
бухгалтэрыя — 287-18-14
Тэл./факс — 292-20-51

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.
Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ
Тэхнічны рэдактар, камп'ютарная вёрстка:
А. В. Бізункова

Камп'ютарны набор:
А. І. Грамыка
Стыльрэдактар:
Н. А. Святлова
Нумар падпісаны ў друк
14.12.2017 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 1488.
Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013
Заказ — 4605
Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Аўтары паведамляюць прозвішча, імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, месца працы, адрас з індэксам. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
© Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, 2017
© ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі», 2017
© Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"», 2017

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 17050